«Браслаў, Паставы, Лепель...» З такімі заклікамі прапаноўваюць свае паслугі кіроўцы нелегальных маршрутных таксі недалёка ад уваходу ў адзін з мінскіх аўтавакзалаў. І ёсць людзі, якія спакушаюцца на гэтыя заклікі... СТАР. 5

Помнік знакамітаму Хатабычу з аднайменнай казкі можа хутка з'явіцца ў Віцебску. І не выпадкова. Менавіта тут нарадзіўся і працаваў яго «бацька» — пісьменнік Лазар Лагін. СТАР. 5

На адной з кніг Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі знойдзены аўтограф вялікага Гётэ. Калекцыя аўтографаў таксама змяшчае тры подпісы Марка Шагала, аўтографы Рабэра дэ Мантэск'ю і Жана Эфэля. СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 ВЕРАСНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 174 (27539) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ДЭПУТАТАМ ТРЭБА БОЛЬШ АКТЫЎНА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ЗАКОНАПРАЕКТАЎ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 16 верасня сустрэўся са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам Андрэйчанкам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Прэзідэнт асаблівую ўвагу звярнуў на падрыхтоўку праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце на 2014 год. «Самае галоўнае — гэта перспектывы, а яны звязаны перш за ўсё з бюджэтам», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка зацікавіўся, наколькі дэпутаты далучаны да работы, звязанай з падрыхтоўкай гэтага законапраекта, паколькі ўжо склалася добрая практыка, калі на самых першых этапах старшыня адпаведнай парламенцкай камісіі, дэпутаты, спецыялісты падключаюцца да такой работы.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы растлумачыў, чаму яго цікавіць гэта пытанне: «Апошнім часам было дастаткова фактаў, калі мы нешта планавалі, і быццам бы правільна планавалі, але не заўсёды ўсё атрымліваецца. Хацелася б, каб дэпутаты ўніклі ў гэту сітуацыю і паглядзелі з крытычнага пункту гледжання на работу ўрада ў плане не толькі бюджэту і асноўных паказчыкаў, але і ў цэлым планаў на будучы год». «Зразумела, што сітуацыя няпростая ў сусветнай эканоміцы, але тым не менш мы павінны зыходзіць з рэальнай сітуацыі і вызначаць аб'ектыўна тыя ўзроўні і параметры, на якія павінна выйсці краіна», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы лічыць: «Дэпутатам трэба больш актыўна і крытычна ўдзельнічаць у падрыхтоўцы гэтых дакументаў, каб пры разглядзе на ўзроўні Прэзідэнта мы мелі ўсе пункты гледжання на тую ці іншую праблему».

Уладзімір Андрэйчанка расказаў, што ў парадак дня асенняй сесіі, якая пачне сваю работу 2 кастрычніка, ужо ўнесена 66 пытанняў. Акрамя закона аб рэспубліканскім бюджэце на сесіі таксама плануецца прыняць закон аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у выбарчае заканадаўства. Паводле слоў спікера парламента, дэпутаты цяпер актыўна працуюць над падрыхтоўкай праекта бюджэту Саюзнай дзяржавы на 2014 год.

Прэзідэнт цікавіўся таксама пытаннямі міжнароднай парламенцкай дзейнасці. Кіраўнік дзяржавы выказаў меркаванне, што неабходна больш увагі ўдзяляць супрацоўніцтву з парламентамі Расіі, іншых краін СНД, а таксама прадаўжаць дыялог з парламентарыямі Еўрапейскага саюза.

У сувязі з гэтым Уладзімір Андрэйчанка паведаміў, што ў бліжэйшы час плануецца правядзенне ў Беларусі каардынацыйнай нарады старшынь камітэтаў (камісій) па абароне і бяспецы парламентаў краін АДКБ. Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама расказаў, што з візітамі ў Беларусі плануюць пабываць парламенцкія дэлегацыі В'етнама, Турцыі, Нігерыі.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на неабходнасць больш сур'ёзнай работы з выбаршчыкамі ў акругах. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што дэпутаты павінны заўседы знаходзіцца на пярэднім краі гэтай работы і аказваць усялякую дапамогу мясцовым органам улады ў вырашэнні надзённых пытанняў.

АДНОЛЬКАВЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА СПАГНАННЯ ЗЯМЕЛЬНАГА ПАДАТКУ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з міністрам фінансаў Андрэем Харкаўцом. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У цэнтры ўвагі быў праект указа, які датычыцца пытанняў падаткаабкладання, пераацэнкі маёмасці і спагнання арэндная платы за зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці. «Ці няма тут якіх-небудзь залішніх ільгот, выключэнняў і іншага, каб мы потым зноў гераічна іх не пераадольвалі? — пацікавіўся Прэзідэнт. — Асабліва ў нас цяпер вельмі папулярны тэзіс, што прадпрымальнікаў трэба падтрымліваць, ільгатаваць, як быццам яны самыя бедныя. Так, іх трэба падтрымліваць, але цывілізавана».

«Новае заўсёды добра, калі яно жыццём запатрабавана, а калі не, то, можа, і не трэба на гэтыя навінкі надта кідацца», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Як далажыў Андрэй Харкавец, паколькі і зямельны падатак, які спаганяецца ў рамках Падатковага кодэкса, і арэндная плата за зямлю — гэта аналагі па сваім характары, складзе плацельшчыкаў, тэрмінах і сумах спаганяемых плацяжоў, у сувязі з гэтым прадугледжваюцца аднолькавыя падыходы да іх спагання.

«Ніякіх новых ільгот і прывілей пры гэтым уводзіцца не будзе», — удакладніў міністр. Кіраўнік дзяржавы адобрыў такое рашэнне, і адпаведны ўказ будзе падпісаны ў бліжэйшы час.

■ Прыдарожны сэрвіс

У ПАРЫЧАХ БУДЗЕ... «ПАРЫЖ»

У невялікім гарадскім пасёлку Парычы ў Светлагорскім раёне мясцовы прадпрымальнік будуе цэлы комплекс прыдарожнага сэрвісу і зусім не сумняваецца ў паспяховасці гэтага праекта.

— Як карабель назавеш, так ён і паплыве, — кажа **прадпрымальнік Іван КАРАТКЕВІЧ (на фота)**. — Наша прыдарожная кавярня будзе мець назву «Парыж»! Гучна? Верым, што яе палюбяць не толькі жыхары нашага маленькага пасёлка, але і ўсе падарожнікі: праз Парычы вядуць галоўныя дарогі на беларускі поўдзень і ва Украіну, аўтамагістралі не сціхаюць ні ўдзень, ні ўначы.

...Тры гады таму гэты прадпрымальнік набыў пляцоўку, на якой некалі месціўся завод жалезабетонных вырабаў. Ужо гадоў з дваццаць тэрыторыя пуставала, будынкі прыйшлі ў заняпад. Выгляд пасёлка і без таго быў сумны. Я добра памятаю і свае асабістыя ўражанні, настрой псаваўся, калі даводзілася ехаць праз Парычы. Змрочны выгляд аўтастанцыі, каля якой дагэтуль стаіць «традыцыйная» прыбіральня, па суседстве туляцца састарэлыя заводскія пабудовы... Узнікала жаданне хутчэй пакінуць пасёлак.

У двары колішняга завода прадпрымальнік наладзіў вытворчасць па распілоўванні драўніны, цесляры пачалі зборку дамоў з круглякоў, знайшлося месца майстру па мастацкай апрацоўцы каменю. Трэба было дбаць і пра вонкавы выгляд прадпрыемства. Але як падступіцца да гэтай далёка не таннай справы? Як гэта часта здараецца, дапамог выпадак.

— Калі чарговы раз у нашай вёсцы Скалка (суседняй з Парычамі) прапала электрычнасць, а туліцца ў хатняй цемры не хацелася — ні тэлевізар паглядзець, ні пачытаць, ні вячэру прыгатаваць, — узяў дзяцей і паехаў у пасёлак у кавярню, спадзяваўся падсілкавацца гарачымі стравамі. А там на вітрыне — адны шакаладныя батончыкі і мінералка, — дзеліцца ўспамінамі Іван. — І гняткая злосць мяне ўзяла, крыўдна стала, што ўсё жыццё адчуваеш сябе перыферыйным чалавекам, залежным і ад чыёйсьці безгаспадарнасці, ад бясконцых здарэнняў і непрадбачаных стыхій. Вось і вырашыў узвесці цэнтр, у якім можна будзе і смачна падсілкавацца, і час правесці за кубачкам кавы, і з сябрамі-суседзямі пабачыцца. Чаму звычайныя вяскоўцы не могуць дазволіць сабе сабрацца ўвечары за столікам, як тыя ірландцы, французы альбо палякі?

Прыдарожны сэрвіс — гэта яшчэ і дадатковыя працоўныя месцы, і папаўненне мясцовага бюджэту. Іван узяў у банку крэдыты, распрацаваў праект па рэканструкцыі старога адміністрацыйнага будынка, набыў будматэрыялы, запрасіў брыгаду майстроў, распачаў будоўлю... Цяпер засталіся невялікія ўнутраныя работы, завяршаецца адстройванне фасаду, хутка пачнецца ўпарадкаванне прылеглай тэрыторыі.

— Акрамя офісных пакояў і залы кавярні ў нас будуць чатыры гасцінічныя нумары, некалькі памяшканняў для гульні ў боўлінг і більярд. Спадзяёмся, што Новы год многія жыхары Парычаў і навакольных вёсак прыйдуць сустракаць у наш «Парыж». Жадаем, каб наша Беларусь была прывабнай для гасцей з самых розных краін, але ў першую чаргу мы клапоцімся пра саміх сябе, — кажа Іван Караткевіч.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.
Светлагорскі раён.

■ Нерухомасць

«ЗАЛАТЫ» ЦЭННІК ЗЯМЛІ ПАД МІНСКАМ

Кошт самых элітных участкаў дасягае 150 тысяч долараў, а суперкатэджы «цягнуць» часам да 2 млн

Журналіст «Звязды» разам са спецыялістамі інтэрнэт-партала Realt.by паспрабавалі зрабіць аналіз рынку зямельных участкаў у прысталічным рэгіёне Беларусі. На старце нашага аналізу мы прапануем азнаёміцца з інфаграфікай цэн прапановы зямельных участкаў цяпер і год таму. Карта разбіта па 9 напрамках і 3 буферных зонах (10, 25 і 50 км).

Кошты — угору

У цэлым практычна па ўсіх напрамках назіраецца павялічэнне коштаў, аднак яго тэмпы значна ніжэйшыя, чым на жыллё ў сталіцы. Што тычыцца ўчасткаў паблізу Мінскага мора, то не варта разглядаць зніжэнне цэн як нейкую тэндэнцыю. Гэта найвышэйшы цэнавы сегмент, дзе кошты ніколі не зніжаюцца ніжэй за 3000 долараў за сотку. Леташні жнівень хутчэй выглядае як анамалія, бо больш з тых часоў такога высокага значэння там зафіксавана не было.

На думку экспертаў, найбольшым попытам карыстаецца менавіта «незавершанка», але абавязкова з усімі неабходнымі камунікацыямі і зручным пад'ездам. Яе кошт у лепшых зонах індывідуальнай забудоўлі можа даходзіць да 150 тысяч долараў. Добрым попытам карыстаюцца і прыватныя «бюджэтныя» дамы коштам да 30 тысяч долараў на адлегласці 30 км ад Мінска. Звычайная хата ў вёсцы, у 60 км ад сталіцы, каштуе ад 5 да 10 тысяч, а дачу на адлегласці 50 км можна набыць у сярэднім за 10-25 тысяч долараў. СТАР. 4

■ Павысіць планку

ІНЖЫНЕР, ТЭХНІК АБО РАБОЧЫ?

Хто павінен працаваць на той ці іншай пасадзе, вызначыць усё больш праблематычна

«Беларусь — адна з нямногіх краін, якая забяспечвае падрыхтоўку прафесійных кадраў выключна за кошт дзяржаўнага бюджэту. Між іншым, прафесійная адукацыя — надзвычай дарагая. Таму вельмі важна, каб у інвеставанні сродкаў у падрыхтоўку кадраў былі зацікаўлены бізнес і прадпрыемствы. І мы будзем уносіць свае прапановы па прыцягненні сюды бізнесу», — паведаміў падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА дырэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Аркадзь Шкляр.

Самыя прывабныя прафесіі

Аркадзь Шкляр расказаў, што сёлета найбольш запатрабаванымі спецыяльнасцямі ў дзевяцікласнікаў на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі былі прафесіі праграміста, юрыста, памочніка ўрача па амбулаторна-паліклінічнай частцы, зубнога тэхніка, тэхніка-будаўніка, мастака-мадэльера (цырульніка), дызайнера, тэхніка-механіка па эксплуатацыі аўтамабіляў, тэхніка-электрыка, тэхніка-энергетыка. СТАР. 4

ЦЫТАТА ДНЯ

Валянцін ЧАКАНАЎ, міністр гандлю:

«Рэклама — рухавік гандлю. Але рэкламай павінен займацца вытворца. Колькі мы рэкламуем айчыннага тавару? Ды яго практычна няма на нашым тэлебачанні. Нейкія заходнія кампаніі рэкламуюць свой тавар, адсюль і продаж ідзе. А мы ціхенька сядзім. Трэба павялічваць аб'ёмы продажу, заваёўваць рынак, інакш вас адтуль будуць выціскаць. Каб тавар прадаваўся, ён павінен быць адпаведным чынам аформлены. Гандлёвыя сеткі, крамы, каб узяць тавар у продаж, павінны мець спецыяльнае абсталяванне. Я лічу, што рэкламнай кампаніі прадпрыемству трэба надаваць больш увагі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.09.2013 г.

Долар ЗША	9010,00	▼
Еўра	12030,00	▲
Рас. руб.	279,00	▲
Укр. грыўня	1102,01	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 19°	
Віцебск	+ 16°	
Гомель	+ 18°	
Гродна	+ 17°	
Магілёў	+ 17°	
Мінск	+ 18°	

■ Надвор'е

ТЫДЗЕНЬ ДАЖДЖОЎ

У аўторак, пераважна па заходніх раёнах, будуць ісці дажджы, часам навальніцы, паведаміла рэдакцыі **начальнік аддзела метэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Святлана Рыбакова**. Тэмпература паветра ўдзень плюс 14-19 градусаў, на поўдні краіны — 21 цяпла. У сераду і чацвер дажджы пачнуць гаспадарыць ужо на ўсёй тэрыторыі Беларусі, а ў асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Уначы — 7-14 цяпла, удзень — плюс 11-18 градусаў, а на ўсходзе краіны да плюс 18-21.

Паводле папярэдніх разлікаў айчынных сіноптыкаў, у апошнія дні тыдня надвор'е ў Беларусі ўвогуле сапсуецца. Паўсюдна будуць ісці суцэльныя дажджы, уначы і раніцай месцамі туман. Пахалодае. Тэмпература паветра ўначы ўсяго 5-12 цяпла, удзень чакаецца плюс 11-18 градусаў. Сіноптыкі адзначаюць, што такі тэмпературны фон адпавядае кліматычнай норме другой паловы верасня, але ўдакладняюць, што, магчыма, у нядзелю стане крыху цяплей.

Сяргей КУРКАЧ

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ІТАЛІІ ПАЧАЛАСЯ АПЕРАЦЫЯ ПА ПАД'ЁМЕ «КОСТА КАНКОРДЫІ»

Учора ў Італіі ля берагоў востраваДжылья ў 9:00 раніцы па мясцовым часе пачалася аперацыя па пад'ёме патанулага лайнера «Коста Канкордыя».

Аперацыя абыдзецца ў мільярд долараў, які будзе выплачаны кампаніяй, дзе было застрахавана судна. «Коста Канкордыя» ляжыць на скалістым беразе ля вострава Джылья са студзеня 2012 года. Вінаватымі ў крушэнні лайнера былі прызнаны пяцёра супрацоўнікаў кампаніі — уладальніка судна Costa Crociere, чацвёра з якіх былі членамі экіпажа. Акрамя таго, цяпер у Італіі працягваецца суд над капітанам лайнера Франчэска Скеціна. Яго абвінавачваюць у ненаўмысным забойстве і ўцёках з судна.

Круізны лайнер «Коста Канкордыя» затануў у ноч на 14 студзеня 2012 года, калі на яго борце знаходзіліся больш за 4,2 тысячы чалавек. У выніку катастрофы загінулі 32 чалавекі.

НАВУКОЎЦЫ СТВАРЫЛІ СПРЭЙ АД СТРЭСУ?

Яго сакрэт на здзіўленне просты — у склад спрэю ўваходзіць «гармон абдымкаў» — аксітацын, які павышае чуллівасць у мужчын і супакойвае жанчын.

Аксітацын выпрацоўваецца ў арганізме самастойна, ён павышае лібіда і пачуццё даверу да партнёра, менавіта гэты гармон з'яўляецца адказным за эмацыйную сувязь маці і дзіцяці.

Дзейснасць спрэю даказалі клінічныя эксперыменты. 17 шлюбных пар ва ўзросце ад 20 да 50 гадоў прынялі ўдзел у тэстах. Кожная пара павінна была на працягу 45 хвілін успамінаць канфліктныя сітуацыі ў сям'і, пасля чаго палове пар было прапанавана ўпырснуць у нос спрэй з аксітацынам, а другой палове прапанавалі спрэй з плацэба. Вынік паказаў, што спрэй з аксітацынам рабіў мужа і жонку пасля сваркі больш прыязнымі і дапамагаў хутчэй памірыцца. Медыцынскі аналіз пацвердзіў, што сварка не пакінула ніякіх слядоў пераўзбуджэння ў нервовай сістэме ў жанчын, якія ўжылі спрэй. У мужчын прэпарат знізіў патрабавальнасць да сваіх другіх палавінак і павысіў дружалюбнасць.

Урачы заявілі, што ўпырскванне спрэю двойчы на дзень павышае сексуальную актыўнасць у пары і ўмацоўвае паразуменне паміж мужам і жонкай.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

НАЗВАНЫ ЛЕПШЫЯ Ў СВЕЦЕ ВІНЫ

Аўстралійскія віны названы лепшымі ў свеце. Яны абагналі па якасці Францыю, Іспанію, Італію, Чылі і іншыя краіны, якія славяцца сваімі традыцыямі вінаробства. Трыумфам аўстралійскіх вінаробаў завяршылася прэстыжная міжнародная выстава вінаў Decanter World Wine Awards-2013, якая прайшла ў Лондане. Гэтае мерапрыемства часам называюць «Алімпіядай вінаробства», перамога на ім вельмі ганаровая.

Пераможцы вызначаюцца на падставе «сляпой» дэгустацыі, калі суддзі каштуюць віно з пасудзін, дзе не пазначана ні назва віна, ні гатунак, ні вытворца. Выставу гэтага года па праве можна назваць «аўстралійскай». Адразу па шасці катэгорыях аўстралійцы былі прызнаныя лепшымі. Усяго з 1075 вінаў Зялёнага кантынента, якія прымалі ўдзел у Decanter World Wine Awards-2013, розныя прызы і ўзнагароды атрымалі 815 прадстаўнікоў Аўстраліі.

КОРАТКА

Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2014» пройдзе ў другой палове верасня 2014 года ў г. Гарадку і Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці.

Генпракуратура РФ прыме ўдзел у расследаванні крымінальнай справы адносна кіраўніцтва «Уралкалія».

Кватэры з рамонтам і мэбляй у жніўні ў Мінску прадаваліся ў сярэднім на 12 працэнтаў даражэй за кватэры з тыпавым адстройваннем і без мэблі. У пераліку на квадратны метр гэта выражалася ў дадатковых $190-200.

Міжнародная спецыялізаваная выстаўка-кірмаш «Паляванне і рыбалоўства. Восень-2013» пройдзе з 25 па 28 верасня ў НВЦ «Белэкспа» (вул. Купалы, 27).

Амаль 200 тыс. іншагародніх пацыентаў прымацавана да паліклінік Мінска. У шэрагу паліклінік нагрузка перавышае нарматыўную. Так, у Фрунзенскім раёне сталіцы нагрузка на 10-ю гарадскую паліклініку перасягае нарматыў на 13 працэнтаў, на 26-ю гарадскую паліклініку і 5-ю дзіцячую паліклініку — да 27 працэнтаў.

ШТО ДЛЯ ВАС АЗНАЧАЕ ЎЗ'ЯДНАННЕ БЕЛАРУСІ, ЯКОЕ АДБЫЛОСЯ РОЎНА 74 ГАДЫ ТАМУ?

Карына ПАПКОВА, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ:

— Мне ўспомніліся прароцкія радкі Янкі Купалы: «Ідзеш у край, які бязбожна жыўцом парэзалі на часці». На васямнаццаць доўгіх гадоў беларускі народ быў падзелены на дзве часткі штучна праведзенымі пры падпісанні Рыжскага дагавора межамі. І доўга працягвацца без нейкіх наступстваў для нацыі гэта не магло. На маю думку, калі б 74 гады таму савецкі ўрад не аддаў загад Чырвонай Арміі ўзяць пад абарону насельніцтва Заходняй Беларусі ды Украіны, то і ўсе жахі нямецкай акупацыі яно спазнала б раней... Тое, што Беларусь усё ж уз'ядналася, сведчыць аб тым, што нашу нацыю не зруйнуеш ніякімі памежнымі кардонамі.

Арцём СІЗІНЦАЎ, спартыўны аглядальнік:

— Многім беларускім сем'ям стала лепш, бо людзі з-за нечакана ўзніклай савецка-польскай мяжы не маглі быць разам, а тут у 1939-м раптам узнікла такая магчымасць. Ды і сусветная гісторыя неаднойчы адлюстроўвала, што раз'яднанасць народу да дабра не даводзіць. Але ж не магу вызначыць асабістае стаўленне да 17 верасня, скажу толькі, што гэта быў праблемны час у нашай гісторыі.

Уладзімір ГУЛЕНКА, гісторык:

— Гэта вехавая падзея для беларускага народа, які аб'яднаўся ў адзінай дзяржаве. Па сутнасці, гэта быў факт гістарычнай справядлівасці. Можна доўга дыскутаваць на тэму таго, чаго больш прынесла палітыка новай улады — добрага ці дрэннага. У рамках аб'яднанай БССР былі сфарміраваны ўсе атрыбуты беларускай дзяржаўнасці, адбыўся велізарны пад'ём культуры, адукацыі, створана інфраструктура і падрыхтаваны кваліфікаваныя нацыянальныя кадры для ўсяго дзяржаўнага апарата. Беларусь стала суб'ектам міжнароднага права. Падпісанне БССР Статута ААН у 1945 годзе азначала прызнанне дэ-юрэ беларускай дзяржаўнасці ўсімі 50-ю заснавальнікамі ААН. Падзеі 74-гадовай даўніны сталі фундаментам сучаснай незалежнай Беларусі.

Падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.

■ Хлеб і да хлеба

НА БРЭСТЧЫНЕ АДСВЯТКАВАЛІ АБЛАСНЫЯ «ДАЖЫНКІ»

Ляхавічы змяніліся да непазнавальнасці. Да гэтага часу адзін з самых аддаленых райцэнтраў быў адным з самых невыразных у плане сваёй знешнасці і добраўпарадкавання. 100 мільярдаў рублёў, выдаткаваныя з абласнога бюджэту на падрыхтоўку «Дажынак», і руплівыя рабочыя рукі зрабілі сваю справу. Горад памаладзеў і пахарашэў. Асабліва радавала мноства кветак; разнастайныя, з густам зробленыя клумбы яркімі восеньскімі фарбамі ўзнімалі настрой.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Ну і вядома, відовішчнае шэсце працаўнікоў вёскі, мноства артыстаў у яркіх нацыянальных касцюмах, а таксама песні, танцы, караваі з новага хлеба — ледзь не ў кожнай палатцы гандлёвых радоў. Усё гэта традыцыйныя элементы галоўнага свята ўраджаю, якія вызначаюць яго сутнасць. А яшчэ традыцыяй стала адкрываць падчас святкавання новыя аб'екты альбо тыя, што пяражылі поўную рэканструкцыю. Так было і з кінатэатрам «Кастрычнік», ад якога, паводле слоў будаўнікоў, засталіся адны сцены. Усё астатняе атрымала новую форму і новую начынку. І цяпер у Ляхавічах ёсць сучасны аб'ект культуры з прасторнай і стыльнай глядзельнай залай. Таму не грэх было перарэзаць чырвоную стужачку і павіншаваць месцічаў з адкрыццём новай сучаснай установы, што і зрабіў старшыня аблвыканкама Канстанцін СУМАР. Губернатар таксама наведаў гарадскі стадыён, які літаральна не пазнаць пасля рамонту і абнаўлення.

Ну а падвядзенне вынікаў уборкі ўраджаю — таксама традыцыйны элемент «Дажынак». Перадавікі атрымліваюць заслужаныя ўзнагароды і пашану, здабытую нялёгкай працай хлебароба. Сёлета аграрыі рэгіёна спрацавалі паспяхова. Агульная вага абласнога «каравая» склала 1 мільён 70 тысяч тон, а з улікам ураджаю кукурузы чакаецца 1 мільён 400 тысяч тон. Пружанскі, Бярозаўскі, Баранавіцкі раёны сталі пераможцамі абласнога спаборніцтва на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур. Пераможцамі сярод сельскагаспадарчых арганізацый прызнаны: СВК «Дарапеевічы» Маларыцкага раёна, СВК «Фядорскі» Столінскага раёна, СВК «Ляхавіцкі» Ляхавіцкага раёна. Самую высокую ўраджайнасць на сваіх палетках атрымала ААТ «Александрыя-Агра» Камянецкага раёна.

Пераможцамі спаборніцтва сярод камбайнераў сталі Сяргей і Аляксандр Рамановічы з СВК «Вінец» Бярозаўскага раёна, Дзмітрый і Барыс Кулікі з СВК «Імянінскі» Драгічынскага раёна, а таксама Сяргей Калюціч і Мацвей Мацкевіч з СВК «Дварэцкі» Лунінецкага раёна.

— Ужо восьмы раз запар мы атрымліваем больш за мільён тон збожжа, — сказаў у сваёй прамове кіраўнік вобласці Канстанцін Сумар, — гэта вынік захавання высокай тэхналагічнай дысцыпліны і карпатлівай працы. Калі і далей будзем ісці па шляху бездакорнага захавання тэхналогій, атрымаем яшчэ больш.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■

ЧАМУ АБАМА АДКЛАЎ ІНТЭРВЕНЦЫЮ Ў СІРЫЮ

Яшчэ тыдзень таму, здавалася, лёс Сірыі прадвызначаны і вось-вось пачнецца інтэрвенцыя міжнароднай кааліцыі. Аднак замест гэтага адзін з завадатараў узброенага ўмяшання ЗША (у асобе прэзідэнта Барака Абамы) узяў паўзу. Гэта звязана з тым, што першапачатковы план інтэрвенцыі, распрацаваны ваенна-палітычным кіраўніцтвам ЗША на чале са старшынёй Аб'яднанага камітэта начальнікаў штабоў ЗША Марцінам Дэмпсі, стаў часткова неактуальным. Камандны цэнтр аперацыі быў разгорнуты ў сталіцы Іарданіі Амане, а камандаваць аперацыяй павінен быў амерыканскі брыгадны генерал Джон Уайт, удзельнік уварванняў у Афганістан, Ірак і Лівію. Пры гэтым удзел ЗША ў інтэрвенцыі павінен быў абмежавацца толькі агульнай каардынуючай роляй.

Першапачаткова план аперацыі супраць Сірыі прадугледжваў, што ўзброеныя сілы ЗША, Францыі, Вялікабрытаніі, Саудаўскай Аравіі і Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў усталююць беспілотную зону над цэнтральнай і паўднёвай часткамі Сірыі, якія прымыкаюць да мяжы з Іарданіяй. Пры гэтым падтрымку з паветра павінен быў аказаць Ізраіль. Далей планавалася стварыць 40-кіламетровую буферную зону, пачынаючы ад іарданскай мяжы і аж да заходняй і паўднёвай ускраін Дамаска. Гэтую зону павінны былі ўтрымліваць каля 3 тысяч сірыйскіх паўстанцаў, якія складаюцца з прадстаўнікоў арабамоўнай этнаканфесійнай групы друзаў. Яны прайшлі папярэднюю падрыхтоўку ў спецыяльных ваенных лагерах на тэрыторыі Іарданіі, пад кіраўніцтвам амерыканскіх ваенных інструктараў і супрацоўнікаў ЦРУ. Наступным крокам павінна было стаць аб'яўленне сірыйскага горада Дэраа сталіцай «вызваленай» Сірыі.

Эдвард Сноўдэн і прычына паўзы з боку ЗША

Аднак ЗША былі вымушаны ўзяць паўзу ў сувязі з тым, што іх галоўныя саюзнікі па НАТА, перш за ўсё Вялікабрытанія і Германія, адмовіліся ад удзелу ў інтэрвенцыі без санкцыі Савета Бяспекі ААН. Таксама пра сваё нежаданне ўдзельнічаць у інтэрвенцыі выказаў і Ізраіль, які асцерагаецца ракетных удараў з боку Ірана ў выпадку свайго ўдзелу ў аперацыі. Такім чынам, першапачатковы план, які прадугледжвае шырокае ўцягванне саюзнікаў ЗША па НАТА ў сірыйскі канфлікт, не апраўдаў сябе. Адзінай натаўскай краінай, якая з самага пачатку актыўна рвалася ў бой супраць Башара Асада, заставалася Францыя — адзін з галоўных ініцыятараў інтэрвенцыі ў Лівію.

І хоць дэмарш амерыканскіх саюзнікаў па НАТА выкліканы іх скепсісам адносна прад'яўленых міжнароднай супольнасці доказаў прымянення хімічнай зброі Башарам Асадам, алею ў агонь таксама падліў экс-супрацоўнік Агенцтва нацыянальнай бяспекі ЗША Эдвард Сноўдэн, які апублікаваў інфармацыю пра тое, што ЗША пільна сочаць за сваімі саюзнікамі па Альянсу, перш за ўсё, за Германіяй і Вялікабрытаніяй. Справа Сноўдэна наогул вельмі істотна паўплывала і яшчэ паўплывае на амерыкана-еўрапейскія адносіны. І таму недавер, справакаваны апублікаванай Сноўдэнам інфармацыяй аб сачэнні за саюзнікамі, безумоўна, стаў экстрапалявацца і на пытанне аб інтэрвенцыі ў Сірыю. Між іншым, кіраўнік Еўракамісіі Жазэ Мануэль Барозу ўжо зрабіў заяву падчас саміту G20, які праходзіў у Санкт-Пецярбургу, згодна з якім ЕС выступае за палітычнае ўрэгуляванне сірыйскага канфлікту.

Дарэчы, менавіта падчас саміту G20 у Санкт-Пецярбургу прайшлі чарговыя канструктыўныя кансультацыі па сірыйскім пытанні паміж прэзідэнтамі ЗША і Расіі, якія адзначылі пераход да новай стратэгіі па сірыйскім урэгуляванні.

Некалькі прычын змены стратэгіі па Сірыі

Існуе некалькі важкіх прычын, з-за якіх ЗША вырашылі змяніць сваю стратэгію па Сірыі.

Па-першае, гэта звязана з тым, што сірыйскія паўстанцкія сілы вельмі моцна раз'яднаны. Галоўнымі гульцамі з'яўляюцца Сірыйская свабодная армія (ядро прадстаўлена сірыйскімі ваеннымі-дэзертырамі), арганізацыямі братоў-мусульман (падтрымліваецца Катарам), радыкальнымі ісламісцкімі суполкамі, афіляванымі з «Аль-Каідай» (гэта, перш за ўсё, «Джабхат Ан-Нусра» і «Ісламская дзяржава ў Іраку аль-Шам», якія падтрымліваюцца Саудаўскай Аравіяй). Яны не выступаюць адзіным фронтам, больш за тое, гэтыя групы пачалі весці жорсткую барацьбу адна з адной. Да таго ж прадстаўнікі «Джабхат Ан-Нусра» і «Ісламскай дзяржавы ў Іраку аль-Шам», найбольш радыкальных і ваяўнічых суполак «Аль-Каіды», неаднаразова былі заўважаны ў этнаканфесійных чыстках, вынікам якіх стала знішчэнне насельніцтва некалькіх курдскіх і хрысціянскіх вёсак. Больш за тое, метады вядзення вайны групоўкай «Ісламская дзяржава ў Іраку аль-Шам» настолькі жорсткія, што нават некаторыя радыкальныя групы, такія, як, напрыклад, Група каўказскага джыхаду, вырашылі пакінуць тэрыторыю Сірыі з-за іх.

Як відаць з першапачатковага плана інтэрвенцыі, ЗША вырашылі зрабіць стаўку ў пытанні падтрымкі інтэрвенцыі на новага гульца, прадстаўленага друзамі. Па сутнасці, друзы — гэта новы суб'ект у сірыйскім канфлікце, і стаўка ЗША на іх у пытанні інтэрвенцыі сведчыць пра жаданне амерыканскага боку надаць хаатычным працэсам кіраваны характар, пацясніўшы пры гэтым іншыя групоўкі паўстанцаў, асабліва радыкалаў.

Па-другое, яшчэ адной прычынай адмены інтэрвенцыі з боку ЗША з'яўляецца магчымы канфлікт з Іранам, які можа пачацца адразу ж пасля правядзення ваеннай аперацыі супраць Сірыі. Іран, стратэгічны саюзнік Сірыі, з самага пачатку канфлікту прымае актыўны ўдзел у яго вырашэнні, пастаўляючы для барацьбы з паўстанцамі элітныя падраздзяленні Корпуса вартавых ісламскай рэвалюцыі (па некаторых ацэнках, на тэрыторыі Сірыі іх знаходзіцца некалькі дзясяткаў тысяч чалавек). Акрамя гэтага, на баку Башара Асада ваюе шыіцкая радыкальная групоўка «Хезбалах», якую падтрымлівае Іран. Ці гатовыя сёння ЗША да вайны з Іранам, пытанне вельмі складанае. Але тое, што вайна з Іранам можа пачацца з-за Сірыі, з'яўляецца вельмі сур'ёзнай рызыкай, тым больш што такія дзяржавы Персідскага заліва, як Катар і Саудаўская Аравія, гуляюць менавіта на эскалацыю сірыйскага канфлікту ў кірунку вайны з Іранам. Многія эксперты наогул лічаць крызіс у Сірыі вынікам ірана-арабскага суперніцтва ў рэгіёне Персідскага заліва, выкліканага планамі з аднаго боку — Катара, з другога — Ірана па будове газаправодаў праз тэрыторыю Сірыі.

Па-трэцяе, існуе рызыка, што ў рукі радыкальных ісламісцкіх груповак, такіх, як «Джабхат Ан-Нусра» ці «Ісламская дзяржава ў Іраку аль-Шам», можа трапіць хімічная зброя і не толькі. Нядаўна Расія накіравала запыт у МАГАТЭ на аналіз рызык, звязаных з бяспекай ядзерных аб'ектаў у Сірыі ў кантэксце магчымай ваеннай аперацыі ЗША. Расія заклапочана рызыкамі, звязанымі з магчымымі ўдарамі па ядзерным рэактары. Аднак існуюць вельмі сур'ёзныя падазрэнні, што Сірыя ўжо даўно рэалізуе сваю ўласную ядзерную праграму пры падтрымцы Ірана і КНДР. Паводле ацэнак экспертаў, наяўнай колькасці ўзбагачанага ўрану недастаткова для стварэння ядзернай бомбы, аднак гэтага дастаткова для стварэння так званай «бруднай ядзернай бомбы».

Гэта азначае, што таксама існуе рызыка таго, што ў выніку інтэрвенцыі радыеактыўныя матэрыялы (магчыма, нават нешта больш сур'ёзнае) могуць трапіць у рукі радыкальных ісламісцкіх груповак, звязаных з «Аль-Каідай», у чым, безумоўна, не зацікаўлена ні адна з краін свету, уключаючы ЗША.

Арсен СІВІЦКІ, палітычны аналітык, кіраўнік Цэнтра стратэгічных і знешнепалітычных даследаванняў.

ТРЫНАЦЦАТЫ САМІТ

13 верасня 2013 года ў горадзе Бішкеку прайшло пасяджэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС). Гэты саміт стаў трынаццатым, і тое, што ён праводзіўся на тэрыторыі адной з самых маленькіх краін-удзельніц — Кыргызстана — не паўплывала на парадак дня і прынятыя рашэнні, многія з якіх былі дастаткова важнымі. У прыватнасці, быў ухвалены План дзеянняў на 2013—2017 гады па рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб доўгатэрміновым добрасуседстве, дружбе і супрацоўніцтве паміж дзяржавамі—членамі ШАС.

Пазіцыя па Іране

Увагу сусветных СМІ прыцягнула першая сустрэча лідара Расіі з прэзідэнтам Ісламскай Рэспублікі Іран Хасанам Рухані, якога нядаўна абралі на гэту пасаду. Варта адзначыць, што Рухані станоўча ацаніў намаганні Расіі па сірыйскім пытанні, выказаўшы надзею на тое, што ўдасца пазбегнуць новай вайны ў рэгіёне. У час саміту краіны — удзельніцы ШАС таксама выказалі заклапочанасць у сувязі з сітуацыяй вакол самога Ірана і яго ядзернай праграмы. Іх пазіцыя заключаецца ў тым, што пагрозы прымянення ваеннай сілы і аднабаковыя санкцыі асобных дзяржаў супраць гэтай краіны з'яўляюцца непрымальнымі. Развіццё падзей па канфрантацыйным сцэнарыі небяспечнае сур'ёзнымі і непрадказальнымі наступствамі як для ўсяго рэгіёна, так і для міжнароднага свету і бяспекі ў цэлым.

Афганскае пытанне

На сустрэчы Уладзіміра Пуціна з прэзідэнтам Ісламскай Рэспублікі Афганістан Хамідам Карзаем была агучана занепакоенасць расійскага боку магчымай нестабільнасцю ў сувязі з будучым вывадам кааліцыйных міжнародных сіл. Прэзідэнт Афганістана адзначыў, што па пытанні бяспекі ўзброеных сіл Афганістана краіна мае патрэбу ў дапамозе Расійскай Федэрацыі і просіць, каб Расія падтрымлівала і дапамагала Афганістану.

Цікава, што Хамід Карзай паведаміў, што адзін з ключавых кандыдатаў на будучых прэзідэнцкіх выбарах у Афганістане знаходзіцца тут жа ў зале, і выказаў сваю ўпэўненасць у тым, што новы прэзідэнт Афганістана таксама будзе падтрымліваць стасункі з Расійскай Федэрацыяй. У дэкларацыі па выніках саміту прагучала: «Дзяржавы-члены выступаюць за пабудову ў Афганістане незалежнай, нейтральнай, мірнай, працвітаючай краіны, свабоднай ад тэрарызму і нарказлачыннасці».

Бяспека не за кошт іншых

Выказаліся на саміце і супраць паскоранага нарошчвання краінамі Захаду сістэм супрацьракетнай абароны (СРА). Дзяржавы-члены мяркуюць, што аднабаковае і неабмежаванае нарошчванне СРА адной дзяржавай або групай дзяржаў, без уліку інтарэсаў іншых краін, здольнае нанесці ўрон стратэгічнай стабільнасці і міжнароднай бяспецы. Члены ШАС настойваюць на тым, што звязаныя з гэтым праблемы неабходна ўрэгуляваць палітыка-дыпламатычнымі намаганнямі ўсіх зацікаўленых дзяржаў і перакананы, што немагчыма забяспечваць уласную бяспеку за кошт бяспекі іншых. Сапраўды, праграмы СРА Захаду здольныя разбалансаваць існуючыя сістэмы ядзернага стрымлівання, што можа выклікаць новую гонку ядзерных узбраенняў.

Эканамічны блок

На думку ўдзельнікаў мерапрыемства, нестабільнасць сусветнай эканомікі, якая захоўваецца, патрабуе сумесных эфектыўных дзеянняў дзяржаў — членаў ШАС у галіне эканамічнага супрацоўніцтва. На саміце гаварылася пра неабходнасць паскарэння рэалізацыі праектаў, якія

забяспечваюць пашырэнне транспартна-камунікацыйных магчымасцяў рэгіёна, развіццё інфраструктуры, стварэнне міжнародных мультымадальных цэнтраў лагістыкі, гандлю і турызму, укараненне інавацыйных і энергазберагальных тэхналогій, у тым ліку з прыцягненнем патэнцыялу дзяржаў-назіральнікаў і партнёраў па дыялогу.

Паколькі Беларусь з'яўляецца адным з партнёраў па дыялогу гэтай арганізацыі, будзем спадзявацца на яе прыцягненне да такога кшталту праектаў. Улічваючы, што на саміце вялася гаворка і пра стварэнне Фонду развіцця (Спецыяльнага рахунку) ШАС і Банка развіцця ШАС, у перспектыве пад падобнага кшталту супрацоўніцтва можна будзе знайсці і фінансаванне.

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук.

■ Культурная сталіца

МУЛЬТГОРАД МАГІЛЁЎ

У абласным цэнтры адкрыўся XVI Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў.

На «Анімаёўцы-2013» у Магілёве пакажуць мультфільмы з больш чым двух дзясяткаў краін. У гэтым спісе не толькі блізкае замежжа, але і Францыя, Партугалія, Бельгія і іншыя краіны, нават Егіпет і Іран.

Міжнароднае журы фестывальнага конкурсу сёлета ўзначальвае рэжысёр, сцэнарыст, выкладчык ВГІКа, заслужаны дзеяч культуры Расіі Леанід Носыраў, вядомы шырокай аўдыторыі як аўтар папулярных савецкіх мультфільмаў «Вясёлая карусель» — напрыклад, пра Антошку.

«Анімаёўка-2013» пачалася тэатралізаваным шэсцем і чырвонай дарожкай на плошчы Зорак. У кінатэатры «Радзіма» адкрылася выстава беларускай мастачкі Ганны Сілівончык «Казкі на палатне». Мастачка паказала магілёўцам чароўныя сюжэты: пра анёлаў, птушак, восеньскага вожыка, каралеву, сімпатычных мядзведзяў.

— Я выбірала такія карціны, якія б былі цікавыя дзецям на мультфестывалі, — расказала Ганна. — Мая 11-гадовая дачка Маша з цікавасцю глядзіць розныя анімацыйныя фільмы. Мне здаецца, што для дзяцей абавязкова трэба стварацца нешта прыгожае і разумнае, каб зацікавіць іх.

Паказы праграм мультфільмаў праходзяць не толькі ў Магілёве, але і ў райцэнтрах вобласці. На «Анімаёўцы» адбудзецца конкурс дзіцячай анімацыі «Я не чараўнік, я толькі вучуся». Вядучыя і героі тэлепраграмы «Калыханка» наведаюць Магілёўскі дзіцячы дом № 1. У праграме фестывалю ёсць сустрэчы з «зоркамі» анімацыі і дубляжу. Будуць і майстар-класы: напрыклад, аніматары з Арменіі будуць вучыць рабіць модныя цяпер «пясочныя» мультфільмы.

У сераду, 18 верасня, у Магілёве падвядуць вынікі «Анімаёўкі» і ўзнагародзяць пераможцаў творчага конкурсу.

Ілона ІВАНОВА

■

■ Спорт-тайм

ФУТБОЛ НА ФІНІШНАЙ ПРАМОЙ

«Звязда» ўзгадвае самыя цікавыя спартыўныя падзеі, якія адбыліся ў айчынным спорце на мінулым тыдні.

1. Першынство краіны па футболе выходзіць на фінішную прамую. Пасля 2-х «колаў» каманды разбіліся на дзве шасцёркі, у якіх вызначаць прызёраў чэмпіянату і, адпаведна, імя таго, хто пакіне вышэйшы дывізіён. Нагадаем, што першую групу камандаў склалі БАТЭ, «Шахцёр», сталічнае «Дынама», «Гомель», «Нёман» і «Тарпеда-БелАЗ», а другую — «Дняпро», брэсцкае «Дынама», «Белшына», ФК «Мінск», «Нафтан» і «Славія». 23 тур прынёс наступныя вынікі: «Белшына» — «Славія» — 2:1, «Мінск» — «Нафтан» — 4:0, «Дынама» (Брэст) — «Дняпро» — 0:1, «Дынама» (Мінск) — «Гомель» — 3:1, «Шахцёр» — «Тарпеда-БелАЗ» — 1:0, «БАТЭ — «Нёман» — 1:0. Першы радок турнірнай табліцы па-ранейшаму займаюць салігорцы (52 балы), на другой пазіцыі знаходзіцца БАТЭ (51 бал), а на трэцяй — мінскае «Дынама», якое адстае ад другога месца на 14 ачкоў. На жаль, чарговы тур азмрочыўся не вельмі прыемным фактам. На выхадных быў усталяваны антырэкорд сярэдняга наведвання заўзятарамі нашага чэмпіянату. У сярэднім гульні наведалі 1425 гледачоў. Дагэтуль, як сцвярджае сайт goals.by, найгоршым у гэтым плане быў другі тур. Тады на матчы ў сярэднім прыйшоў 1691 балельшчык.

Фота Надзеі БУЖАН.

Мінскае «Дынама» яшчэ знаходзіцца ў пошуку сваёй лепшай гульні.

2. Футбольная зборная Беларусі страціла ў рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі футбольных асацыяцый (ФІФА) 7 пазіцый. У вераснёвай версіі чарта ўсіх зборных свету дружына Георгія Кандрацьева знаходзіцца на 80-м месцы. Беларусы пераганяюць Паўночную Ірландыю, Эстонію, Кітай, Канаду, але саступаюць, напрыклад, Македоніі, Гаіці, Ямайцы. Лепшая зборная СНД у гэтым спісе — Расія. Каманда Фабіа Капэлы знаходзіцца на 15 месцы рэйтынгу ФІФА.

Яшчэ адна цікавая навіна прыйшла з Беларускай федэрацыі футболу. З пасады галоўнага трэнера моладзевай зборнай пайшоў Аляксей Вяргеенка. Замест яго з камандай працаваць будзе экс-трэнер наваполацкага «Нафтана» Ігар Кавалевіч.

3. Хакейнае «Дынама» прайграла ў чарговым паядынку Кантынентальнай хакейнай лігі. Гэтым разам мінчане на сваёй пляцоўцы саступілі пражскаму «Льву» — 1:3. Адзінай шайбай у беларускай камандзе вызначыўся Аляксандр Паўловіч. Учора беларусы ў гасцях сустракаліся з чарапавецкай «Поўначсталлю». Матч завяршыўся ўжо пасля таго, як нумар быў падпісаны ў друк. Падрабязнасці сустрэчы чытайце ў бліжэйшым нумары «Звязды».

4. Перамогай зборнай Расіі завяршыўся чэмпіянат Еўропы па валейболе. У фінале нашы ўсходнія суседкі пераканаўча перамаглі гаспадынь першынства — каманду Германіі (3:1). Нашы дзяўчаты таксама гулялі нядрэнна. У васьмёрку лепшых не трапілі, затое ўпершыню за 15 гадоў атрымалі вікторыю на кантынентальным першынстве і апынуліся на выніковым 12-м месцы з 16 удзельнікаў. З лікам 3:1 беларускі перайгралі Азербайджан. Праўда, былі таксама паражэнні ад Расіі і Харватыі, фіяска ў 1/8 фіналу ў паядынку з турчанкамі. Аднак сам выхад з групы для Беларусі — гэта таксама вынік, за які трэба падзякаваць нашай камандзе.

Тарас ШЧЫРЫ

■

НАВІНЫ

ДЗЯРЖКАМІТЭТ СУДОВЫХ ЭКСПЕРТЫЗ ПРЫМАЕ ЭЛЕКТРОННЫЯ ЗВАРОТЫ

У цэнтральным апараце Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз створана афіцыйная электронная паштовая скрыня. Цяпер як фізічныя, так і юрыдычныя асобы могуць накіроўваць свае звароты на электронны адрас sudexpertiza@sudmed.by.

Пры гэтым у прэс-службе ведамства папрасілі заяўнікаў накіроўваць паведамленні ў адпаведнасці з кампетэнцыяй Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз. Нагадаем, што эксперты праводзяць судова-медыцынскія і судова-псіхіятрычныя экспертызы: па крымінальных і грамадзянскіх справах; справах аб адміністрацыйных правапарушэннях; справах, звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай дзейнасцю; матэрыялах праверак па заявах аб злачынствах. Акрамя таго, даследуюць матэрыялы дзяржаўных органаў, якія ажыццяўляюць дазнанне, аператыўна-вышуковую і кантрольную дзейнасць. Пацвярджэнне адпаведнасці службовай і грамадзянскай зброі і боепрыпасаў патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў у вобласці тэхнічнага нармавання і стандартызацыі таксама адносіцца да сферы дзейнасці Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз.

Надзея ПАЎЛАВА.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ

ПАЛЯВАННЕ: З ПТУШКАМІ — НА ПТУШАК

З трэцяй суботы верасня, якая сёлета прыпадае на 21-е, па другую нядзелю снежня — 8-га — у краіне будзе дазволена паляванне на птушак.

— Дазваляецца здабываць гусей (белалобага, гуменніка і шэрых), канадскую казарку — любога полу і ўзросту, — паведаміў «Звяздзе» старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету Вадзім Варабей. — Згодна з Правiлами вядзення паляўнiчай гаспадаркі і палявання, дазволена здабыча трафеяў у светлы час сутак зброевым спосабам з падыходу, з засады, з падваблiваннем, з пад'езду з маламерных суднаў (без рухавіка ці з непрацуючым рухавіком). Можна выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю і патроны са шротам. А для пошуку і падачы здабытай дзічыны дапускаецца выкарыстанне паляўнічых сабак: тэр'ераў, таксаў, выжлаў, спаніэляў, рэтрывераў, водных сабак. Таксама дазваляецца паляваць бяззброевым спосабам — з лоўчымі птушкамі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СЯРЭБРАНЫЯ ШАЛІ

Учора Нацыянальны банк увёў у абарачэнне 3 сярэбраныя памятныя манеты серыі «Задыякальны гараскоп» — «Шалі (Libra)», «Стралец (Sagittarius)» і «Скарпіён (Scorpio)», паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў галоўнага банка краіны.

Кожная манета мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925, масу 28,28 грама, дыяметр 38,61 міліметра.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ДАМБРОЎКА СТАНЕ БЛІЖЭЙ

У новых сталічных мікрараёнах Дамброўка і Каменная Горка з 16 верасня па будных днях у ранішні час пік будзе арганізавана праца новых аўтобусных маршрутаў.

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», гэта будуць маршруты №54 «ДС «Кунцаўшчына» — ст. м. «Спартыўная» са следаваннем па вуліцах Матусевіча, Жудро, Прытыцкага з выкананнем усіх прамежкавых прыпыначных пунктаў, і №128 «Каменная Горка-4» — ст. м. «Каменная Горка» з рухам па вуліцах Налібоцкай, Нёманскай, Казіміроўскай, Кунцаўшчына, Прытыцкага з выкананнем усім прамежкавых прыпыначных пунктаў. А вось у зваротным кірунку абодва гэтыя аўтобусныя маршруты падвозіць пасажыраў не будуць.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«SABAKOED228» БОЛЬШ НЕ ПРАДАЕ НЕБЯСПЕЧНЫ ПСІХАТРОП

У Мінску затрыманы арганізатары аптовай сеткі па распаўсюджванні наркотыкаў праз інтэрнэт. У іх канфіскавана звыш кілаграма курыльных сумесяў, псіхатропныя рэчывы, банкаўскія пластыкавыя карткі, камп'ютарная тэхніка, sim-карткі і звыш 26 тысяч долараў.

Як паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў, больш за год зламыснікі дзейнічалі ў сацыяльных сетках, на тэматычных парталах і форумах пад нікамі «Сваяк», «Sabakoed228», «Snoopyvip777» і былі добра вядомыя асобам, якія маюць дачыненне да наркабізнесу ў Мінску і іншых рэгіёнах краіны. Для пастаянных кліентаў існавала сістэма бонусаў, злачынцы клапаціліся пра рэпутацыю — колькасць і якасць наркотыкаў, пунктуальнасць падчас перадачы «тавару». Захоўвалася высокая канспіратыўнасць. Ніводзін пакупнік, які карыстаўся такімі паслугамі, не бачыў збытчыкаў у твар. Свой бізнес-офіс маладыя людзі (1988 і 1991 г.н.) пастаянна мянялі. У здымнай кватэры праваахоўнікі знайшлі 1,256 кг курыльнай сумесі з асабліва небяспечным псіхатропам, 327 г парашку і 512 таблетак з аналагічным рэчывам, 26 200 долараў, вялікую колькасць банкаўскіх картак, 3G-мадэмаў і sim-картак, зарэгістраваных на чужыя прозвішчы, некалькі электронных вагаў, мяхі з упаковачным матэрыялам і скрыні з тытунём.

Ахвотныя набыць наркотыкі звязваліся з пастаўшчыкамі праз інтэрнэт, ім указвалі электронныя кашалькі для пералічэння грошай. Пасля аплаты называлася месца, дзе схаваны «скарб». Устаноўлены многія карыстальнікі такой паслугі, сямёра з іх былі затрыманы падчас забірання «скарбу». У дачыненні да асноўных фігурантаў, якія былі раней не судзімымі і нідзе не працуюць, заведзены крымінальныя справы.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ДВАЙНОЕ ЗАБОЙСТВА Ў ГЛУСКУ

У забойстве маладой жанчыны і яе дачкі, якой было 3 месяцы, абвінавачваюць сужыцеля.

Жыхарку Глуска 1982 года нараджэння і яе маленькую дачку амаль тыдзень шукала міліцыя. Яшчэ ад 7 верасня іх месцазнаходжанне было не вядома. Яе фотаздымак паказвалі па абласным тэлебачанні з аб'явай аб пошуку. Жанчына была ў дэкрэтным водпуску і часова не працавала. Між тым міліцыя правярала дачыненне да знікнення маці з дзіцем сужыцеля.

Цяпер на брыфінгу для журналістаў ва УУС Магілёўскага аблвыканкама пракаментавалі вынікі аператыўна-следчай працы, якія шакіруюць. Выяўлена, што сужыцель жанчыны ў сварцы забіў іх, пасля чаго вывез на аўтамабілі целы і закапаў паблізу вёскі Хвастовічы. Мужчына арыштаваны і прызнаўся ва ўчыненым асабліва цяжкім злачынстве. Вядома, што ён 1985 года нараджэння і працаваў у банку. Сварыўся ён з жанчынай якраз з-за дзіцяці: яна мела намер падаць у суд на ўстанаўленне бацькоўства. У забітай глусчанкі ёсць яшчэ двое дзяцей, яны цяпер засталіся без маці.

Алена КАЗЛОВА.

ТУРУХТАНЫ ПАД ПРЫЦЭЛАМ

Паблізу вёскі Сітніца Лунінецкага раёна работнікі Мікашэвіцкай міжрайінспекцыі затрымалі работніка мясцовага рыбгаса. І было за што.

Мужчына незаконна здабыў восем птушак, у тым ліку двух турухтанаў. Гэта від, які занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. У парушальніка канфіскаваны тры паляўнічыя стрэльбы і боепрыпасы да іх.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПРАФЕСІЙНЫ НЮХ

У Рэспубліканскім пункце пропуску «Церахоўка» пры праверцы пасажырскага цягніка «Санкт-Пецярбург — Днепрапятроўск» службова-вышуковы сабака паказаў на магчымую наяўнасць наркатычных рэчываў у адным з купэ.

Пры аглядзе ў асабістых рэчах 20-гадовага жыхара горада Апатыты Мурманскай вобласці былі выяўлены два няправільнай формы кубікі цвёрдага рэчыва цёмна-зялёнага колеру. Рэчыва было накіравана на экспертызу. Паводле заключэння экспертаў, грамадзянін Расіі перавозіў гашыш. Заведзена крымінальная справа па прыкметах злачынства, прадугледжанага артыкулам аб кантрабандзе. Мужчына знаходзіцца ў ізалятары часавага ўтрымання. У прэс-групе Гомельскай мытні паведамілі, што той жа сабака вясной у гэтым жа цягніку ўжо знаходзіў наркотыкі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Калі ўязджаеш у Ліду, перад вачамі паўстае прыгожы сучасны горад. Актыўна працуюць буйныя прамысловыя прадпрыемствы, прадукцыя якіх вядома далёка за межамі краіны. Весела гамоняць дзеці, выбягаючы з акуратных хатак, абгароджаных платамі. Наведнікі спяшаюцца да культурна-аздараўленчых і спартыўных комплексаў. Малыя архітэктурныя формы ўпрыгожваюць ціхія чыстыя вулачкі... І толькі Лідскі замак нагадвае пра немалады ўзрост горада. Яго 690-годдзе адсвяткавалі на днях лідчане.

Рыцарскі турнір у Лідскім замку.

СВЯТА ГОРАДА З РАМАНТЫЧНАЙ НАЗВАЙ

Імі ганарыцца Лідчына

Як тая свавольная дзяўчына, Ліда паказвала свой капрызны характар. Аднак наперакор дажджліваму надвор'ю лідчане пакінулі хатнія справы і выйшлі на вуліцы горада, каб разам адзначыць яго юбілей. Для некаторых мясцовых жыхароў гэты дзень стаў асабістым святам: ім прысвоілі званне «Ганаровы грамадзянін Лідскага раёна».

— 690 гадоў — вялікі шлях для любога горада, — зазначыў **старшыня Лідскага раённага выканаўчага камітэта Аляксандр АСТРОЎСКІ.** — Ці быў ён для Лідчыны лёгкім і выдатным? Хутчэй за ўсё не. Войны, разрухі, змены ў палітычнай карце Еўропы ўносілі карэктывы ў гісторыю горада і раёна. Але нашы людзі сваімі рукамі і ўчынкамі вакол сэрца нашага краю — Лідскага замка — самаахвярна аднаўлялі цудоўнейшы горад. Амаль 70 гадоў мы жывём у міры і дабрабыце. За гэты час, дзякуючы творчым і таленавітым людзям, Лідчына стала вядомай далёка за межамі Гродзеншчыны, за межамі рэспублікі. Прадукцыя шматлікіх нашых прадпрыемстваў стала візітнай карткай: яе ведаюць у Еўропе і на іншых кантынентах. Ёсць людзі, якія і сёння ствараюць гэты імідж.

Твар любога горада і яго раёна — яго жыхары. Разам з уладальнікамі такога высокага звання ўшаноўвалі і ўдзельнікаў праекта «Гонар Лідчыны». На працягу года па лідскім тэлебачанні расказвалі пра людзей, якія сваімі ўчынкамі праславілі гэты край. Каля гісторыка-мастацкага музея была адкрыта аднайменная скульптура. Яе аўтар — мясцовы аўтар Рычард Груша.

Новая славутасць Ліды ўяўляе сабой аснову з каменя, на якой выбіты спецыяльныя таблічкі ў выглядзе зорак. Кожная з іх прысвоена пэўнай асобе, якая сваёй дзейнасцю праславіла Лідчыну. Сярод іх — былыя кіраўнікі горада і раёна, дырэктары прадпрыемстваў, вайскоўцы, прадстаўнікі духавенства, адукацыі, культуры, мастацтва, спорту, медыцыны...

— Быць у ліку такіх сапраўды выдатных і паважаных людзей — найвышэйшы гонар і яшчэ большая адказнасць, — перакананa **дырэктар гімназіі №1 Наталля ЗАЙЦАВА.** — Я ўспрымаю гэтае заахвочванне як даніну павагі не мне канкрэтна, а Настаўніку, яго вялікай місіі на роднай зямлі, майму калектыву, які робіць школу паспяховай і эфектыўнай. Менавіта ён, гэты цудоўны педагагічны калектыў, узгадоўвае будучыню роднай Лідчыны і Беларусі. Менавіта ён працуе так, што выклікае давер у бацькоў і грамадскасці. Дзякуючы яму, ужо больш за 10 гадоў лідская гімназія з'яўляецца лідарам адукацыі ў Гродзенскай вобласці, уваходзіць у лік лепшых устаноў адукацыі рэспублікі, займае годнае месца на рэспубліканскай дошцы гонару.

Сярод уладальнікаў звання «Гонар Лідчыны» — і **саліст Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Свята» Вячаслаў Статкевіч.** Нарадзіўся ён у маленькай вёсачцы Рэпнікі, што за 15 кіламетраў ад Ліды.

Прыемна, што сёння заклалі зорку, у якой увекавечана маё прозвішча, — прызнаўся Вячаслаў Казіміравіч. — Для Ліды я шмат чаго рабіў і раблю. Колькі магу, прыязджаю сюды, выступаю ў розных іпастасях: ад вядучага да артыста. З горадам звязана ўсё самае лепшае. Вельмі прыемна, што Лідчына дала Беларусі шмат талентаў.

— А ці наведваеце бацькоўскую хату? — не магла не пацікавіцца я.

— Родная вёска, дзякуй Богу, жыве. А вось бацькоўскую хату знеслі мясцовыя ўлады. Праўда, усё роўна прыязджаю сюды. Тут складаюцца мае песні, аб гэтым хутары, дзе я нарадзіўся, мне сняцца сны.

Напрыканцы вядомы спявак дадаў, што ў яго хаце газета «Звязда» бывае кожны дзень.

Вандроўка ў сярэднявечча і фестываль квасу

Лідчане ганарацца сваім гістарычным мінулым. Невыпадкова кажуць, што ў таго народа, які не ведае сваю гісторыю, няма будучыні. А мясцовыя жыхары яе не толькі ведаюць, а і час ад часу туды вяртаюцца.

Любімая гістарычная эпоха для іх — Сярэднявечча. А дзе, як не ў Лідскім замку, туды можна трапіць? Вось і на гэты раз жыхары і госці горада сталі сведкамі рыцарскіх баёў. Каманды з Навагрудка, Мінска і Масквы змагаліся за права першынства ў турніры. Сцены старадаўняга замка, музыка таго часу, рыцарскія даспехі, гук мячоў — і я адчувала сябе жонкай Ягайлы, якая выйшла на балкончык паназіраць за тым, што робіцца ў дварэ.

— Нягледзячы на рэканструкцыю Лідскага замка, якая ўжо знаходзіцца на стадыі завяршэння, кожны дзень яго дзверы адчынены для наведнікаў, — расказала **дырэктар Лідскага гісторыка-мастацкага музея Ганна ДРАБ.** — Акрамя рыцарскага турніру, у адной з вежаў замка можна паглядзець выставу «Сярэднявечча». Пасля завяршэння работ на тэрыторыі замка будзе працаваць рэстаран, у якім стануць гатаваць сярэднявечныя стравы. Адкрыецца крама, дзе можна будзе набыць сувеніры, вельмі падобныя да тых, што прадаваліся тут раней. Маладыя будуць мець магчымасць зарэгістраваць свой шлюб у сценах замка ў духу той эпохі.

... За сценамі замка панавала сялянскае жыццё. З імправізаваных падвор'яў чуліся беларускія песні, пах хатняй ежы дурманіў галаву. Тут, на фестывалі квасу, за права звацца лепшым падвор'ем змагаліся амаль усе сельскія гаспадаркі Лідчыны. Першай на маім шляху сустрэлася падвор'е з маёй малой радзімы — ЛРСУП «Мажэйкава».

— Мы прадстаўляем маёнтак пана Брахоцкага, які некалі жыў на мажэйкаўскай зямлі, — патлумачыла **кіраўнік народнага ансамбля бытавых і шумавых інструментаў «Каханачка» Людміла МАСЕВІЧ.** — У пана была свая стайня, пральня. А яго квасоўня славілася на ўсю Гродзеншчыну! Пазней ён стварыў тут спіртзавод. Невыпадкова лідскі квас сёння ведаюць ва ўсім свеце.

Як і горад, які носіць такую рамантычную назву — Ліда. А я ад'язджаю, і ў маіх думках вядомыя радкі з песні: «Родны мой горад, любоў мая, казка кахання чароўная. Ты, калі ласка, чакай мяне з кожнай дарогі, са шляху расстайнага...»

Вераніка КАНЮТА. Фота аўтара.

Лідскі раён

Лідчане даведаліся пра напад гітлераўцаў у першыя гадзіны вайны.

Юрый ЯРЭМІЧ, дырэктар прыватнага сельгаспрадпрыемства «Ляхавіцкае Агра»:

— Прыехаў у Іванаўскі раён з Гродзеншчыны і ажно 23 гады працаваў у Мастоўскім раёне, пяць — у Ваўкавыскім. Прыемна сёння, у дзень уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР, павіншаваць калектыў раённай газеты «Чырвоная звязда» з 70-годдзем. Зычым, каб роднае беларускае слова творцаў дапамагала нам, аграрнікам, вырошчваць высокія ўраджаі, аднаўляць нашы палескія вёскі. Няхай трывалае здароўе, ваша і наша натхненне ў працы, уласная ініцыятыва мацуюць веру ў заўтрашні дзень маладой Рэспублікі Беларусь.

УНН 290986590

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Віктар САСТРАЎЧУК, старшыня праўлення СВК «Кастрычнік-Агра»:

— Ад шчырага сэрца віншую калектыў Іванаўскай раённай газеты «Чырвоная звязда» з 70-годдзем. Вельмі прыемна, што і калгас у родным Дастоеве называўся «Чырвоная звязда»! Узначальваў яго педагог па спецыяльнасці Васіль Гурыновіч, вопытны арганізатар, мудры кіраўнік. Я ж пэўны час працаваў вадзіцелем, потым чатыры гады — сакратаром пярвічнай калгаснай камсамольскай арганізацыі, служыў у Савецкай Арміі пад Ніжнім Ноўгарадам. Цяпер, з мінулага года, — кіраўнік СВК «Кастрычнік-Агра». Разам з нашымі земляробамі зычу творцам Іванаўскай «раёнкі», яе шматлікім чытачам творчага натхнення, моцнага здароўя і прыемных сустрэч з намі, аграрнікамі.

УНН 200075475

ВУЛІЧНЫ ФЕСТЫВАЛЬ: пачатак

Артыст па імені Надвор'е прэтэндаваў на галоўную ролю ў Дзень горада Мінска

А як жа хацелася б мець свой калі не карнавал, то карнавальчык! Ах, Рыа, Рыа... Прыгожыя шэсці, бачаныя па тэлебачанні, распальваюць уяўленне. Але ж тут вам — не там, тут заўсёды любыя вулічныя мерапрыемствы залежаць ад дазволу нябеснай канцылярыі. І хацелі б людзі выйсці і «патусіць», але неба закрылі хмары, а рэдкія мінакі трымаюць напагатове парасоны.

Але паглядзіце на сітуацыю інакш: парасон можа стаць часткай антуражу, а хмары — сцэнаграфіяй, якая толькі правакуе артыстаў іграць лепш, радаваць больш, запальваць усмешкі насуперак усяму.

А калі пачаліся выступленні, спыняліся нават тыя, хто ішоў па справах. І тое, што мы лічылі непераможным (надвор'е) пакрысе адступіла.

Мо перад беларускім духам? Бо ці не самая складаная місія — адкрыць выступы калектываў — выпала на долю музычна-вандроўнага аркестрыка «Вурай». Гэта цуд, але беларускія песні, якія гурт прывозіць з этнаграфічных экспедыцый і прапануе слухачу ў сваёй апрацоўцы, заводзілі нават пад парасонамі! Сцэну акружылі, было жаданне патанчыць пад дудачку.

— Мы не першы раз іграем на пешаходнай вуліцы Карла Маркса, — гаворыць Сяржук Гаюн. — Мы ведаем, што людзі прыйдуць. І для кагосьці наш гурт стане адкрыццём, але прыходзяць і тыя, хто нас ведае, таму што ў асноўным музыкі сёння ў клубах іграюць, у рэстаранах. Але калі ёсць магчымасць паслухаць на вуліцы, з жывым гукам, то чаму не прыйсці? Хоць мне асабіста больш падабаецца, калі нас запрашаюць іграць на прыродзе, дзе побач возера ці рака. Усё роднае... Гарадскі асяродак па-свойму адметны і прыемны. Вулічныя канцэрты даюць больш магчымасцяў знаёміцца з новымі людзьмі, абменьвацца кантактамі. Мы ў асноўным вандруем з гэтай праграмай, якую выконвалі на фестывалі. Яна складаецца з песень розных куткоў Беларусі, прывезеных з маіх уласных экспедыцый. Шмат песень палескіх. Мне цікавае Палессе, там можна знайсці фальклор, які дагэтуль не быў запісаны. Мы такім чынам набіралі на новы дыск. Калі мы працуем з фальклорам, то нам важна захаваць беларускую мелодыку, але падаць ужо ў сучасным гучанні. Перадаць глыбіню, мелодыку, інфармацыю, якая ёсць у беларускіх песнях: адчуванне прыроды, роднага свету. Данесці да людзей гэтую любоў.

Гледачы на вуліцы Карла Маркса як сапраўдныя хіты ўспрымалі старыя песні гурта «Вурай»: «Казачку пра Баламута» ды «Русалкі», танчылі разам. А паслы — падыходзілі і зычылі музыкам поспеху. Любоў творыць цуды. Пад канец выступу ніхто не думаў пра надвор'е.

Перапынак да выступу гасцей з Санкт-Пецярбургу тэатра «Мініяцюр» запаўнялі шпацырам па вуліцы К. Маркса. Ці мэтанакіравана рушылі да іншай пляцоўкі: іх на Маркса было 3. Па дарозе — асобныя сталы з сувенірамі, працы майстроў, рэдкія шапікі з ежай і гарачымі напоямі. Але калі б не дождж... Было б весялей, каб не прыходзілася думаць, чым запоўніць паўзы паміж выступамі. Можа, гэта з-за таго, што некаторыя чаканыя калектывы з-за мяжы не даехалі да Мінска: у Еўропе ёсць попыт на вулічныя тэатры...

Але калі на пешаходнай зоне з'яўляліся артысты, сагравала думка: жыццё наладжваецца! У парыках і грыме ці без іх, у адмысловых строях ці ў вопратцы, якую носяць усе, але яны пачыналі ўцягваць мінакоў у свае дзеі, пачынаўся кантакт, ты не проста назіраў, а станавіўся часткай жыцця вуліцы. А ў яго свае законы і правілы: тут кожны не толькі глядач, але і ўдзельнік. І бліжэй да вечара, да заканчэння, нас — удзельнікаў — было ўжо шмат. Мы перамаглі дождж.

— Мне здаецца, што вулічным выступам больш патрэбны мімы і нешта кшталту «жывых скульптур», — вылучалася смяшлівая дзяўчынка ў кампаніі маладых людзей з «дрэдамі». Яны жыва дзяліліся ўражаннямі ад убачанага. Хлопцы гнулі сваю лінію, сур'ёзную:

— ...Альбо калі ідзеш на тэатр, то ўсё-такі хочацца, каб быў нейкі эксперымент: дзе ж яшчэ яго чакаць, як не ў жывым асяродку? Нешта такое ў тэатра «ЕУЕ» ёсць. А калі яшчэ потым гадаеш: што гэта ўсё значыла, дык наогул «крута», нібыта шараду расшыфроўваеш.

— Ну і інтэлектуал... Расслабся! — усміхнулася дзяўчынка.

Але ўсе разам яны потым рушылі ў Міхайлаўскі сквер, глядзець заключны спектакль ад тэатра «Інжэст», які любое шоу можа ператварыць у інтэлектуальную спрэчку і прапанаваць варыянты для асэнсавання. Спектакль «Залаты век у стылі барока» менавіта такі.

Узгорак ля тралейбуснага прыпынку стаў імправізаваным сцэнай. Ліхтары асвятлялі дзеючых асоб, якія адна за адной з'яўляліся пад прыгожую, узнёслую музыку. Вось маленькія людзі — у іх свае радасці, забавы. Але паралельна з ім існуюць вялікія людзі, амаль багі, у якіх свае адносіны. І нібыта пануе гармонія, дзе ў кожнага персанажа сваё месца. Але гучаць трывожныя матывы. Гармонію парушаюць вялізныя пачвары...

Свята, якое мае Мінск сёння — вынік яго доўгай гісторыі. Яшчэ адной крыніцай, з якой можна даведацца пра яе, стала кніга «Мінск. Лепшы від на гэты горад» Віктара Корбута, якую прадставіў Выдавецкі дом «Звязда». Гісторыя ад XI да XXI стагоддзя з цікавымі фактамі, інтрыгамі мінулага, вялікімі асобамі, якія ў розныя часы наведвалі горад, і людзьмі, якія ў ім жывуць сёння і ўслаўляюць яго ў сваіх творах і справах. Творчыя асобы пішуць яшчэ і пра чалавечыя пачуцці, якія перажываюць нашы сучаснікі. Напрыклад, пісьменнік Дзмітрый Пятровіч прадставіў сваю кнігу «Белая жанчына».

Тэатр «Інжэст» распавядае сваю гісторыю так, каб было зразумела: казка жывая. Вялікія жудасныя істоты ў металічным і з металічным позіркам аглядаюць прысутных. Усе запалоханыя, пераможаныя. Добра б маленькія, але і вялікія нічога не маглі супрацьпаставіць і пахаваліся ў роспачы...

Жах і хаос маглі б панаваць доўга. Каб не маленькія людзі, якія знайшлі паратунак... Яны прывезлі яго на залатым вазку ... І адбыўся цуд. Пачвары спалохаліся. А ён з нейкага сшытка (залатога) прачытаў загад, паводле якога ўсё цяпер павінна ісці толькі добра. Радуюца маленькія. Задаволены былыя вялікія, якія гатовы падпарадкоўвацца залатому чалавеку.

Авацыі былі зусім не вулічныя: мастацтва выходзіць за рамкі ўмоў і само стварае ўмовы.

Вулічнае мастацтва прыстасаванае існаваць у розных умовах. Цікавыя выступленні вулічных артыстаў — гэта і ёсць тая ўмова, пры якой часам не зважаеш на дождж і халаднаватае надвор'е. Форум вулічных тэатраў, які пачынаўся ў пахмурных умовах, здолеў іх перамагчы.

Ларыса ЦІМОШЫК, Фота Анатоля КЛЕШЧУКА. Відэа і больш фота на сайце: www.zviazda.by

ТАЛЕНТ ЯДНАЕ МАЙСТРОЎ

Такая выснова гучала ў выступах мастакоў і музыкантаў, якія ў Дзень горада сабраліся ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Тут ва ўрачыстай абстаноўцы была адкрыта выстаўка аднаго партрэта, прысвечаная «зорцы» айчыннай музыкі, харавому дырыжору і педагогу, народнаму артысту СССР Віктару Роўдзе.

Партрэт маэстра стварыў вядомы беларускі мастак Сяргей Салохін. Ці ўдалося фарбамі расказаць пра музыку — пра гэта абменьваліся думкамі жывапісцы, кампазітары, педагогі, грамадскія дзеячы. У гонар славутага дырыжора і педагога спявалі акадэмічны хор Беларускай тэлерадыёкампаніі і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. З гэтымі калектывамі ў свой час плённа працаваў Віктар Роўда.

Выразным святочным штрыхом, які падкрэсліў непарыўнасць сувязі творчасці маэстра з родным краем, стала выступленне яго землякоў. Са Смаргоні, дзе ў 1921 годзе нарадзіўся Віктар Роўда, на свята прыехаў ансамбль «Кантабіле».

Выстаўка аднаго партрэта — цікавая форма музейнай дзейнасці. Пад адным дахам, у розных залах суседнічаюць творы жывапісцаў розных эпох. Гісторыя грамадства паўстае тут у цеснай повязі з гісторыяй мастацтва. Калі пра выдатную асобу сучаснасці ці мінулага распавядае выдатны мастак-партрэтыст, яшчэ раз пераконваешся: таленты яднаюць майстроў.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

■ Падпіска-2013

ПРЫЗЫ — РУПЛІВЫМ ПАШТАЛЬЁНАМ!

...Спроба апытання: «Якая прафесія самая творчая?» — «Настаўнік», «Цырульнік», «Мастак», «Дызайнер», «Экскурсавод», «Хірург»... Колькі спецыяльнасцяў — столькі і думак.
Што, між іншым, чыстая праўда, бо бываюць, на вялікі жаль, нятворчыя падыходы, а вось нятворчых прафесій — няма.

Зрэшты, мяркуйце самі: адзін паштальён з месяца ў месяц (а то і з года ў год) будзе прыносіць «Звязду» (умоўна) тром падпісчыкам на сваім участку і нічога не зробіць для таго, каб іх стала, напрыклад, чатыры. Другі ж пачытае газету сам, раскажа пра яе іншым, выбера некалькі цікавых нумароў і пакіне камусьці пачытаць, прапануе выпісаць на месяц... А там, глядзіш, чалавеку спадабалася: ён аформіў падпіску — на квартал, на гэта паўгоддзе... Як і на наступнае!

Для таго, каб адзначыць працу якраз такіх неабыякавых да справы людзей, «Звязда» і заснавала **конкурс «Прыз — руплівому паштальёну».**

Па выніках падпісной кампаніі на другое паўгоддзе 2013-га іх (паштальёнаў, якія, паводле ўмоў конкурсу, дасягнулі прыросту колькасці падпісчыкаў не менш як на 10 чалавек) аказалася, на жаль, няшмат. Але яны ёсць!

Паводле інфармацыі, пададзенай РУП «Белпошта», першае месца (памер прэміі — па 1,5 мільёна рублёў) прысуджана ***Ліліі Сяргееўне Пінчук з аддзялення паштовай сувязі (АПС-3) г. Паставы і Аксане Вячаславаўне Патапенцы з АПС-1 г. Чачэрска*** (колькасць падпісчыкаў у іх узрасла адпаведна з 44 да 66 чалавек і з 6 да 21!)

Другое месца заваявалі ***Ала Сямёнаўна Вілейта з таго ж АПС-3 г. Паставы і Наталля Міхайлаўна Патапенка з АПС Рагі Гомельскага раённага вузла паштовай сувязі*** (прырост склаў адпаведна 17 і 12 асобнікаў «Звязды»), а памер узнагароджання ад рэдакцыі — па 1 млн рублёў.

Трэцяе месца з памерам прэміі па 700 тысяч рублёў прысуджана ***Марыі Мечыславаўне Круковіч з АПС Юркаўшчына Докшыцкага РВПС і Юліі Алегаўне Шыпнеўскай з АПС-1 г. Светлагорска,*** дзе колькасць падпісчыкаў «Звязды» павялічылася на 13 і 11 чалавек.

Віншуем нашых пераможцаў! Шчыра дзякуем ім за працу. А яшчэ — спадзяёмся, што іх творчы падыход стане прыкладам для іншых паштальёнаў. І тады падпісчыкаў у «роднай газеты на роднай мове» будзе больш. І больш пераможцаў. Бо конкурс працягваецца! А значыць, у паштальёнаў ёсць шанц на новыя ўзнагароды па выніках падпіскі ўжо на IV квартал 2013-га ■

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 8 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Сярод падпісчыкаў 10.10.2013 г. будзе разыграна 7 бясшнуравых тэлефонных апаратаў і суперпрыз — тэлевізар LG. Вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 20.10.2013 г.**

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі **па 31.12.2013 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года і пашпарта. **Пасля 31 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.

Правілы рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў газеце «Звязда» за 16.08.2013 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 20.08.2013 па 31.12.2013.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2211 ад 25.07.13, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

5 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ на IV кв. або 2-е паўг. 2013 года

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

«ЗАЛАТЫ» ЦЭННІК ЗЯМЛІ ПАД МІНСКАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Найбольш папулярнымі напрамкамі з'яўляюцца Лагойскі і Маскоўскі, дзе, акрамя чыстага паветра, ёсць яшчэ гарналыжныя комплексы і аздараўленчыя цэнтры. Таксама запатрабаваны Ракаўскі і Маладзечанскі напрамкі, за імі ідуць Мядзельскі, Брэсцкі і Слуцкі. Калі чалавек выбірае нерухомасць непасрэдна для жыцця, то ён спыніцца на блізкім прыгарадзе ў 5-10 км ад Мінска альбо выбярэ прыгарад з аддаленнем у 10-20 км. Участкі і дамы, якія знаходзяцца досыць далёка, звычайна набываюць для сезоннага знаходжання. У асобных выпадках павышаную цікавасць пакупнікі праяўляюць да зямельных участкаў у запаведных зонах — Налібоцкай пушчы, Бярэзінскім біясферным запаведніку, у раёне Браслаўскага возера, азёр Нарач і Свір, але там прадаўцы катэджаў трымаюць залішне высокія кошты.

Аналітыкі адзначаюць, што з пачатку года на другасным рынку загараднай нерухомасці было прыкметнае ажыўленне. Звязана гэта з пераацэнкай і як вынік — павелічэннем кадастравага кошту зямлі на першасным рынку. Кошт участкаў у прыгарадзе, пры набыцці іх на аўкцыёнах, ужо істотна павялічыўся, таму другасны рынак, больш інэртны ў дачыненні да цэнавых карэкціровак, стаў больш прывабным для пакупнікоў.

«Прапіска» мае рэальны кошт

У аснове цэнаўтварэння ўчасткаў ляжыць кадастравы кошт зямлі. Ён у першую чаргу залежыць ад месцазнаходжання зямлі, эканамічнага стану рэгіёна і плацежаздольнасці насельніцтва. У Нацыянальным кадастравым агенцтве нам паведамілі, што самы вялікі кадастравы кошт зямлі ў сталічным рэгіёне, а таксама ў абласных цэнтрах і буйных гарадах раённага падпарадкавання, дзе рынак нерухомасці найбольш актыўны. А вось танней за ўсё зямельныя ўчасткі ў сельскіх населеных пунктах у Магілёўскай вобласці, за выключэннем тэрыторый, прылеглых да горада Магілёва. Калі ў Мінску кошт соткі зямлі для размяшчэння жылой сядзібнай забудовы можа дасягаць 30 тысяч долараў, то, напрыклад, у горадзе Клецку ён не вышэйшы за 300 долараў. На кошт канкрэтнага зямельнага ўчастка яшчэ ўплываюць плошча і канфігурацыя; такія паляпшэнні, як камунікацыі, інжынерная інфраструктура, блізкасць вадаёмаў, лясы і шмат чаго іншага.

50 мільёнаў — за «сотку»

У першай дэкадзе верасня ў Мінскім раёне адбыўся аўкцыён па продажы зямельных участкаў пад індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. І гэты аўкцыён праходзіў дастаткова ажыўлена. Нягледзячы на тое, што ў зале сабралася дастаткова шмат людзей, паводле назіранняў экспертаў, непасрэдна ў таргах прымалі ўдзел не больш за палову з іх.

З 21 участка, што былі выстаўлены на аўкцыён, таргі праходзілі толькі па 9. Першы лот таргоў, размешчаны ў вёсцы Драздова (Бараўлянскі с/с), адразу ж задаў настрой усяму аўкцыёну. Участак агульнай плошчай 15 сотак (электрычнасць, газ) быў ацэнены і прададзены за 695 млн рублёў (каля 76 тысяч долараў). Самая вялікая колькасць заявак (12) была пададзена на ўчастак, размешчаны ў аграгарадку Калодзішчы.



Жнівень 2012



Жнівень 2013

МАЙ НА ЎВАЗЕ

Спадзявацца на тое, што зямля стане таннейшай, не варта. Зямля — гэта рэсурс, якога ніколі не стане больш, таму каштоўнасць яго, безумоўна, узрастае, асабліва ў доўгатэрміновай перспектыве. Нават калі цяпер вам зямельны ўчастак не патрэбен, то, магчыма, праз нейкі час ён стане для вас скарбам. Як паказала кадастравая ацэнка Мінска, праведзеная Нацыянальным кадастравым агенцтвам летась, дэфіцытныя землі для размяшчэння жылой (сядзібнай) забудовы карыстаюцца вялікім попытам у сувязі з памяншэннем іх аб'ёму. Павысіўся попыт на зямлю ў прыгарадзе сталіцы і ў Мінскім раёне. Да таго ж ні мінчане, ні інвестары не хочуць ад'язджаць далёка ад горада. Адпаведна расце і кошт такіх зямельных участкаў.

Сярэдні кошт прапановы зямельных участкаў (у доларах за 1 сотку)

Зямельны надзел агульнай плошчай амаль 12 сотак быў прададзены за 289 млн рублёў, што адпавядае 32 тысячам долараў. Размешчаны па суседстве з ім участак стаў наступным па папулярнасці, бо за яго «галасавала» 10 чалавек. Найбольш гарачая барацьба разгарнулася паміж двума ўдзельнікамі, а таргі спыніліся на адзнацы ў 404 млн рублёў (44 тыс. долараў).

На думку экспертаў, найбольшым попытам карыстаецца менавіта «незавершанка», але абавязкова з усімі неабходнымі камунікацыямі і зручным пад'ездам. Яе кошт у лепшых зонах індывідуальнай забудоўлі можа даходзіць да 150 тысяч долараў.

Не стаў нечаканасцю і ажыятаж з нагоды ўчастка ў аграгарадку Хацежына — на яго было пададзена 8 заявак. Пасля непрацяглай барацьбы паміж удзельнікамі таргоў яго першапачатковы кошт павялічыўся больш чым у 2 разы і склаў 448 млн рублёў (каля 49 тыс. долараў). Зямельны ўчастак, што размешчаны ў вёсцы Брадок (Астрашыцка-Гарадоцкі с/с) быў прададзены з мінімальным ростам першапачатковага кошту на 10% (1 крок аўкцыёну) — за 88 млн рублёў. За два ўчасткі ў вёсцы Гатовіна Юзуфаўскага с/с змагаліся 3 прэтэндэнты. Па выніках таргоў іх кошт павялічыўся больш чым у 2 разы і склаў 66 і 55 млн рублёў. Наступны аўкцыён адбудзецца 27 верасня.

Першапачатковы кошт 14 сотак дасягае 500 мільёнаў

На гэтым спецыялізаваным аўкцыёне сталічнага рэгіёна багатым людзям нашай краіны прапануюцца даволі дарагія зямельныя лоты ў Ждановічах і Ратамцы. У аграгарадку Ждановічы кліентам даецца магчымасць набыць два ўчасткі па 14 сотак кожны за 498 і 507 млн рублёў адпаведна. Участкі знаходзяцца зусім недалёка ад Мінска. З іх тэрыторыі відаць мікрараён Каменная Горка. Побач з дарагімі катэджамі пасвяцца каровы і козы. За ўчасткамі ёсць невялікая сажалка. Адзін з іх размешчаны на невялікім узвышшы, другі — на яго схіле. Пад'язныя шляхі добрыя, бо непасрэдна да тэрыторыі лотаў пракладзены асфальт. Усе камунікацыі да ўчасткаў падведзены. З мінусаў — вельмі шумна ад МКАД.

У аграгарадку Ратамка на аўкцыён прапануецца два ўчасткі. Адзін з іх (плошчай 7,8 сотак) выстаўлены на таргі за 99 млн рублёў, а другі (плошчай 9,35 сотак) мае першапачатковы кошт 230 млн рублёў.

Калі месца каштуе мільёны

Зразумела, што цэннікі на зямельную нерухомасць даволі моцна адрозніваюцца ў залежнасці ад кірункаў нават у 50-кіламетровай зоне каля Мінска. Самая танная зямля існуе ў продажы па Мядзельскім кірунку, дзе кошт соткі пачынаецца з 300 долараў. У 25-кіламетровай зоне ад сталіцы сотка зямлі для індывідуальнага будаўніцтва прапануецца ўжо не менш чым за тысячу долараў. А вось непасрэдна пад Мінскам кошты на ўчастках ўвогуле скачуць.

Так, напрыклад, у пасёлку Калодзішчы, што ў 5 кіламетрах ад МКАД, прапануецца ўчастак з незавершаным будаўніцтвам (фундамент). 11 сотак участка з усёй магчымай інфраструктурай каштуе 53 тысячы долараў. Цудоўны зямельны ўчастак у Лепельскім раёне на беразе возера Мгурына каштуе ўжо значна танней. Гэтыя 25 сотак у 250 кіламетрах ад Мінска прапануюцца кліентам усяго за 15 тысяч долараў.

Калі ў Мінску кошт соткі зямлі для размяшчэння жылой сядзібнай забудовы можа дасягаць 30 тысяч долараў, то, напрыклад, у горадзе Клецку ён не вышэйшы за 300 долараў.

Зусім незразумелыя цэны ўзнікаюць пры продажы маёмасці, узведзенай у суперэлітных месцах Беларусі. Напрыклад, цяпер у пасёлку Дразды выстаўлены на продаж двухузроўневы катэдж агульнай плошчай каля 300 квадратных метраў. У пакоях гэтага дома прысутнічае самая дарагая мэбля і сучаснае бытавое абсталяванне. Ёсць «цёплы» гараж на дзве машыны, кіназал, а на ўчастку — басейн з падагрэвам і ландшафны дызайн. Такі катэдж «пад ключ» прапануецца кліентам за 1 млн 780 тысяч долараў. Колькі каштуе там участак плошчай 12 сотак? Магчыма, што і мільён...

Сяргей КУРКАЧ.

КАМЕРЦЫЙНАЯ НЕРУХОМАСЦЬ ПРЫПЛЮСАВАЛА 10%

У жніўні сярэдні кошт квадратнага метра такіх памяшканняў ліквіднага класа «В» склаў 2155 долараў, класа «С» — 1833 долары. А ўвогуле цэннік на офісную нерухомасць на першасным рынку Мінска с пачатку года павялічыўся на 10%, паведаміла рэдакцыі кіраўнік праектаў агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Наталля НОВІКАВА.

Кошт памяшканняў для бізнесу ў мінулым месяцы даражэў і на другасным рынку. Сярэдні кошт прапановы па аб'ектах класа «В» дасягнуў 2529 долараў. Памяшканні гэтага класа даволі запатрабаваныя на рынку офіснай нерухомасці, бо пры добрай якасці яны маюць параўнальна невялікі кошт. Цэннік памяшканняў на базе гатовых аб'ектаў у трэцяй дэкадзе жніўня павялічыўся да 2000 долараў за квадратны метр.

Павелічэнне коштаў на офісныя памяшканні эксперты тлумачаць адкладзеным попытам і нізкім аб'ёмам прапановы якасных аб'ектаў. Акрамя таго, цяпер у бізнесу павялічыўся ўзровень даверу да дэвелаперaў і наблізіліся тэрміны ўводу аб'ектаў у эксплуатацыю. Да трэцяй дэкады снежня ў Мінску чакаецца адкрыццё 11 новых бізнес-цэнтраў.

Суразмоўца адзначае, што сёння попыт на набыццё ва ўласнасць офісных памяшканняў працягвае павялічвацца. Больш за тое, цяпер крыху змяніліся прыярытэты. Калі ў пачатку года найбольшая цікавасць была да памяшканняў з памерам плошчы да 50 квадратных метраў, то цяпер — ад 100 да 150 «квадратаў».

З пачатку года павялічыліся і арэндныя стаўкі на офісныя памяшканні. За гэты час кошт арэнды квадратнага метра элітных памяшканняў класа «А» павялічыўся на 7% (да 34 еўра/кв.м), класа «В» — на 11% (да 20 еўра/кв.м), класа «С» — на 5% (да 16 еўра/кв.м). Сярод арандатараў максімальным попытам карыстаюцца даволі сур'ёзныя офісныя блокі плошчай ад 200 да 250 квадратных метраў з машына-месцамі і зручнымі транспартнымі зносінамі.

Сяргей ПАЛІНІН.

Такі участак пад Мінскам каштуе да 500 мільёнаў рублёў.

ІНЖЫНЕР, ТЭХНІК АБО РАБОЧЫ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вялікі інтарэс у абітурыентаў выклікае сфера сувязі і камунікацый, аўтаматызацыя вытворчых працэсаў, дрэваапрацоўка, турызм і гасціннасць, сацыякультурная дзейнасць (замежныя мовы і справаводства). А вось попыт на эканамічныя спецыяльнасці пачаў зніжацца, што адпавядае адсутнасці попыту ў гэтых спецыялістах на рынку працы.

Сярэдні бал дакументаў аб адукацыі, што падаваліся ў прыёмныя камісіі каледжаў, быў на ўзроўні 7 балаў. Сярэдні бал пададзеных сертыфікатаў ЦТ вагаўся ад 100 да 130 балаў.

Да станка — з вышэйшай адукацыяй?

Як зазначыў Аркадзь Шкляр, апошнім часам на рынку працы з'явілася патрэба ў рабочых і спецыялістах — выпускніках прафесійных каледжаў і ліцэяў, ужо адаптаваных да ўмоў сучаснай вытворчасці, павысіліся патрабаванні працадаўцаў да ўзроўню прафесійнай кваліфікацыі выпускнікоў, што адбілася на прыёме на работу пераважна рабочых кадраў з павышаным кваліфікацыйным разрадам. Гэтыя задачы вырашаюць рэсурсныя цэнтры. Сёння адкрыты ўжо 23 рэсурсныя цэнтры па ўсёй краіне. Там створаны ўсе ўмовы для якаснага засваення праграм вытворчага навучання, набыцця практычных навыкаў работы на сучасным абсталяванні. Ідэя, якая ляжыць у аснове рэсурсных цэнтраў, — узровень прафесійнай адукацыі павінен адпавядаць або апярэджваць узровень развіцця вытворчасці.

— Кваліфікацыя спецыялістаў, якая патрабуецца на вытворчасці, даўно адышла ад такіх паняццяў, як рабочы, тэхнік ці інжынер. Усё часцей праблематычна вызначыць, хто павінен працаваць на той ці іншай пасадзе — інжынер або рабочы. Узровень патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да некаторых кваліфікацый, даўно перасягнуў той узровень, які патрабаваўся раней ад рабочага і спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Напрыклад, у любой галіне сёння прымяняюцца інфармацыйныя тэхналогіі.

Дзевяць ці ўсё ж адзінаццаць?

Па словах рэктара Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі, сёлета каледжы ўкамплектаваліся моладдзю добра. Што датычыцца ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі, то прынята рашэнне падоўжыць у іх прыём. Па многіх спецыяльнасцях у прафесійных ліцэях, напрыклад, на цырульніка і повара, быў конкурс. А вось на спецыяльнасці, звязаныя з металаапрацоўкай і будаўніцтвам, набор ідзе вельмі складана. Але я ўпэўнены, што мы выканаем план. У той жа час лічу, што планку вышэйшай адукацыі трэба павышаць. Той, хто хоча атрымліваць вышэйшую адукацыю, павінен мець адпаведныя веды.

Узровень патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да некаторых кваліфікацый, даўно перасягнуў той узровень, які патрабаваўся раней ад рабочага і спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Адказваючы на пытанне, наколькі выгадна для прафесійна-тэхнічнай адукацыі ўвядзенне больш жорсткага адбору ў старэйшыя класы, Аркадзь Шкляр прызнаўся, што зрабіць гэта будзе праблематычна:

— Я асабіста з'яўляюся прыхільнікам правядзення іспытаў пасля 9-га класа для тых, хто хацеў бы працягваць далей навучанне ў школе. Але мы пакуль гэтага не можам зрабіць, таму што вучэбныя праграмы, якія дзейнічаюць сёння ў школе, складзены так, што пасля заканчэння 9-га класа па матэматыцы, фізіцы і хіміі дзеці яшчэ шмат тэм не вывучалі, і ім патрабуецца навучанне па шэрагу прадметаў у 10-м і 11-м класах. Таму патрэбна абавязкова выканаць задачу, якую ставіць міністр адукацыі — каб пасля 9-га класа адукацыя была завершанай па асноўных прадметах. У гэтым выпадку мы забяспечылі б паступленне дзяцей у сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы, а агульную сярэднюю адукацыю атрымлівалі б тыя, хто хоча яе атрымліваць. Важна зрабіць адукацыю пасля 9-га класа завершанай.

На думку Аркадзя Шкляра, вельмі важнае значэнне мае неперарыўнасць атрымання прафесійнай адукацыі: ПТВ — ССНУ — ВНУ. Каб у маладых людзей была магчымасць паступаць на больш высокую ступень на скарочаны тэрмін навучання.

— Ёсць вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія захавалі гэту традыцыю, праўда, ёсць і такія, што ад яе адмовіліся. Але гэта не павінна быць «капрызам» вышэйшай школы. Чалавек, які атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю, павінен мець магчымасць за два-тры гады атрымаць добрую тэхнічную адукацыю ў ВНУ. На жаль, былі ўпушчаны некаторыя аспекты ў неперарыўнасці адукацыі, але не думаю, што гэта катастрофа.

Даеш рабочую арыстакратыю!

Аркадзь Шкляр паведаміў, што Беларусь плануе стаць удзельнікам WorldSkills International (WSI) — унікальнай некамерцыйнай міжнароднай арганізацыі ведамстваў, устаноў і агенцтваў, адказных за развіццё прафесійнай адукацыі і навучання ў сваіх краінах. Арганізацыя была створана ў 1946 годзе. Місія WorldSkills International заключаецца ў павышэнні статусу і стандартаў прафесійных навыкаў і прафнавучання ва ўсім свеце. Асноўнай дзейнасцю WSI з'яўляецца арганізацыя конкурсаў WorldSkills кожныя два гады ў наступных шасці галінах: транспарт і лагістыка, будаўніцтва і тэхналогія будаўнічай вытворчасці, тэхналогія вытворчасці і тэхналогія машынабудавання, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, выяўленчае мастацтва і мода, сацыяльна-бытавое абслугоўванне.

Кожная краіна можа выстаўляць аднаго канкурсанта ці каманду па кожнай прафесіі. Канкурсанты, якія праходзяць адбор на нацыянальным узроўні, могуць прымаць удзел у прафесійных спаборніцтвах толькі аднойчы. Дзейнічаюць таксама і ўзроставыя абмежаванні — да 22 гадоў. Выключэнне зроблена ў дачыненні да кваліфікацый «кабельная сістэма», «інфармацыйныя сеткі», «мехатроніка», «тэхнічнае абслугоўванне і рамонт самалётаў», дзе ўзрост канкурсантаў не павінен перавышаць 25 гадоў. Канкурсанты з абмежаванымі магчымасцямі таксама могуць удзельнічаць у конкурсе, але ў той меры, наколькі іх абмежаванні не перашкаджаюць выкананню імі тэставых праектаў.

Сёння ўдзельнікамі WSI з'яўляюцца 66 краін, у тым ліку Германія, Швецыя, Кітай, Вялікабрытанія, Канада, ЗША. У 2012 годзе членам арганізацыі стала Расія. Эксперты ўпэўнены: акрамя таго, што WorldSkills актыўна папулярызуе рабочыя прафесіі, гэта самая хуткая і эфектыўная сістэма распаўсюджвання міжнародных прафесійных стандартаў і павышэння планкі нацыянальнай прафтэхадукацыі.

— Мы імкнёмся зрабіць рабочага больш адаптаваным да сучасных тэхналогій, а значыць — больш канкурэнтаздольным, фарміруючы сапраўдную рабочую арыстакратыю. Для ўдзельнікаў такіх конкурсаў гэта цудоўная магчымасць прэзентаваць свае навыкі і майстэрства ў міжнародным фармаце. Відавочна, што падрыхтоўка каманды для ўдзелу ў такіх спаборніцтвах — справа не менш сур'ёзная, чым падрыхтоўка алімпійцаў.

Прафтэхадукацыя для замежнікаў

Па словах Аркадзя Шкляра, прафесійна-тэхнічную адукацыю ў Беларусі атрымліваюць зараз больш як 280 замежных грамадзян з 15 краін свету, а сярэднюю спецыяльную — 768 замежных грамадзян з 27 краін.

— Нядаўна мы падрыхтавалі 30 нігерыйцаў. Яны выбралі Беларусь для атрымання рабочай кваліфікацыі газаэлектразваршчыка і аператара-штампоўшчыка, — расказаў дырэктар РІПА. — Тэндэнцыя росту колькасці іншаземных студэнтаў ёсць, але шмат што яшчэ для іх залучэння можна і трэба зрабіць. Нам неабходна правільна праводзіць маркетынгавыя даследаванні і пастаянна распаўсюджваць інфармацыю аб сваіх магчымасцях у сферы прафесійнага навучання. Але для гэтага патрэбны дылерскія структуры ва ўсіх краінах, дзе ёсць нашы інтарэсы. Гэта прыцягне сур'ёзны капітал у Беларусь.

Надзея НІКАЛАЕВА.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

НАВАПОЛАЦК — МАБІЛЬНЫ

Наваполацк — першы горад у нашай краіне, які далучыўся да ініцыятывы «Еўрапейскі тыдзень мабільнасці».

— Тыдзень пройдзе з 16 па 20 верасня. Мэта ініцыятывы — прыцягнуць максімальную ўвагу да экалагічных відаў транспарту, захавання экалагічнай бяспекі, здароўя людзей, а таксама забяспечыць камфортнае і дружалюбнае суіснаванне аўтамабілістаў, пешаходаў і веласіпедыстаў. Каб кожны мог знайсці прастору ў сваім родным горадзе, — паведамілі ў наваполацкім гарвыканкаме.

Сярод іншых мерапрыемстваў тыдня — веласіпедны флэшмоб «Наваполацк — мабільны!», старт якому будзе дадзены 20 верасня а 16 гадзіне дня на галоўнай плошчы горада — Будаўнікоў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАЙШЛА З ДОМУ І НЕ ВЯРНУЛАСЯ...

Ранкам каля чыгуначных пуцей на перагоне Мінск—Маладзечна (у раёне 2-га завулка Р. Люксембург у сталіцы) было знойдзена цела 43-гадовай мінчанкі.

Згодна з папярэдняй версіяй, смерць жанчыны наступіла ад гвалтоўнага ўдушэння. Высветлена, што напярэдадні позна вечарам забітая пайшла з дому, не паведаміўшы родным куды. А праз некалькі дзён пуцявыя абходчыкі знайшлі цела... Як адзначаюць супрацоўнікі крымінальнага вышуку, устаноўленыя па справе факты сведчаць пра крайнюю жорсткасць здзейсненага злачынства і асаблівы цынізм злачынства. Траўмы на целе забітай сведчаць, што перад смерцю ахвяра падвяргалася сур'ёзным здзекам.

Супрацоўнікі міліцыі склалі суб'ектыўны партрэт верагоднага злачынцы. Цяпер вядуцца яго пошукі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У ВІЦЕБСКІМ РАЁНЕ ЖЫХАР ЗША ЗБІЎ ПЕНСІЯНЕРКУ

Гэтае дарожна-транспартнае здарэнне са смяротным вынікам адбылося а дзясятай гадзіне вечара ў вёсцы Бабінічы.

Паводле інфармацыі ДАІ, 36-гадовы грамадзянін, які жыве ў ЗША, кіруючы аўтамашынай «Хундай», здзейсніў наезд на 61-гадовую пенсіянерку, жыхарку Віцебска. Яна загінула, хоць і рухалася па дарозе з флікерам. Вядзецца расследаванне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ТОНА ГАРЭЛКІ БЕЗ АКЦЫЗАЎ

Супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі і аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі затрымалі ў Калінкавіцкім раёне «Мерседэс-Бэнц-Спрынтар», якім кіраваў жыхар Мазыра. У аўтамабіль была загружана тона алкагольнай прадукцыі. 955 л спіртазмяшчальнай вадкасці і 55 л гарэлкі «Наталі» не былі маркіраваны акцызнымі маркамі Беларусі. У прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама паведамілі, што алкаголь на суму больш Br240 млн канфіскаваны, а на аўтамабіль накладзены арышт. У дачыненні да кіроўцы складзены адміністрацыйныя пратаколы.

Між тым у суседнім Ельскім раёне праваахоўнікі шукалі самаробны алкаголь. Па падказках грамадзян у лесе за паўкіламетра ад вёскі Вішанькі была знойдзена драўляная бочка са 130 літрамі брагі. У жыхара вёскі Дзвіжкі канфіскаваны самагонны апарат і 70 л сыравіны для далейшай перапрацоўкі. Увогуле ж сёлета ў гэтым невялічкім раёне на паўднёвым Палессі Беларусі было канфіскавана больш чым 5,5 тоны брагі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЗАБІЛІ ПРАДАЎЦОЎ, КАБ ЗАБРАЦЬ ВЫРУЧКУ?

Каля харчовай крамы на ўскраіне Ліды са шматлікімі траўмамі знайшлі целы двух прадаўцоў 1968 і 1957 гадоў нараджэння. З крамы скрадзена каля 35 мільёнаў рублёў выручкі і спіртныя напоі.

— Па факце забойства з асаблівай жорсткасцю з карыслівых меркаванняў Упраўленне Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці распачало крымінальную справу, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Беларусі Юлія ГАНЧАРОВА**. — Праводзяцца аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы.

Надзея ПАЎЛАВА.

НАБЫЛА МЕРСЕДЭС ЗА «ШЭРЫЯ» ГРОШЫ?

Перавышэнне выдаткаў над даходамі ў суме больш за 133 млн рублёў выяўлена ў грамадзянкі, якая купіла дарагі аўтамабіль за межамі краіны. Гэты факт здзівіў кантрольныя органы, таму яго вырашылі праверыць...

А справа пачыналася летась, калі жыхарка Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці завезла на мытную тэрыторыю краіны аўтамабіль «Мерседэс-Бенц S 320» коштам звыш 353 млн рублёў, паведамілі рэдакцыі ў прэс-цэнтры Міністэрства па падатках і зборах Беларусі. Прыгледзеліся да жанчыны мясцовыя падатковыя інспектары і вырашылі запатрабаваць у яе дэкларацыю аб даходах і маёмасці за перыяд з 2003-га па 2012 гады.

Пры праверцы дэкларацыі аб даходах і маёмасці грамадзянка не змагла пацвердзіць свае выдаткі на суму 133,4 млн рублёў. Маёмасць была рэальнай, а даходы аказаліся «шэрымі». Пасля выяўлення гэтага факта жанчыне быў прад'яўлены да выплаты падаходны падатак у памеры 16 млн рублёў, які ў поўным аб'ёме і паступіў у бюджэт.

Сяргей КУРКАЧ.

ХТО ХОЧА ЎБАЧЫЦЬ, ТОЙ УБАЧЫЦЬ

ФІЛЬМ «СЛЯДЫ АПОСТАЛАЎ» ПРА СКАРБЫ РАДЗІВІЛАЎ ВЫЙШАЎ У АЙЧЫННЫ КІНАПРАКАТ

Чатырохсерыйны тэлевізійны фільм «Сляды апосталаў» рэжысёра Сяргея Талыбава, зроблены сумесна нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм», ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» і «Першай КінаВідэаКампаніяй», пераўтварылі ў поўнаметражны мастацкі фільм. Цяпер гісторыю пра пошукі сямейных рэліквій роду Радзівілаў — фігур дванаццаці святых апосталаў — на фоне Другой сусветнай вайны можна паглядзець у кінатэатрах па ўсёй рэспубліцы. «Звязда» раней пісала пра тое, што ў гэтым фільме багата экстрэмальных сцэн, і беларускія акцёры робяць у ім тое, чаго ад іх зусім не чакаеш. Альбо каскадзёры робяць гэта за іх. У кіно так: у кожнага свая праца і ніхто нікому не пераходзіць дарогу. «Сляды апосталаў» — гэта дэтэктыў з лёгкім водарам нацыянальнага кіно.

Але здавалася б, навошта для камерцыйна паспяховага серыяла, прэм'ера якога прайшла па расійскім тэлебачанні 11 мая (у Беларусі гэты тэлефільм прэзентавалі12 ліпеня на «Славянскім базары ў Віцебску»), рабіць кінаверсію? Поўнаметражнае кіно, як вядома, прадаць нашмат цяжэй. Тым больш беларускае.

— «Беларусьфільм» прадае карціны на расійскае тэлебачанне. І беларускі глядач не заўжды мае магчымасць паглядзець гэтыя фільмы. Таму цяпер кінастудыя будзе старацца як мага для большай колькасці серыялаў рабіць кінаверсіі. Каб беларускі глядач мог пайсці ў кіно і паглядзець беларускі фільм на вялікім экране. Такія планы ёсць ужо і адносна карцін «Палескія рабінзоны, альбо Цуда-востраў» і «Дзяржаўная мяжа», праца над якімі завяршаецца. Акрамя тэлеверсій, гэтыя стужкі будуць мець кінаверсіі і паказвацца ў кінатэатрах. У кінатэатры доступ адкрыты. Хто хоча ўбачыць, той убачыць, перакананыя на кінастудыі.

Нагадаем, што ў востраскжэтным фільме «Сляды апосталаў» з беларускай гістарычнай і ваеннай тэматыкай задзейнічаны выдатныя беларускія акцёры: Вераніка Пляшкевіч, Павел Харланчук, Ігар Сігоў, Дзмітрый Мухін, Алег Гарбуз, Таццяна Мархель.

Здымкі фільма завяршыліся ў красавіку 2013 года. А на кастрычнік, дарэчы, запланаваны паказ чатырох серый фільма па беларускім тэлебачанні.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

БЕЗ ПРАВА НА «ШАШКІ»

Уначы дабрацца да маскоўскай кватэры майго сябра магчыма толькі на таксі. Сцяпан падбягае да ўзбочыны, выцягвае руку... Імгненна выстраілася чарга з машын. Праз секунду мы ўжо ў цесным салоне блакітных старэнькіх «Жыгулёў». Пад гучнае «Белые розы, белые розы...» імчымся з хуткасцю ветру праз увесь горад. За рулём — таджык сумнеўнага выгляду, які мала таго што размаўляе на ламанай рускай, дык яшчэ і падразае іншыя машыны. У галаве тут жа праносіцца процьма думак. Дзе і як ён атрымаў правы? Што ў яго ў галаве? Калі выходзім на свежае паветра — выдыхаю з палёгкай: «Абышлося». І ў той жа момант зракаюся: больш так рызыкаваць не буду.



У Кітаі легальныя таксісты змагаюцца з «нелегаламі» жалезнымі палкамі.

«Цішэй едзеш — далей будзеш...»

Калі гаворка ідзе пра нелегальных таксістаў, адразу ж згадваю трагічную смерць актрысы Марыны Голуб. Расійскія СМІ пішуць, што яна злавіла таксіста-прыватніка, каб даехаць да дому. Але так і не даехала... Як высветлілася пазней, таксіст, па віне якога адбылася аварыя, быў пазбаўлены правоў...

«Браслаў, Паставы, Лепель...»

Калі за другое паўгоддзе 2011 года ў гаспадарчыя суды Беларусі паступіла 158 спраў па фактах нелегальнага вазіцтва, то ў 2012-м — ужо 451. У першым квартале гэтага года — больш за 200 спраў.

З такімі заклікамі прапаноўваюць свае паслугі кіроўцы нелегальных маршрутных таксі недалёка ад уваходу ў адзін з мінскіх аўтавакзалаў. Асобныя з іх умудраюцца нават перахопліваць пасажыраў проста ля білетных кас. Гэтую карціну назіраю шораз, калі еду дадому. І ёсць людзі, якія спакушаюцца на гэтыя заклікі. Сярод іх маладыя людзі, якія два гады таму спяшаліся з Мінска ў Гродна. Недарэмна кажуць, не спяшайся з козамі на торг! Двое з пяці да месца прызначэння так і не даехалі... «Кіроўца «Фальксвагена» на закругленні дарогі ва ўмовах галалёдзіцы не выбраў бяспечную хуткасць, не справіўся з кіраваннем і выехаў на сустрэчную паласу. Сутыкнуўся з «Волгай»... У выніку ДТЗ двое пасажыраў мікрааўтобуса і пасажыр «Волгі» памерлі на месцы. Яшчэ тры чалавекі з траўмамі шпіталізаваны». На першы погляд, гэта ўсяго толькі адна са шматлікіх зводак УДАІ МУС. З другога боку, гэта ДТЗ — чарговая нагода звярнуць увагу на праблему нелегальнага вазіцтва. Варта адзначыць, што кіроўца «Фальксвагена» напярэдадні прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за перавышэнне хуткасці больш чым на 30 км/г. Чаму нелегальныя таксісты спяшаюцца, зразумела: яны зацікаўлены выключна ў прыбытку. Чым хутчэй будуць на месцы, тым больш рэйсаў зробяць і больш грошай пакладуць у кішэню.

Як можна вызначыць, хто прапаноўвае паслугу — «бамбіла» ці законапаслухмяны таксіст?

На легальным таксі жоўтыя палосы, на пярэдніх дзвярах — назва юрыдычнай асобы або прадпрымальніка, які ажыццяўляе перавозку, нумар ліцэнзіі. На даху — плафон, нумары — жоўтага колеру. У нелегалаў машыны амаль «голыя» — то з адным плафонам на даху, то з абрыўкамі жоўтых палос на кузаве, але без надпісаў. Застрахавацца ад непрыемнасцяў можна з дапамогай выкліку таксі па тэлефоне — у нелегалаў сваёй службы няма.

Легальныя супраць нелегальных

Каб выявіць нядобрасумленных таксістаў, супрацоўнікі падатковай інспекцыі садзяцца ў салон падазроных машын у якасці пасажыраў. Часам, прызнаюцца, і самі легальныя таксісты тэлефануюць у падатковую і «здаюць» сваіх калег-нелегалаў. Але гэта яшчэ нічога. У інтэрнэце бачыла фотаздымкі, як у Кітаі легальныя таксісты б'юць машыны нелегальных жалезнымі палкамі. Некалькі, праўда, больш мірных разборак паміж таксістамі, якія не падзялілі пасажыра, было і ў нас. Адна з найбольш гучных адбылася ля станцыі метро «Каменная Горка», калі таксісты спрабавалі выцягнуць нелегала з яго аўто. Ды я і сама неаднойчы бачыла, як азлобленыя таксісты з ужываннем нецэнзурнай лексікі «прасілі» нелегалаў, якія занялі іх месцы, з'ехаць, «пакуль цэлыя».

— Нелегалы перашкаджаюць працаваць афіцыйна зарэгістраваным перавозчыкам, — кажа суддзя Вышэйшага Гаспадарчага Суда Віктар Курыла. — Вядома, гэта адбіваецца і на паступленні падаткаў у казну. Ёсць і іншы момант — падрываецца культура вядзення бізнесу. З'яўляецца спакуса для іншых сысці ў нелегальную сферу, таму што тады прасцей вырашаць пытанні з утрыманнем аўтамабіля, з тэхнічным і медыцынскім аглядам. Атрымліваецца, што ўзяў машыну — і паехаў. Выдаткі — толькі на бензін, усю астатнюю выручку можна забраць сабе. Бываюць такія выпадкі, калі чалавек працаваў на нейкую фірму, потым пайшоў, але пакінуў на сваім аўтамабілі адметныя знакі. Некаторыя кіроўцы хітраць і здымаюць налепкі з левага борта, пакідаючы на правым, каб было незаўважна з дарогі, але відаць патэнцыйным пасажырам. Часам яны нават карыстаюцца паслугамі легальных дыспетчараў. Мабыць, ёсць неафіцыйныя дамоўленасці паміж асобнымі прадстаўнікамі гэтай сферы. Калі такія абставіны высвятляюцца ў судзе, то мы накладаем больш жорсткія санкцыі. Пагадзіцеся, ёсць розніца: чалавек раз-два выехаў патаксаваць або займаецца гэтым прафесійна, штодня. Натуральна, легальныя фірмы зацікаўлены ў спыненні падобнай нелегальнай дзейнасці і супрацоўнічаюць з падатковымі органамі. Іх ніяк не можа задавальняць несумленная канкурэнцыя. Таму трэба змагацца з нелегальным вазіцтвам для нармальнага развіцця бізнесу таксі. У канчатковым рахунку гэта пазітыўна адаб'ецца на спажыўцах паслуг.

«На ліцэнзію, нават на жоўтую палоску, у мяне грошай няма»

Прымусіць таксістаў адмовіцца ад нелегальных заробкаў можа толькі пагроза страты машыны, лічаць у Вышэйшым Гаспадарчым Судзе. Пакуль у практыцы з 2011 года быў толькі адзін выпадак, калі аўтамабіль канфіскоўвалі за паўторнае парушэнне. Больш актыўна суды сталі прымаць рашэнні аб канфіскацыях аўтамашын, пачынаючы з другога паўгоддзя 2012 года, калі канфіскавалі 7 машын. У першым квартале гэтага года таксама канфіскавана 7 машын.

Вось толькі адзін з апошніх прыкладаў. Прадпрымальны бізнесмен з Бабруйска да канфіскацыі свайго «Фальксвагена Пасата» пападаўся супрацоўнікам падатковай інспекцыі тройчы. Мужчыну папярэджвалі, штрафавалі, але належных высноў ён так і не зрабіў. «Ну а сёлета, атрымліваецца, папаўся чацвёрты раз, — кажа суддзя Гаспадарчага суда Магілёўскай вобласці Уладзімір Трамбачоў. — З 2009-га мужчына нідзе не працаваў. Нягледзячы на тое, што ў яго ёсць сям'я і дзеці. Паколькі ранейшыя выхаваўчыя захады не дапамаглі, суд палічыў, што штраф у памеры 90 базавых велічынь (Br9 млн) не спыніць мужчыну. Ён усё роўна будзе займацца нелегальным таксаваннем. Таму вырашалі канфіскаваць у яго аўтамабіль».

У Беларусі «бамбілы» займаюць другое месца сярод незаконных прадпрымальнікаў. На першым месцы — гандляры.

Што думаюць наконт канфіскацыі аўто самі таксісты? З гэтым пытаннем рушыла на адну з таксастаянак у цэнтры Мінска. І, як варта было чакаць, думкі падзяліліся. Кіроўцы, якія працуюць з ліцэнзіяй, у адзін голас кажуць: «Іншага спосабу змагацца з нелегаламі няма. Яны зрабіліся зусім нахабнымі. Замінаюць нармальна працаваць. Падаткаў не плацяць, не праходзяць тэхагляды, выязджаюць на дарогу без медабследавання, а кліентаў у нас увозяць проста з-пад носа. Вось былі нават такі выпадак. Мужчына папрасіў падвезці яго ў Магілёве, якіх правоў пазбавілі за п'янку, а яны пры гэтым людзей вазілі. Прычым нелегальна працуюць амаль усе, хто не лянуецца. Трэба прымаць супраць іх самыя жорсткія меры».

Таксісты-нелегалы, калі чулі пра газету «Звязда», адмаўляліся размаўляць. Агульную мову ўдалося знайсці толькі з адным з іх. «Ды я не таксую кожны дзень, — з абурэннем кажа пажылы кіроўца старэнькіх «Жыгулёў». — Калі пенсія заканчваецца і няма за што набываць прадукты і лекі (я ж інвалід 2 групы), саджуся за руль і спрабую хоць крыху падзарабіць. На ліцэнзію, нават на жоўтую палоску, у мяне грошай няма». Нагадваю пра магчымую канфіскацыю і чую... «А няхай забіраюць! Мяне ўсё жыццё дзяржава абірае. Калі і апошні сродак падзарабіць адымуць, ну што ж, пайду збіраць бутэлькі. На гэта, наколькі я ведаю, ліцэнзію пакуль браць не трэба».

Замест аплаты адабраў тэлефон

Калі ўзнікае неабходнасць скарыстацца таксі, менш за ўсё мы думаем пра тое, ці плаціць яго кіроўца падаткі. А варта было б. Бо менавіта ад гэтага залежыць не толькі якасць аказання паслугі і яе кошт, але і бяспека. Чым небяспечныя нелегальныя таксісты і пра што варта падумаць перш, чым садзіцца ў таксі, на адным з інтэрнэт-сайтаў распавёў дырэктар адной з самых буйных службаў таксі Мінска Ігар Верхавец: «Ідзе жорсткая канкурэнцыя, нелегалы падрываюць павагу да прафесіі грубіянствам, хамствам, высокімі тарыфамі. Пасажыр не выклікае таксі па тэлефоне і думае, што тым самым эканоміў час. А потым кусае локці. Скардзіцца на нелегалаў няма куды, беспакаранасць дазваляе высадзіць пасажыра на сярэдзіне дарогі і з'ехаць. Неяк раз, прыкрываючыся назвай нашай службы, адзін такі «бамбіла», даведаўшыся, што ў пасажырак-дзяўчат не хапае грошай, адабраў у кошт выплаты сотавы тэлефон. Змагаючыся за гонар нашай службы, таксісты аб'ядналі намаганні і адшукалі яго самастойна».

Людзі, якія садзяцца ў машыну нелегальнага таксіста, часта не ведаюць, што ён працуе неафіцыйна. Бо сёння шмат машын закамуфлявана пад легальнае таксі, з палосамі, з «шашачкамі».

— Наўрад ці хтосьці з пасажыраў будзе патрабаваць у таксіста прад'явіць пасведчанне, ліцэнзію, — кажа намеснік старшыні Гаспадарчага суда Мінска Сяргей Кулакоўскі. — Пасажыр у першую чаргу думае, як хутка і за меншую цану даехаць да месца прызначэння. Але калі ўзнікаюць нейкія пытанні па якасці аказання паслугі, то ў судзе яму будзе праблематычна даказаць парушаныя правы. У легальных таксістаў ёсць спецыяльная страхоўка ў выглядзе адказнасці кіроўцы пры перавозцы пасажыра. І калі, не дай Бог, здарыцца ДТЗ, пацярпелы пасажыр мае права разлічваць на грашовую кампенсацыю.

І смех, і грэх!

У практыцы падатковых інспектараў здараюцца і камічныя сітуацыі. Адна з іх адбылася падчас рэйду па выяўленні нелегальных таксістаў у Гомелі. У інспектараў выклікаў падазрэнне легкавік, абсталяваны пад таксі, але без дзяржаўных нумароў. Каб развеяць сумненні, вырашылі пракаціцца на ім. Па прыбыцці кіроўца папрасіў пасажыраў заплаціць 20 тысяч рублёў. Атрымаў спецыяльна пазначаную купюру і ўжо збіраўся ехаць далей... Ды дзе там: інспектары прад'явілі яму свае пасведчанні. Разлічвалі, што ён адразу «здасца». Толькі памыліліся, бо кіроўца ў адно імгненне праглынуў грошы. Праўда, гэты «фокус» яго не выратаваў ад штрафу, бо доказаў незаконнай дзейнасці было дастаткова.

Не таксуй без ліцэнзіі!

Для таго, каб легальна працаваць на рынку пасажырскіх перавозак, трэба атрымаць ліцэнзію. Яна каштуе 8 базавых велічынь — 800 тысяч рублёў. Сума штомесячнага падатку вар'іруецца ад 550 тысяч рублёў для райцэнтра і 650 тысяч для абласнога цэнтра да 1 мільёна рублёў у Мінску. Таксометр «БелТАКС» абыдзецца прыкладна ў 4 мільёны рублёў.

КАМПЕТЭНТНА

— Што пагражае нелегальнаму таксісту?



— Калі ён пападаецца першы раз, то, як правіла, гаспадарчыя суды накладаюць штраф парадку Br3-4 млн, — распавядае **намеснік старшыні Гаспадарчага суда Мінска Сяргей Кулакоўскі.** — Пры паўтарэнні, вядома, гэтыя сумы падвойваюцца. Максімальная велічыня — 100 базавых, што цяпер складае Br10 млн. На трэці-чацвёрты раз штрафам не абмяжоўваемся, канфіскоўваем машыну. Пры гэтым суддзі ўлічваюць, як часта парушальнік аказваў паслугі па нелегальным вазіцтве, на працягу якога перыяду, ці выплаціў ён штраф, прызначаны раней.

— А калі аўтамабіль запісаны на іншага чалавека?

— Сустракаюцца ў практыцы выпадкі, калі нелегальныя таксісты рэгіструюць аўто на жонак, братоў, бацькоў і гэтак далей. Яшчэ нядаўна закон дазваляў канфіскоўваць аўтамабілі ў таксістаў-нелегалаў незалежна ад таго, у чыёй уласнасці яны знаходзяцца. З 28 жніўня гэтага года ўступіў у сілу Закон «Аб унясенні змяненняў у Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях». З артыкула «Незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць» выключылі словы «незалежна ад таго, у чыёй уласнасці яны знаходзяцца». У той жа час заканадаўца замацаваў магчымасць замест канфіскацыі аўто спагнаць з парушальніка яго кошт.

«БАЦЬКА» ХАТАБЫЧА НАРАДЗІЎСЯ Ў ВІЦЕБСКУ

Сёлета — 110 гадавіна з дня нараджэння Лазара Лагіна, пісьменніка, народжанага ў Віцебску, які ў ліку іншых напісаў славуты твор — казку «Стары Хатабыч». Было гэта роўна 75 гадоў таму.



Лазар Лагін

Ужо даўно ідзе размова пра тое, што ў Віцебску ўвекавечаць памяць Лагіна помнікам яго самаму вядомаму герою. Пра неабходнасць гэтага шмат казалі і на 100-годдзі з дня нараджэння Лагіна, і раней.

Несцерка, Міколка-паравоз і Хатабыч

Адзін са старэйшых паэтаў Беларусі — віцябчанін Давід Рыгоравіч СІМАНОВІЧ, якому сёлета споўніўся 81 год, ужо даўно марыць, каб у Віцебску паставілі помнік не толькі Хатабычу, але і іншым літаратурным героям, якіх прыдумалі літаратары — выхадцы з Віцебшчыны.

— Напрыклад, Міколку-паравоза прыдумаў Лынькоў — наш з вамі зямляк. Было б добра таксама ўстанавіць скульптуры каго-небудзь з герояў Быкава, Караткевіча, Вольскага (Несцеркі. — **Аўт.**), чыё жыццё звязана з Прыдзвінскім краем.

Што датычыцца Лагіна і Хатабыча, на думку Давіда Рыгоравіча, помнік апошняму, несумненна, павінен быць у Віцебску, бо Хатабыч — адзін з самых цікавых і папулярных літаратурных вобразаў, які ведаюць з дзяцінства.

Упершыню пра тое, што Лагін — творчы псеўданім, Давід Сіманавіч даведаўся ад вядомага журналіста і пісьменніка Уладзіміра Мяжэвіча (былі разам у камандзіроўцы ў Гродне).

А ці памятае паэт прыезд Лагіна ў 1974 годзе на 1000-годдзе Віцебска? Аб гэтым наведванні роднага горада Лагіным згадваецца ў многіх артыкулах.

— Ды хто вам сказаў, што ён прыязджаў? Мы з Лагіным на юбілеі горада не сустракаліся. Прынамсі, я тады ў Віцебску яго не бачыў. Можа, Лагін і быў, але я гэтага не ведаю. Магу згадаць прозвішчы ўсіх з кагорты вялікіх землякоў, каго я прапанаваў запрасіць гаркаму КПБ на святкаванне. Сярод іх — Броўка, Караткевіч, Азгур, Фрадкін і іншыя. З імі я меў зносіны, з Лагіным — не, — здзіўляецца майму пытанню паэт.

У некаторых артыкулах пра Лагіна ўпамінаецца, што ён быў на святкаванні 1000-й гадавіны Віцебска, але не афішаваў свой візіт. У прыватнасці, пра гэта пісала яго дачка — журналіст і літаратар.

Лагін — ад Лазар Гінзбург

Напэўна, насамрэч Лазар Іосіфавіч Гінзбург, які прыдумаў сабе псеўданім на аснове першых літар свайго імя і прозвішча, мог дазволіць сабе «раскошу» ў 1974 годзе без лішняй увагі да сябе пахадзіць па роднаму гораду. Тут ён нарадзіўся 21 лістапада 1903 года (па старым стылі) у беднай яўрэйскай сям'і. Ён быў першым з пяцярых дзяцей Іосіфа Файвелевіча і Ханы Лазараўны. Яго бацька займаўся перагонам плытоў па Заходняй Дзвіне.

Па некаторых звестках, ужо ў наступным годзе сям'я пераехала ў Мінск. Але іншыя даследчыкі творчасці пісьменніка канстатуюць, што ў Мінску юны Лазар аказаўся ва ўзросце 5 гадоў. Гэта адбылося, калі ў цяперашняй сталіцы нашай краіны бацька хлопчыка адкрыў скабяную краму.

Вядома, што ў 1919 годзе 15-гадовы Лазар скончыў сярэднюю школу ў Мінску. Потым адправіўся добраахвотнікам на грамадзянскую вайну. Займаўся арганізацыяй камсамола ў Беларусі, быў адным з яго кіраўнікоў. А ў хуткім часе ў газетах пачалі друкаваць яго першыя вершы і заметкі.

Пра тыя вершаваныя «спробы» Лазар Іосіфавіч іранічна напісаў у прадмове да адной са сваіх кніг: «Паслухайце, шчыра кажучы, у мяне ёсць немалая заслуга перад айчыннай літаратурай: я своечасова і навекі перастаў пісаць вершы». Тады ж ён сустрэў у Растове-на-Доне Уладзіміра Маякоўскага і паказаў яму свае вершы. Маякоўскі іх пахваліў, а пазней у Маскве пры сустрэчах цікавіўся: чаму Лазар не нясе яму новых? Цікава, што ў 1923 годзе Лазар вучыўся на аддзяленні вакалу Мінскай кансерваторыі. Аднак пакінуў вучобу з-за адсутнасці цікавасці да музыкі.

У выніку Гінзбург скончыў аддзяленне палітэканоміі Інстытута народнай гаспадаркі імя К. Маркса. Пасля чаго служыў у арміі. У 1930-м працаваў у газеце «За индустриализацию», а яго бацька стаў наборшчыкам газеты «Известия» — адным з лепшых. Потым былі аспірантура і падрыхтоўка да абароны дысертацыі, праца ў газеце «Правда» і часопісе «Крокодил»...

Самы вядомы твор — аповесць-казка «Стары Хатабыч» — была надрукавана ў 1938 годзе ў часопісе «Пионер». Аповесць выйшла асобнай кнігай у 1940 годзе. Біёграфы адзначаюць, што варта адрозніваць першую рэдакцыю аповесці ад другой, якая з'явілася ў 1955-м. Там не толькі былі заменены многія эпізоды і персанажы, але і сама кніга значна вырасла ў аб'ёме. На падставе другой рэдакцыі Лагін напісаў аднайменны кінасцэнарый. Фільм быў зняты ў 1957 годзе.

«Перанос» джына ў Расію

Дом у Віцебску, у якім нарадзіўся літаратар, знаходзіўся на вуліцы, якая ў наш час мае назву Талстога, а да рэвалюцыі была Падзвінскай.

На жаль, той двухпавярховы дом не захаваўся да нашых дзён. На яго месцы працуе летняя кавярня. Але ёсць надзея, што дом адновяць. Такую ініцыятыву падтрымалі Аляксандр Косінец, старшыня Віцебскага аблвыканкама, і Аляксей Мілер, кіраўнік расійскай кампаніі «Газпрам». Чаму б у адноўленым доме не размясціць дзіцячы музей?

Мяркуецца, што менавіта тут юнаму Лазару прачыталі кніжку, якая і натхніла яго на напісанне «Старога Хатабыча» — гэта аповесць «Медный збан» англійскага пісьменніка Энсці. Адзін з яе герояў, джын Факраша-эль-Аамаша, на загад Сулеймана Вялікага быў змешчаны ў медны збан і кінуты ў Чырвонае мора...

Лагін «перанёс» джына ў савецкую Расію. Напэўна, многія сучасныя блогеры, калі б Лагін напісаў казку пра Хатабыча цяпер, маглі б абвінаваціць аўтара ў плагіяце. Але ж нават Шэкспір перарабляў сюжэты твораў, якія былі напісаны да яго. А «Залаты ключык» Талстога — таксама аўтарскі варыянт раней вядомай казкі.

Цікава, што і ў XXI стагоддзі, падчас актыўнага развіцця «высокіх тэхналогій», Хатабыч — вельмі запатрабаваны герой. У Расіі, у прыватнасці, быў зняты поўнаметражны фільм аб інтэрнэце. Гэта фантастычная камедыя... па матывах казкі пра Старога Хатабыча. Сюжэт прыкладна такі: юны хакер Гена купіў праз інтэрнэт на аўкцыёне па фальшывай крэдытнай карты збан. А ў ім быў вядомы ўсім стары. Вызвалены джын зноўку спазнае, як моцна змяніўся свет, у якім нават магутны джын можа далёка не ўсё. Многія кінакрытыкі ацанілі фільм, адзначыўшы, што ён атрымаўся выдатным — сапраўды жывым і вясёлым.

Такі Хатабыч можа ўпрыгожыць Віцебск

У пошуках мецэнатаў

Вядомы віцебскі скульптар Валерый МАГУЧЫ ў свой час распрацаваў чарнавы варыянт помніка галоўнаму герою казкі. Карэспандэнт «Звязды» пабываў у яго майстэрні — у надзеі ўбачыць тое, што зможа ўпрыгожыць горад.

Валерый Магучы — аўтар такіх вядомых скульптур, як «Скрыпка Шагала» (другая назва — «Віцебская мелодыя на французскай скрыпцы»), Салярыінска-га... Усяго больш за 20 твораў Магучага можна ўбачыць у Віцебску. Ён — аўтар статуэтак «Залатая ліра», Гран-пры конкурсаў міжнароднага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску».

— Вельмі даўно мару, каб тут з'явіўся помнік героям казкі пра Старога Хатабыча. Думаў пра гэта яшчэ ў савецкія гады. Вывучаў цэнтр горада, «прыкідваў», дзе лепш усталяваць помнік. І хацелася, каб месца было звязана з Лагіным. Вельмі добра «ўпісаўся» б такі помнік у месца, дзе стаяў дом, у якім Лагін жыў. Можна зрабіць цікавы брэнд Віцебска, — разважае скульптар. — Хочацца, каб кампазіцыя была не манументальным, а камерным аб'ектам, які б выклікаў станоўчыя эмоцыі.

Яшчэ ў 2004 годзе ён атрымаў «дабро» на стварэнне помніка Хатабычу ад тагачаснага кіраўніцтва гарвыканкама. Але ў афіцыйным адказе гаварылася, што для рэалізацыі ідэі ў бронзе патрэбны спонсары. Апошніх няма і цяпер.

Магчыма, у год чарговага юбілею Лагіна ўдасца вызначыцца з фінансавым пытаннем?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

УСЕ СЁННЯ ШУКАЮЦЬ СВАЕ КАРАНІ

У Мінску прайшла Міжнародная канферэнцыя па пытаннях міжкультурнага дыялогу і міжэтнічнага ўзаемадзеяння на прасторы СНД. Удзел у канферэнцыі ўзялі прадстаўнікі з Беларусі, Расіі, Латвіі, Літвы...

Было абмеркавана шмат важных пытанняў для міжкультурнага ўзаемадзеяння, а таксама пытанні захавання нацыянальнай адметнасці ў сучасных умовах. Некаторыя выступоўцы, як, напрыклад, Уладзімір Снапкоўскі, прафесар кафедры міжнародных зносін БДУ, у сваім дакладзе «Сацыяльна-палітычныя праблемы захавання ідэнтычнасці Беларусі» нават звярнуў увагу на такую цікавую акалічнасць, як памылка ў Канстытуцыі. Выказваючы свае думкі наконт самаідэнтыфікацыі беларускага народа, Уладзімір Еўдакімавіч звярнуў увагу:

— Самаідэнтыфікацыя беларусаў сёння знаходзіцца на нізкім узроўні. Напрыклад, ніхто не звярнуў увагу на такі яскравы тэрміналагічны нюанс. У Канстытуцыі напісана не «ад імя беларускага народа», а «ад імя народа Рэспублікі Беларусь».

І яшчэ шмат цікавых, актуальных і не вельмі тэм абмяркоўвалася на гэтай канферэнцыі. Больш падрабязна пра канферэнцыю і шэраг іншых мерапрыемстваў распавядае **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Міхаіл РЫБАКОЎ.** Менавіта гэты цэнтр займаецца арганізацыяй гэтай міжнароднай канферэнцыі.

— У кожнай дзяржавы свае напрацоўкі, і для таго, каб іншыя ведалі пра гэтыя напрацоўкі, імі трэба, як мінімум, падзяліцца. Мы камунікуем не толькі з прадстаўнікамі краін СНД, але блізкага і далёкага замежжа. Ладзіцца ў нас і кансультацыйная рада па пытаннях беларускага замежжа пры Міністэрстве культуры. Рада збіраецца кожны год. Сёлетняя — ужо чацвёртая. На ёй абмяркоўваюць пытанні, датычныя беларускай дыяспары, узаемадзеяння з беларусамі ў розных сферах. У першую чаргу — у культурнай. Многія з удзельнікаў нашай канферэнцыі і кансультацыйнай рады даволі ўплывовыя людзі і ў кіраўніцтве Масквы, і ў рэспубліканскіх радах пры сваіх краінах, яны дастаткова здольныя на нешта ўплываць. Абмяркоўваюцца пытанні, якія тычацца закона «Аб суайчынніках», праграмы беларусаў у свеце, сумесных паездак. У прыватнасці, адзін з вынікаў працы кансультацыйнай рады — фестываль «Беларусы свету», які адкрыўся ў 2011 годзе. І ў 2014-м будзе другі такі фестываль.

Своеасаблівым апагеем працы Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур з'яўляецца фестываль нацыянальных культур. Сёлета ён адзначае сваё дзесяцігоддзе. У Мінску ён адбыўся ў Белдзяржфілармоніі 14 верасня, а далей пройдзе па ўсёй рэспубліцы. 21 верасня Віцебская вобласць прымае эстафету, і гэтак далей. Рэспубліканскае журы праедзе па ўсіх адборачных турах, збярэцца і вызначыць найлепшых, якія возьмуць удзел у фінальных мерапрыемствах у Гродне летам 2014 года.

Сярод мноства адметных людзей, якія сёлета ўзялі ўдзел у міжнароднай канферэнцыі, Міхаіл Рыбакоў адзначыў **ганаровага консула Беларусі ў Цюменскай вобласці; пісьменніка Валерыя Казакова і Уладзіміра Шуглю**, **старшыню суполак беларусаў Цюменскай вобласці (Расія),** якія з'яўляецца старшынёй федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі».

— А вось Алег Давідзюк з Літвы кіруе беларускім культурным цэнтрам «Крок» у Вісагінасе, — працягвае Міхаіл Леанідавіч. — Цяпер ён працуе над тым, каб беларусы, якія раней працавалі на Ігналінскай атамнай электрастанцыі, прыехалі ў Беларусь і працавалі на Астравецкай атамнай электрастанцыі. Там іх больш за 200 чалавек.

Па словах дырэктара Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур, сёлета няма ўдзельнікаў канферэнцыі, якія прыехалі ўпершыню. Звычайна мерапрыемства наведваюць найбольш аўтарытэтныя лідары беларускай дыяспары.

— Усе яны напрацавалі свой вопыт, аўтарытэт, вагу сярод беларускай дыяспары, — тлумачыць Міхаіл Рыбакоў. — Менавіта таму іх і адабралі прадстаўляць інтарэсы беларускай дыяспары. Плюс яны як дэпутаты нясуць адказнасць за свае словы перад усімі астатнімі беларускімі дыяспарамі па ўсім свеце. Дарэчы, па розных звестках, у свеце каля 900 з паловай мільёнаў беларусаў, выхадцаў з Беларусі і іх нашчадкаў. Вось цяпер у Амерыцы пайшла мода шукаць свае беларускія карані. Знаходзяць дзядуляў, бабуль з Беларусі. Многія кажуць, што вось у Галівудзе, у гэтай славутасці, беларускія карані. І на мой погляд, гэта вельмі станоўча. Таму што мы самі па-іншаму пачынаем ставіцца да беларускай нацыі. Калі ведаеш, хто ты і што ты, якая ў тваёй краіны гісторыя, пачынаеш ганарыцца гэтым.

Зоя СВЕТЛАЯ.

■ Знаходка

Ідэнтыфікаваны аўтограф Гётэ

Ён быў пастаўлены на адной з кніг, якая цяпер змяшчаецца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Гэты подпіс лічыцца найбольш каштоўным, хаця калекцыя аўтографаў гэтай установы змяшчае таксама тры подпісы Марка Шагала, аўтографы Рабэра дэ Мантэск'ю і Жана Эфэля, таксама шматлікіх беларускіх культурных дзеячаў: Петруся Броўкі, Максіма Танка, Янкі Брыля, Пімена Панчанкі, Яўстаха Тышкевіча, Лаўрэнція Абецэдарскага і многіх іншых.

Аўтограф Гётэ быў пастаўлены на рамане «Выбіральнае падабенства», які аўтар падарыў пражскаму банкіру-яўрэю Леапольду фон Лемелю. Пісьменнік вёў з фінансістам дзелавое ліставанне і падарыў свой раман з аўтографам у якасці ўдзячнасці за аказаныя паслугі — здзелкі аказаліся для пісьменніка дастаткова выгаднымі.

Наступным уладальнікам кнігі стала каханая, а ў далейшым жонка Лемеля Соф'я. Ад яе кніга трапіла да іх дачкі Аўгусты, якая пераехала жыць у Парыж. Апошнімі прадстаўнікамі сям'і, ва ўладанні якой знаходзілася кніга з аўтографам Гётэ, былі Анры і Маргарыта Жаваль.

Гэтая кніга значыцца ў спісе каштоўнасцяў, вывезеных з Францыі падчас Другой сусветнай вайны. Да пачатку вайны бібліятэка Анры і Маргарыты Жаваль налічвала каля 3 тысяч тамоў. У гэтым спісе прысутнічае больш за 30 назваў найбольш рэдкіх кніг, канфіскаваных немцамі, з якіх 12 выяўлены ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Былы бібліёграф сектара навукова-праектнай работы следчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Вераніка Высоцкая расказвае:

— Кнігі з бібліятэкі сям'і Жаваль паўтарылі лёс многіх іншых прыватных яўрэйскіх бібліятэк Еўропы, якія канфіскоўваліся і вывозіліся ў Еўропу для розных мэтаў. Галоўнай арганізацыяй, што займалася канфіскацыяй культурных каштоўнасцяў на акупаваных Германіяй тэрыторыях, быў Аператыўны штаб рэйхсляйтара Розенберга — ERR. Канфіскацыі падлягалі бібліятэкі не толькі дэпартаваных або збеглых з краіны яўрэяў, але і масонскіх ложаў, эмігранцкіх і сацыялістычных арганізацый і некаторыя асабістыя бібліятэкі. Менавіта ERR атрымала большасць такіх кніг. У 1943 годзе частка накрадзенай літаратуры была эвакуявана ў Сілезію, у горад Рацібуж, дзе быў створаны даследчы цэнтр. Туды ж было перанакіравана шмат кніг з акупаваных савецкіх земляў, у тым ліку з Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Леніна ў Мінску. З наступленнем Чырвонай Арміі ў снежні 1944 года ERR пачаў эвакуацыю літаратуры, аднак паспеў вывезці толькі найбольш важныя матэрыялы. Знойдзеныя ў Польшчы кнігі з бібліятэк Беларусі разам з кнігамі з еўрапейскіх бібліятэк былі накіраваны ў Мінск. Верагодна, кніга з аўтографам Гётэ, як і многія іншыя каштоўныя выданні, што раней належалі Анры і Маргарыце Жаваль, трапілі ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі менавіта такім чынам.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

■ Выстава

АД МІНІ-КНІГ ДА ВЯЛІЗНЫХ ІНКУНАБУЛ

Яшчэ Еўфрасіння Полацкая стварала рукапісы і захоўвала зборы рукапісных кніг. Лічыцца, што яна паклала пачатак бібліятэчнай справе ў Беларусі. З тых часоў месцы захоўвання кніг кардынальна мяняліся — гэта маглі быць і манастыры, і ўніверсітэты, і прыватныя калекцыі важных для беларускай гісторыі асоб. Крыху павандраваць у часе, удыхнуць пыл старадрукаў можна на выставе «Бібліятэка ў часе і прасторы», якая да 15 кастрычніка будзе экспанавацца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Манастырская бібліятэка (гравюра XV ст., размалявана ад рукі).

Загадчык сектара навукова-праектнай работы следчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Таццяна САПЕГА расказала, што ў іх фондзе захоўваецца больш за 80 тысяч адзінак асобнікаў — гэта рукапісы, старадрукі, архіўныя дакументы. Беларусазнаўцам, філолагам, гісторыкам яна б раіла азнаёміцца з прыватнымі бібліятэкамі беларускіх даследчыкаў Янчука і Карскага. Аддзел актыўна займаецца апісаннем і даследаваннем гэтых дзвюх бібліятэк. Яны цалкам захоўваюцца ў фондах, ствараюцца і электронныя копіі дакументаў.

Асаблівую ўвагу звяртае на сябе калекцыя кніжных мініяцюр. «Цуд з цудаў», паказаная на выставе (па стандартах, адносіцца да мікракніг — не болей за 10 на 10 міліметраў) — гэта кніга 6 на 9 міліметраў. Змяшчаюцца ў ёй выказванні Горкага і Пушкіна пра кнігу. Аднак гісторыя мініяцюрнай кнігі, расказвае спадарыня Сапега, бярэ свой пачатак яшчэ раней — у эпоху Адраджэння. На выставе ёсць выданні XVII—XVIII стагоддзяў з друкарні Эльзевіраў. Эльзевіры — гэта галандскія выдаўцы канца XVI—XVIII стагоддзяў, якія перадавалі справу па спадчыне ад бацькоў да сыноў. Яны значна паменшылі памер кнігі і стварылі адмысловы фармат, які так і называецца — «эльзевіры» (знешне ён выглядае больш выцягнутым у параўнанні з іншымі).

Маецца вялікая калекцыя палеатыпаў, інкунабул — адных з першых кніг, якія былі выдадзены Гутэнбергам — ад 2-й паловы XV да 1-й паловы XVI стагоддзя. Сярод іх асаблівы кніжны шэдэўр — гэта «Хроніка Шэдэля» з прыгожымі гравюрамі, якія таксама ўзніклі ў канцы XV стагоддзя. У фондзе Нацыянальнай бібліятэкі зроблены дыск з інкунабуламі і палеатыпамі, рыхтуецца друкаваны каталог. Асобна будзе стварацца каталог Эльзевіраў, асобна — усходніх рукапісаў.

Маюцца рукапісы на старабеларускай мове — як свецкага, так і рэлігійнага зместу. Прадстаўлены кнігі большасці беларускіх друкарняў — Пятра Мсціслаўца, Мамонічаў, Радзівілаў — Куцеінскай друкарні і многіх іншых. Асобнік альбома «Партрэты сям'і Радзівілаў» уяўляе сабой партрэты прадстаўнікоў роду, якія жылі ад 1346-га да 1780 года. Гэты экзэмпляр перавыдадзены ў Санкт-Пецярбургу ў XIX стагоддзі.

Тут жа можна ўбачыць і адно з апошніх паступленняў — «Вялікае мастацтва артылерыі» Казіміра Семяновіча, набытае прыватнымі асобамі для нашай краіны ў верасні 2012 года.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

СІМВАЛЫ АДМЕТНАСЦІ І АДКАЗНАСЦІ

10 фактаў і думак пра гербы і пячаткі

Анатоль Цітоў — гісторык, пісьменнік, геральдыст, сфрагіст. Нарадзіўся ў Дрэздэне, да 15 гадоў жыў у Вільнюсе, пасля разам з бацькамі пераехаў у Мінск, дзе жыве па сённяшні дзень. Пэўны час працаваў у Нацыянальным гістарычным архіве і быў адзіным у краіне старшым палеографам (спецыялістам па чытанні старажытных тэкстаў). На пытанне, ці ёсць горад, з якім ён найбольш звязаны, адказаў: «Я не ведаю. Няхай горад сябе са мной атаясамлівае». Аднак у адной з тузіна сваіх кніг напісаў, што існуе пэўная сувязь паміж жыццём чалавека і жыццём горада...

Анатоль ЦІТОЎ.

1. ГЕРАЛЬДЫКА — ПРЫКМЕТА ЕЎРАПЕЙСКАСЦІ

Геральдыка ўзнікла ў Заходняй Еўропе, яе правілы распаўсюдзіліся па ўсёй Еўропе. Наша краіна — самая ўсходняя тэрыторыя, на якой існавала сапраўдная геральдычная традыцыя. У Маскоўскай дзяржаве, напрыклад, назіраюцца сляды яе заражэння, але 240 гадоў мангола-татарскага ярма павярнула развіццё культуры ў іншы бок. Толькі Пётр I, пасля таго як пабываў у Галандыі, прайшоўся па тэрыторыі Беларусі агнём і мячом, убачыў, што гэта прыгожая традыцыя. Ён запрасіў галандца, каб стварыць геральдмейстарскую кантору ў Пецярбургу, аднак напачатку справа ішла вельмі млява. Немка Кацярына II паставіла ўсё на прафесійны ўзровень, аднак гэта ўжо позняя геральдыка, у гэты час у Еўропе ўжо пачынаў правіць капітал, а саслоўнае грамадства паступова адыходзіла ў гісторыю. Увогуле ж геральдыка — чыста еўрапейская з'ява.

2. СУЧАСНЫЯ ГЕРБЫ — ТОЛЬКІ ПРЫГОЖАЯ ТРАДЫЦЫЯ

Герб быў народжаны эпохай феадалізму, а мы жывем у постындустрыяльным грамадстве. Як толькі пачалі нараджацца буржуазныя адносіны, патрэба ў гербе адпала. Сучасны герб — як прыгожы матылёк, якога злавілі, накалолі на іголку і на сцяну павесілі...

Раней выявы герба і пячаткі супадалі. Старажытныя прывілеі казалі: «Надаём ім герб на пячатку». Гарадская пячатка адыгрывала ролю своеасаблівага знака якасці. У старажытнасці на ўпакоўкі тавараў, якія ішлі на экспарт з места (напрыклад, Мінскага), ставілі пячаткі: калі тавар першага гатунку — адну, а калі вышэйшага — дзве. А калі ж прадукцыя была ніжэйшага гатунку, то яе ўвогуле не пазначалі. Такім чынам горад прымаў на сябе адказнасць і гарантаваў якасць тавару. Сёння гэтая традыцыя памерла. Усюды выкарыстоўваецца дзяржаўны герб. Ён жа змяшчаецца і на гарвыканкамах, хаця, па логіцы, там павінны быць гербы гарадоў. Даўней рада (гарсавет) мела адзін герб, а гарвыканкам — іншы. І рада, па нормах Магдэбургскага права, была больш галоўнай. Гарвыканкам выконваў тое, што яна яму загадвала.

3. ЧЫМ БОЛЬШ СТАРАЖЫТНЫ ГЕРБ, ТЫМ БОЛЬШ ПАВАГІ

Засталася толькі прыгожая традыцыя, аднак галоўнага закону геральдыкі трэба прытрымлівацца: чым больш старажытны герб, тым больш павагі да ўладнікаў. Таму, выбіраючы сучасны сімвал горада, варта арыентавацца на больш старажытны герб — у большасці краін свету так робіцца. Напрыклад, сучасны герб Гомеля з выявай рысі можна лічыць не зусім дакладным. Бо самым старажытным гербам гэтага горада, атрыманым у 1560 годзе, з'яўляецца срэбны крыж у чырвоным полі, што абазначае абарону ад нячыстай сілы. Калі Беларусь у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай трапіла ў склад Расійскай імперыі, царскі ўрад імкнуўся выкрасліць нашы геральдычныя традыцыі, бо самакіраванне ў царскай Расіі не было. Таму і Гомель замест абарончай сімволікі займеў выяву звера на гербе, які выкарыстоўваецца і цяпер.

Першы герб Гомеля, атрыманы ў 1560 годзе, — срэбны крыж у чырвоным полі — мае абарончую сімволіку. Другі, нададзены Расійскай імперыяй у 1855 годзе, — рысь, якая знаходзіцца пад двухгаловым арлом, над імі — гарадская карона. Трэці — сучасны герб Гомеля, зацверджаны ў 1997 годзе.

4. ЧЫРВОНЫ ВОСК — АСАБЛІВЫ ПРЫВІЛЕЙ

Каралеўская ўлада магла памяняць пэўны абстрагаваны герб на новы, аднак гэта было звязана з важнымі гістарычнымі падзеямі. Напрыклад, у Магілёве спачатку быў герб «Вежа пад вастракутным дахам», нададзены каралём Стэфанам Баторыем у 1577 годзе. Аднак у 1661 годзе каралём польскім і вялікім князем літоўскім Янам Казімірам быў нададзены новы герб: «У блакітным полі тры вежы, у адчыненай сярэдняй браме — рыцар у панцыры з уздзетай шабляй у руцэ; на вежы круглая шыльда з выявай дзяржаўнага герба». Гэта адбылося пасля паўстання супраць царскіх войскаў у 1661 годзе. Дарэчы, гэтыя падзеі апісаны ў апавяданні Уладзіміра Караткевіча «Нельга забыць». Спачатку магілёўцы адкрылі вароты царскім войскам, але тыя пачалі рабаваць іх. Гараджане дамовіліся і паднялі паўстанне. Бурмістр Магілёва Леановіч выскачыў з крыкам «Пара!» на ганак ратушы — гэта быў сігнал для паўстання. Яны знішчылі ўсіх царскіх стральцоў, толькі адзін застаўся ў жывых, які быў у гасцях у адной магілёўскай удавіцы (пасля і грамадзянства Рэчы Паспалітай прыняў). За гэта горад займеў новы герб і быў прыраўнаваны да сталічнага, як Вільня. Акрамя таго, горад атрымаў права пячатаць свае дакументы чырвоным воскам. Гэта, як правіла, маглі рабіць каралеўская і велікакняжацкая канцылярыі, буйныя князі, магнаты, напрыклад Радзівілы. Звычайна ў гарадскіх канцылярыях ва ўжытку быў воск зялёнага колеру, натуральнага, — а чырвоны воск абазначаў асаблівы прывілей.

5. МАГДЭБУРГСКІЯ ПРАВЫ — СВЕДЧАННЕ СТАТУСА

Гербы надаваліся не населеным пунктам, а жыхарам горада (мяшчанам), усёй іх грамадзе, і гэта часта залежала не ад іх колькасці, а ад самаадданасці і самаахвярнасці на карысць дзяржаве. Паказальным з'яўляецца прыклад Пераброддзя. У ім стаяла ўсяго тры рыбацкія хаткі. Аднак жыхары атрымалі Магдэбургскае права ад караля Стэфана Баторыя за тое, што падчас Лівонскай вайны паказалі каралеўскім войскам брод праз азёры, калі яны ішлі вызваляць Полацк.

6. ПЯЧАТКІ ВЫРАБЛЯЛІ ТОЛЬКІ «ЗЛОТНІКІ»

Адзіная група рамеснікаў, якая вырабляла пячаткі, называлася «злотнікамі». Яны бралі за гэта даволі вялікую суму грошай. Калі ж асоба, што хацела займець пячатку, была небагатая, яна звярталася да «партачоў» — няцэхавых рамеснікаў, якія не прайшлі поўны курс адукацыі, не здалі іспыты і працавалі падпольна.

У статутах злотніцкіх цэхаў было сказана, што кожны падмайстар, каб атрымаць званне майстра, павінен зрабіць «шэдэўр», або «штуку». У яе, сярод трох прадметаў, уваходзіла пячатка, якую трэба было выразаць з гелмам, шчытом і літарамі вакол. Гэту працу падавалі калегіі майстроў. Калі яны рабілі пэўныя заўвагі, падыспытны меў час іх выправіць. А пасля будучы майстар набываў бочку піва і рабіў «каляцыю» — частаванне ўсіх сяброў цэха. Акрамя таго, кожны таварыш (падмайстар), каб быць дапушчаным да іспытаў, мусіў здзейсніць гадавую вандроўку ў замежныя краіны. Там папрацаваць і прывезці дакументы, што пацвярджалі гэта, і водгукі. Калі ён вяртаўся, то працаваў яшчэ год, і толькі пасля гэтага атрымліваў дазвол здаваць іспыты на званне «майстра».

7. У РАМЕСНІКАЎ СВАЕ ГЕРБЫ

Герб — гэта знак, які дазваляе адрозніць аднаго чалавека ад другога, адну ўстанову ад іншай. Раней людзі былі недастаткова пісьменнымі, таму патрэбен быў візуальны вобраз, каб чалавек запомніў і заўсёды мог пазнаць. Гэту функцыю і выконваў герб.

На гербах рамесных цэхаў маглі быць выяўлены прылады працы, вырабы, пэўныя святыні, якія былі заступнікамі таго або іншага рамяства. Маглі быць і абстрагаваныя выявы — грыфы, але гэта радзей. Напрыклад пячатка мінскага збройніцкага цэха была надзвычай прыгожай: гадзіннік (згарэк), скрыжаваныя шабля і пісталет, а ўнізе падкова і ключ. Бо цэх гэты быў аб'яднаны — згарніцкі, слясарскі, кавальскі і збройніцкі.

8. ГЕРБ — БЫЎ ПАД «ДВУХГАЛОВЫМ АРЛОМ»

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай некаторым гарадам усходняй Беларусі давалі новыя гербы. На верхняй іх частцы была выява двухгаловага арла, на ніжняй — герб Вялікага Княства Літоўскага. Гэта рабілася для таго, каб прынізіць жыхароў, маўляў: «Вось у вас дзяржаўны герб, а вы пад арлом ходзіце». Таму памылкова думаць, што царскі ўрад пасля таго, як прыйшоў да ўлады, надаваў гарадам герб ВКЛ. Дакументы сведчаць, што пецярбургскія геральдмейстары рабілі ўсё, каб падкрэсліць імперскія памкненні ўрада.

9. КАЛАБАРАЦЫЯНІСТЫ СІМВАЛАЎ НЕ МЕЛІ

Падчас Вялікай Айчыннай вайны калабарацыяністы спрабавалі зацвердзіць у немцаў нацыянальныя сімвалы: гістарычныя герб, сцяг і кветку васілёк. Перапіска Берліна і Мінска па гэтай тэме працягвалася некалькі гадоў. На першы ліст, адпраўлены ў 1941 годзе, немцы адказалі: «У сувязі з тым, што будучыня Беларусі яшчэ не вызначана, заўчасна гаварыць пра нацыянальныя сімвалы». Апошні ліст з Германіі прыйшоў у чэрвені 1944 года, у ім напісана: «У сувязі з абставінамі на франтах лічым далейшую перапіску немэтазгоднай». Гэтыя дакументы называюцца «Берлінскі сшытак» і захоўваюцца ў Берліне. У 1991-1992 гадах іх копіі перавезлі ў Мінск па просьбе Галоўнага архіўнага ўпраўлення, была сфарміравана справа. Такім чынам, беларускія калабарацыяністы спрабавалі зацвердзіць у немцаў пэўныя сімвалы, аднак дазволу не атрымалі і карысталіся імі стыхійна.

10. ПЯЧАТКА — СРОДАК ЛЕГАЛІЗАЦЫІ

Маюцца дакументы, што на тэрыторыі Беларусі напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі бальшавікі распаўсюджвалі ўлёткі, аднак сяляне не верылі тым паперам, бо на іх не стаяла пячатка. Калі спецыяльнага водціску няма — гэта не дакумент, гэта шпаргалка. Менавіта пячатка — сродак легалізацыі.

Увогуле інстытуту пячаткі 8000 гадоў. Беларуская найбольш старажытная — з часоў Ізяслава Уладзіміравіча, які памёр у 1001 годзе, таму мы можам казаць, што маем 1000-гадовую гісторыю сфрагістыкі (навукі, якая займаецца вывучэннем пячатак).

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Імёны мінуўшчыны

ПОМНІКІ ТВАЁЙ КРАІНЫ

Навошта гарадам патрэбны помнікі выдатных асоб

Час ідзе. А помнікаў выдатным дзеячам Беларусі на вуліцах Мінска больш не становіцца...
У гасцей, турыстаў, бізнесменаў складваецца, магчыма, памылковае ўражанне, што Беларусь не толькі не мае адметных асоб, але і ўвогуле не мае сваёй уласнай гісторыі. Гэта, між іншым, адбіваецца і на іх стаўленні да беларусаў у свеце. Як бы вы паставіліся да чалавека, які не шануе памяці сваіх продкаў, не цікавіцца гісторыяй і культурай сваёй краіны, не можа з захапленнем распавесці пра нейкіх знакавых асоб сваёй краіны? Калі вы маеце нейкія духоўныя патрэбы, вышэйшыя, чым стандартны набор турыста — бар, праменад, гатэль — то такі суразмоўца не выкліча ў вас асаблівага захаплення.

Некалі Зміцер Санько, галоўны рэдактар кніжнай серыі «Нашы славутыя землякі», у артыкуле «На прэстыжных месцах» («Культура», № 29 / 897 за 2009-07-18) пісаў: *«Зразумела, што ў перспектыве ў Мінску мусяць паўстаць таксама помнікі каралю Міндоўгу, вялікім князям Вітаўту і Жыгімонту Старому, найвышэйшым гетманам Канстанціну Астрожскаму і Яну Каралю Хадкевічу, канцлерам Астафею Валовічу і Льву Сапегу, дзяржаўным дзеячам Тадэвушу Рэйтану і...»*. Тут варта спыніцца.

ТАДЭВУШ РЭЙТАН

Можна заўважыць, што апошнім часам імя нацыянальнага героя Беларусі, дэпутата Сейма Рэчы Паспалітай ад Навагрудскага ваяводства ВКЛ Тадэвуша Рэйтана, які імкнуўся сарваць Сейм і не дапусціць першага падзелу дзяржавы, паступова ўсё больш і больш прамалёўваецца на белым муры. Але да кардынальных зрухаў справа яшчэ не дайшла. Бо фактычна мы яшчэ толькі вырваліся з пялюшак бяспамяцтва...

І таму, зачапіўшыся за словы спадара Санько, як за поручні, мы можам ушанаваць годнага чалавека, шчырага патрыёта нашай зямлі Тадэвуша Рэйтана, як таго патрабуе гістарычная справядлівасць. І не толькі ў сталіцы краіны, але і ў Навагрудку, Ляхавічах і, можа, у самой Грушаўцы, дзе знаходзіцца родавае котлішча Рэйтанаў і якая ўжо шмат гадоў патрабуе неадкладнага клопату.

СТАЯЎ ПОМНІК...

Як вядома, помнік Тадэвушу Рэйтану ў Грушаўцы ўжо стаяў, 150 гадоў таму. Праўда, нядоўга...

У 1824 годзе ў Грушаўцы нарадзіўся хлопчык, які пры хрышчэнні атрымаў імя Стэфан Міхал Ян. Бацькам яго быў Дамінік Рэйтан (пляменнік Тадэвуша), падпалкоўнік напалеонаўскіх войскаў. Пакуль што пра лёс Стэфана вядома не шмат. Але гэта пытанне часу. Нас цяпер цікавіць перш за ўсё тое, што недзе напрыканцы 1850-х гг. Стэфан (мажліва, у год, калі нарадзіўся ягоны сын Юзаф Пётр Павал (1857), апошні з роду) замовіў скульптару Тэадору Закрэўскаму бюст Тадэвуша Рэйтана. Іншым — велічную каплічку-вежку.

Аўтэнтычны помнік Тадэвушу Рэйтану. Той, што цяпер можна ўбачыць на кракаўскіх «Платанах» (копія).

Амаль усе, хто згадваў помнік у сваіх артыкулах, пісалі, што ён некаторы час, магчыма, з 1860 г., стаяў у Грушаўцы, непадалёк ад старога сядзібнага будынка. Але напярэдадні паўстання Кастуся Каліноўскага ў 1863 г. быў дэмантаваны, запакаваны ў скрыню і схаваны да лепшых часоў.

Стэфан у 1863 г. памёр. Было яму на той момант усяго 39-40 гадоў. Імя яго не згадваецца сярод тых, хто браў удзел у паўстанні, і нібыта не было з боку ўлады да Рэйтанаў прэтэнзій. Дык што здарылася? Быў ён паранены падчас нейкага невядомага бою поруч з Каліноўскім ці... памёр сваёй смерцю? Загадка. Але тое, што быў ён, як і ўсе Рэйтаны, патрыётам, не падлягае сумневу, інакш не наважыўся б замаўляць і ўсталёўваць у гонар свайго дзеда помнік. Таму, мажліва, калі памёр гаспадар, а на гаспадарцы застаўся ягоны сын, якому на той момант было 6-7 гадоў, помнік схавалі, каб не выклікаць залішняй увагі.

Але дзе ў той момант знаходзілася замоўленая Стэфанам прыгожая літая гатычная вежка вышынёй 10 метраў? Пра тое, што яна дайшла да Грушаўкі, што ў Грушаўцы стаяў помнік у поўным камплекце (як цяпер у Кракаве на Платанах), аўтары не згадваюць.

Нам ізноў пашанцавала. Не так даўно быў адшуканы артыкул з газеты 1864 г., у якім аўтар з захапленнем апісвае менавіта тую каласальных памераў вежку, якую любы ахвотны можа паспець паглядзець на фабрыцы PP. Evans, Lilpop і Rau (Варшава) перад адпраўкай яе ў Грушаўку. Аўтарам плана названы вядомы архітэктар Марконі. Яго ажыццявіў малады, але вядомы ў мастацкім асяродку будаўнік Хайнрых.

Гэтыя звесткі выклікаюць новыя пытанні. Ці была выслана вежка ў Грушаўку? Калі адказ станоўчы, ці злучылі ўсё ж такі на радзіме Тадэвуша бюст і вежку, як было прадугледжана праектам? Ці яе так і не адаслалі, а прыхавалі ў Варшаве? Думаю, калі распачаліся рэпрэсіі супраць паўстанцаў, калі жандары Мураўёва спрэс заставілі краіну шыбеніцамі, было зусім не да вежак ды помнікаў... Нават праблескі патрыятызму людзі тушылі, каб хоць іх дзеці выжылі. Таму, верагодней за ўсё, вежка засталася ў Польшчы. Бюст схавалі на Літве (у Грушаўцы). Падзел адбыўся...

Праз 25 гадоў, калі апошні нашчадак мальтыйскага рыцара Яна, апошні носьбіт прозвішча Рэйтан пасталеў, калі ўлягліся жарсці, ён адшукаў добра схаваны бюст і вырашыў перадаць яго туды, дзе волі было трохі болей, дзе да таго захоўвалася велічная каплічка, якая важыла каля 6 тон. Таму Юзаф перадае бюст Тадэвуша недзе ў 1888 годзе Кракаўскаму магістрату. У 1889 г. помнік быў сабраны цалкам і ўсталяваны на скрыжаванні вуліц Баштовай, Дунаеўскага і Гарбарскай. Дакладнай датай афіцыйнага адкрыцця лічыцца чэрвень 1890 г. Устаноўка помніка не выклікала вялікага пярэпалаху, але пачуліся галасы крытыкаў, якім не спадабаўся занадта строгі выгляд вежкі, больш падобны да магільных каплічак.

Помнік выстаяў і Першую сусветную вайну, і Другую. Немцаў ён не зацікавіў. Але калі ўзімку 1946 г. моцны парыў ветру і магутная снегавая навала пашкодзілі яго, камуністычныя ўлады скарысталіся зручным момантам і прынялі помнік у сховішча.

ПАЛЯК? НЕ, ЛІЦВІН-БЕЛАРУС!

У 2007 г., на 750-ю гадавіну горада, Кракаў зноў убачыў помнік Тадэвушу Рэйтану. Праўда, гэта ўжо была копія, прычым наўмысна зробленая недакладнай. Недакладнасць тычыцца некаторых дэталяў бюста. Вежку аднавілі па ўзоры надмагілля Станіслава Ліліпопа. Арыгінал бюста пасля рэстаўрацыі працягвае знаходзіцца ў Кракаўскім Нацыянальным музеі. Верагодна, там жа можна адшукаць і ўнікальную дакументацыю, старыя фотаздымкі, звязаныя з гісторыяй стварэння помніка.

На жаль, быўшы ў Кракаве, мне не пашанцавала паглядзець на гэты велічны помнік нашаму суайчынніку, беларусу Рэйтану, які стаў культавай асобай у Польшчы, імя якога ведае кожны школьнік... Праўда, гэты школьнік ніколі, напэўна, не чуў з вуснаў настаўнікаў, што Рэйтан — ліцвін-беларус... Там ён — паляк.

РАЗБУРЭННЕ МІФАЎ

Але вернемся да помніка. Ёсць на ім надпіс, які распавядае, калі ён быў усталяваны і каму прысвечаны. Усё добра, нават выдатна, за выключэннем аднаго. На помніку пазначаны год нараджэння — 1746. Гэта яшчэ не самы «страшны» варыянт, бо Генрык Грабоўскі (далёкі сваяк Рэйтанаў) паставіў у родавай капліцы мармуровую пліту ў гонар Тадэвуша з зусім фантастычнай лічбай — 1752 г. Цяжка сабе ўявіць, як у такой важнай справе, шмат разоў апісанай у розных даведніках, была дапушчана такая грубая памылка, якую паўтарылі і тыя, хто паставіў у 1993 г. каля грушаўскай капліцы памятны валун (1746), дадаўшы ад сябе, што Рэйтан бараніў «Рэч Паспаліту Польшчу»...

Агульнапрызнанай датай нараджэння Тадэвуша лічыцца 20 жніўня 1742 г. Месца нараджэння — Грушаўка. Прыйшоў час абвергнуць і гэты міф. Тадэвуш Рэйтан нарадзіўся задоўга да 20 жніўня, бо першы раз яго імя сустракаецца ў дакументах 20 ліпеня 1742 г. у сувязі з давяршэннем працэдуры хрышчэння. Часам паміж нараджэннем, першым хрышчэннем з адной вады і давяршэннем праходзіла некалькі месяцаў ці нават год. На падставе іншага дакумента можна зрабіць выснову, што нарадзіўся Тадэвуш у 1741 г. І, верагодней за ўсё, у Мінску, адкуль была яго маці, Тэрэза Валадковіч.

МАГЧЫМАСЦЬ УШАНАВАННЯ

Мы маем нацыянальнага героя, вартага ўшанавання. Ведаем, што ён кроўна звязаны не толькі з Беларуссю, але і з Мінскам. Мы ведаем, што захаваўся помнік, які быў замоўлены на грошы грушаўскіх Рэйтанаў, які некалькі гадоў упрыгожваў сядзібны парк. Магчыма, варта было б распачаць перамовы з польскім бокам, каб на некаторы час узяць яго на дэпазіт, правезці па гарадах Беларусі і дамовіцца, каб нашы скульптары зрабілі з яго копію. Якую, у сваю чаргу, можна было б усталяваць недзе ў цэнтры Мінска, дзе і належыць быць ушанаваным герою такога рангу!

Зміцер ЮРКЕВІЧ,
арт-суполка
імя Тадэвуша Рэйтана

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк»
сообщает об изменении условий овердрафтного кредитования по текущим (расчетным) банковским счетам, доступ к которым может быть обеспечен при использовании дебетовой банковской платежной карточки (далее – счет)*

Вид овердрафтного кредитования	Годовая процентная ставка овердрафта, % годовых
Овердрафтное кредитование физических лиц:	
по счетам клиента в белорусских рублях с ежемесячным сроком погашения	Ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 20,5%
по счетам клиента в белорусских рублях со сроком погашения 3 месяца	Ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 21%
по счетам клиента в белорусских рублях со сроком погашения 6 месяцев	Ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 21,5%
по счетам клиента, открытым в рамках пакета услуг «Платинум» в белорусских рублях со сроком погашения 6 месяцев	Ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 21,5%
по счетам клиента, открытым в рамках пакета услуг «Премиум», в белорусских рублях со сроком погашения 10 месяцев	Ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 21,5%
Овердрафтное кредитование юридических лиц и индивидуальных предпринимателей:	
по счетам клиента в белорусских рублях с ежемесячным сроком погашения	Ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 20,5%

* Изменения вступают в силу с 16.09.2013 и применяются ко всем вновь заключаемым договорам текущего (расчетного) банковского счета с использованием банковской платежной карточки, а также при внесении в действующие договоры изменений, связанных с установлением, изменением размера лимита овердрафта (кроме прекращения предоставления овердрафтного кредита по инициативе клиента) или условий овердрафтного кредитования в части изменения срока погашения овердрафта.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

БЕЛАРУСБАНК

Публичная оферта (предложение) о начислении поощрительного процентного дохода по срочным банковским вкладам в белорусских рублях

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 16 сентября 2013 года начисление поощрительного процентного дохода по следующим срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:
- **«Сберегательный»** – в размере **18%** годовых;
- **«Ваш выбор»** (вне зависимости от ежедневного остатка вклада) – в размере **17%** годовых;
- **«Премиально-накопительный «Детский»** – в размере **16,5%** годовых;
- **«Классик плюс»** – в размере **14,7%** годовых,
- **Накопительный** – в размере **13**% годовых.

Начисление поощрительного процентного дохода производится на ежедневные фактические остатки указанных видов вкладов за период с 16.09.2013 или дня открытия вклада (депозита) после указанной даты по 26.09.2013 (включительно).

Присоединение к остатку вклада поощрительного процентного дохода производится 27.09.2013.

При этом поощрительный процентный доход не выплачивается:
- в случае если в период с 30.08.2013 по 26.09.2013 (включительно) совершается возврат вкладчику суммы вклада (в том числе вкладов, срок возврата которых наступил в указанный период 2013 г.) или расходная операция, влекущая перерасчет причитающегося по вкладу дохода, или первая расходная операция на основании свидетельства о праве на наследство;
- в случае если на 30.08.2013 по вкладу начисляется пониженная процентная ставка или доход по вкладу начисляется в размере ставки вклада до востребования (в том числе по вкладам «Сберегательный» и «Классик плюс», срок возврата которых наступил до 30.08.2013).

Начисление дохода на сумму поощрительного процентного дохода производится с 27.09.2013.

2. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1, является получение вкладчиком поощрительного процентного дохода.

ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 16 сентября 2013 года процентную ставку основного дохода по вновь принимаемым срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях **«Интернет-депозит»** в размере **43,2%** годовых *(по ранее принятым вкладам, по которым не нарушена срочность, установленный размер основного дохода применяется с 16.09.2013)*.

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях Беларусбанка

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам размещена на сайте www.belarusbank.by
Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПОВЫШЕНИЕ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ

Предмет аукциона № 1, в состав которого входят:

№ п/п	Наименование имущества	Инвентарный №
1.	Здание склада № 3	420/D-2608
2.	Здание АБК	420/C-2746
3.	Здание автовесовой	420/C-2744
4.	Здание КПП	420/C-2745
5.	Здание склада № 2	420/D-2607
6.	Открытая эстакада	420/C-38230
7.	Контора на эстакаде	420/C-2806
8.	Подъездная ж/дорога	420/C-38232
9.	Весы автомобильные	32
10.	Котел отопительный	70
11.	Кран мостовой электрический г/п 16т	3
12.	Кран мостовой электрический г/п 20т	4
13.	Кран мостовой электрический г/п 20т	392
14.	Кран-балка г/п 3,2 т.	9
15.	Кран-балка г/п 3,2 т.	6
16.	Кран-балка г/п 5,0 т.	7
17.	Электротельфер г/п 3,2 т.	49
18.	Комплект трансформаторной подстанции	70136
19.	Внеплощадочная линия электропередач 10 кВ	420/C-43423
20.	Внутриплощадочная канализация ливневая	420/C-43835
21.	Внутриплощадочная канализация хозфекальная	420/C-43424
22.	Внутриплощадочные телефонные сети	420/C-43429
23.	Внутриплощадочный водопровод	420/C-43426
24.	Внутриплощадочная линия электропередачи 0,4 кВ	420/C-43775
25.	Благоустройство и озеленение	420/C-43773
26.	Внеплощадочная канализация	420/C-43425

Место нахождения предмета аукциона – Гродненская область, Лидский район, Третьяковский с/с, в р-не дер. Долина (территория СЭЗ «Гродноинвест», 0,7 км от Лидской окружной городской дороги). Земельный участок с кадастровым номером 423685400024000001, назначение – обслуживание производственной территории.

Начальная цена **предмета аукциона** – 7 806 568 000 бел. рублей.

Сумма задатка – 78 065 680 бел. рублей.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от начальной стоимости реализуемого с торгов предмета аукциона.

Продавец имущества – **УП «Гродноопттрогэстейт» (230001, г. Гродно, ст. Лососно, тел. (0152) 55-40-63, (0152) 55-39-12).**

Организатор аукциона – **УП «Гродноопттрогэстейт» (230001, г. Гродно, ст. Лососно, тел. (0152) 55-40-63, (0152) 55-39-12).**

Собственник имущества – **ОАО «Гродноопттрог» (230001, г. Гродно, ст. Лососно, тел. (0152) 55-40-63, (0152) 55-39-12).**

Задаток вносится в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, по каждому из предметов аукциона, на которые регистрируется заявитель, на р/с 3012157752012 в Региональной дирекции № 400 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Гродно, код 369, получатель УП «Гродноопттрогэстейт», УНП 591008011.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, заключившие соглашение с организатором аукциона о правах и обязанностях сторон при проведении аукциона, внесшие задаток и предоставившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с предметом аукциона, копию свидетельства о госрегистрации (для юр.лиц и ИП), копию Устава (для юр.лиц): легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования (для иностранных юр.лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС. Победитель аукциона (покупатель) и продавец подписывают договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества без учета НДС осуществляется победителем аукциона (покупателем) в порядке, предусмотренном договором купли-продажи. В случае признания аукциона несостоявшимся в связи с тем, что на участие в аукционе подано заявление от единственного участника, предмет торгов продается единственному участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона (покупатель) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение трех рабочих дней со дня его проведения в соответствии с порядком проведения аукциона.

Организатор аукциона имеет право не позднее, чем за 5 дней до его начала снять с аукциона предмет торгов и отказаться от его проведения.

Аукцион проводится 07 октября 2013 года в 13.30 по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, 104-501. Заявления и документы, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются до 04 октября 2013 года включительно в рабочие дни с 11.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, 104-501. Срок окончания подачи заявлений – 04.10.2013 г.

Телефоны для консультаций и справок: (0152) 55-39-12, (0152) 55-40-63, (029) 339-21-03.

Свидетельство о гос. регистрации и печать ООО «Анрон» **считать недействительной в связи с утерей.**

ЧУП «Такси Алмаз 7788»

информирует о том, что в сентябре–октябре 2013 г. будут проводиться работы по благоустройству территории, прилегающей к жилому дому № 6 по ул. Короля в г. Минске, с устройством парковки вместимостью 12 машино-мест.
Работы по благоустройству включают в себя частичный снос и пересадку зеленых насаждений, замену бордюрного камня и асфальтирования.

УНП 191633900

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

26 сентября 2013 года проводит 5-ый от 28.03.2013, 10-ый от 16.05.2013 и 17-ый от 12.09.2013 повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности на 19-ом открытом аукционе

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи	Сумма задатка (бел. руб.)
80	Седельный тягач КрАЗ-255В ш. 262094 дв. 0192 1976 г. 4 кат. 25505 км	г. Полоцк, в/ч 55719	30 000 000	3 000 000
214	Грузовой КамАЗ-43105 ш. 0018133 дв. 0329116 1988 г. 4 кат. 76668 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
369	Шнекороторный снегоочиститель ДЭ-210А № 870249 на ЗиЛ-131Н ш. 725949 двиг. с/о У1Д6 № 8603 и 274 1987 г. 3 кат. 5 388 км 789 м/ч	г. Берёза, в/ч 23324	60 000 000	6 000 000
370	Мастерская ПМ-2-70 № К351016 1989 г. 2 кат. в составе: – МРМ-М1 № 033 на ЗИЛ-131 1988 г. ш. 755529 дв. 933087 – МРС-АР № А531 на ЗИЛ-131 1988 г. ш. 806201 дв. 172085 – ТА-5М № К351016 на ЗИЛ-131 1989 г. ш. 0927068 дв. 762386 с ЭСБ-4-В3-1-М1 № АК-23608004 – АДБ-3120У1 № 798 на пр.1-П-2,5 1982 г. ш. 1609	г. Минск, в/ч 63755	120 000 000	12 000 000
371	Мастерская ПМ-2-70 № Р35135 1985 г. 2 кат. в составе: – МРМ-М1 № 093 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 585952 дв. 133722 – МРС-АР № 57 на ЗИЛ-131 1985 г. ш. 636891 дв. 379892 – ТА-5 № Р35135 на ЗИЛ-131 1984 г. ш. 582993 дв. 122038 – ЭСБ-4-В3-1-М1 №ТИ23628360 на пр.1-П-1,5 1983 г. ш. 201449 – АДБ-3120У1 № 14023 на пр.1-П-2,5 1983 г. ш. 0361Т	г. Минск, в/ч 63755	105 000 000	10 500 000
372	Мастерская ПМ-2-70 №Т35143 1986 г. 2 кат. в составе: – МРМ-М1 № 039 на ЗИЛ-131 1986 г. ш. 671695 дв. 545578 – МРС-АР № 0068 на ЗИЛ-131 1986 г. ш. 655666 дв. 458332 – ТА-5 № Т35143 на ЗИЛ-131 1986 г. ш. 0916839 дв. 711253 с ЭСБ-4-В3-1-М1 №УД23601148 – АДБ-3120У1 № 16319 на пр.1-П-2,5 1986 г. ш. К0000104	г. Минск, в/ч 63755	120 000 000	12 000 000
373	Мастерская ремонтная слесарная МРС-АР № 74070 на ЗИЛ-131 ш. 246228 дв. 356794 1974 г. 4 кат. 351 км	г. Минск, в/ч 63755	40 000 000	4 000 000
375	Грузовой КрАЗ-260 ш. КО650019 дв. 19301 1989 г. 3 кат. 142947 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	60 000 000	6 000 000
376	Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 148048 дв. 583163 1990 г. 3 кат. 83 930 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	55 000 000	5 500 000
378	Мастерская МРМ-М1 без номера на ЗИЛ-131Н ш. КО866512 дв. 460744 1989 г. 4 кат. 4 552 км	г.Старые Дороги, в/ч 48668	50 000 000	5 000 000
390	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68711022Б дв. 064827 1987 г. 4 кат. 4 348 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
391	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68711001Б дв. 053749 1987 г. 4 кат. 1 877 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	110 000 000	11 000 000
392	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68711024Б дв. 065307 1987 г. 4 кат. 1 864 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	110 000 000	11 000 000
394	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110158003 дв. 553076 1980 г. 4 кат. 1949 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
395	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110057087 дв. 488045 1978 г. 4 кат. 606 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
396	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68412208Б дв. 230604 1984 г. 4 кат. 2278 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
397	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68410210Б дв. 873454 1984 г. 4 кат. 1295 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
398	Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110107192 дв. 001023 1979 г. 4 кат. 1387 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	100 000 000	10 000 000
400	Автошасси Урал-4320-1012 ш. 25738 дв. 560533 1986 г. 4 кат. 61 131 км 3 508,5 м/ч	г. Берёза, в/ч 23324	45 000 000	4 500 000
401	Автошасси Урал-4320-1012 ш. 054935 дв. 898113 1986 г. 4 кат. 42 896 км 4 585 м/ч	г. Берёза, в/ч 23324	45 000 000	4 500 000
402	Автошасси Урал-4320-1012 ш. 098525 дв. 1149 1988 г. 4 кат. 37 735 км 2 969,5 м/ч	г. Берёза, в/ч 23324	50 000 000	5 000 000
403	Автошасси Урал-4320-1012 ш. 064095 дв. 979477 1986 г. 4 кат. 59 890 км 5 035 м/ч	г. Берёза, в/ч 23324	45 000 000	4 500 000
404	Автошасси Урал-4320-1012 ш. 164089 дв. 715104 1990 г. 4 кат. 30 838 км 902 м/ч	г. Берёза, в/ч 23324	50 000 000	5 000 000
405	Автошасси Урал-4320-1012 ш. 048043 дв. 816417 1985 г. 4 кат. 16 225 км 1 452 м/ч	г. Берёза, в/ч 23324	50 000 000	5 000 000
406	Автошасси Урал-4320-1012 ш. 126759 дв. 462478 1989 г. 4 кат. 77 119 км 4 144,7 м/ч	г. Берёза, в/ч 23324	40 000 000	4 000 000
407	АЦ-5,5-375 (автоцистерна) с/о 8307075 на Урал-375 ш. 404131 дв. 939896 1983 г. 4 кат. 4 260 км 23,5 м/ч	г. Слуцк, в/ч 01851	40 000 000	4 000 000

Условия и порядок проведения аукциона изложены в газете «Звязда» № 155 от 21.08.2013 г.

Управляющий в деле о банкротстве ООО «Дорога и безопасность» (УНП 490421195, г. Гомель, ул. Пушкина, д. 11, к. 39, дело № 50-5Б/2010 от 13.10.2010 в Хозяйственном Суде Гомельской области) Журов Вячеслав Алексеевич (почтовый адрес: 247491, г. Речица, ул. Набережная, 110/12) извещает, что свидетельство о государственной регистрации общества с ограниченной ответственностью «Дорога и безопасность» **считать недействительным.**

Утерянную квитанцию о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-су серии КС № 1014713 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительной.**

В опубликованную проектную декларацию по объекту: «Многоквартирные жилые дома № 8 по г/п и № 9 по г/п в квартале пр. Победителей–ул. Проектируемая № 3–ул. 4-ое Кольцо–ул. Нарочанская в жилом районе «Лебяжий» в газете «Звязда» № 36 от 23.02.2013 г.

ВНЕСТИ СЛЕДУЮЩИЕ ИЗМЕНЕНИЯ:

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц:

однокомнатные – общей площадью 42,88 м² – 32 квартиры;

двухкомнатные – общей площадью от 62,71 м² до 74,10 м² – 74 квартиры;

трехкомнатные – общей площадью от 94,86 м² до 112,84 м² – 75 квартир;

четырехкомнатные – общей площадью от 131,91 м² до 139,9 м² – 5 квартир.

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг», зарегистрировано Минским горисполкомом от 01.06.2012 г. № 0042025 в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191450284.

Ознакомление дольщиков с планировками объекта долевого строительства осуществляется в рабочее время ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг» по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 2, п. 7 (№ 1508). Контактные тел. 8 (017) 226 43 99, 8 (029) 314 11 14.

Уполномоченный представитель по вопросам долевого строительства, директор Валерий Иванович Самущик, действует на основании Устава.

Пуховичское районное потребительское общество
СООБЩАЕТ О ПРОДАЖЕ СЛЕДУЮЩИХ ОБЪЕКТОВ, расположенных в Пуховичском районе Минской области:
- **МАГАЗИН в д. Мижречье, д. Любячка, д. Тешково;**
- **ЗАГОТОВИТЕЛЬНЫЙ ПУНКТ в д. Турин;**
- **СКЛАД в аг. Пуховичи.**

Получить всю необходимую информацию о продаже вышеуказанных объектов вы можете **по тел. (01713) 41 1 42, 42 4 94.** УНП 600115965

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**ЛОТ № 1.** Автомобиль ВАЗ-21074 2012 г.в., гос. № 6179 ЕВ-2, первоначальная стоимость 36 919 000 белорусских рублей. **ЛОТ № 2.** Автомобиль УАЗ ПАТРИОТ, 2012 г.в., 6426 ЕВ-2, первоначальная стоимость 129 756 000 белорусских рублей
Собственник (владелец) имущества	**КУСП «Чашникское»**
Местонахождение (адрес) имущества	**д. М.Ольшанка, Чашникский район, Витебская область.**
Информация об обременениях	**Арест хозяйственным судом Витебской области**
Место (адрес), дата и время проведения торгов	**г. Витебск, ул. «Правды», 32 15 октября 2013 года в 11.00**
Справочная информация	Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 324 http:// vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Коржов Алексей Игоревич, тел./факс: (80212) 49-13-47, (8-029) 366-40-10, Старший судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел. (80212) 49-13-40
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) не позднее 14.10.2013 на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670; Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Солигорскторг» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

здания специализированного для розничной торговли

(магазин № 35), общей площадью 7 296,4 кв.м (инв. № 644/С-3766), включая многолетние насаждения.
Указанное имущество расположено на земельном участке, площадью 1,2200 га (предоставлен в постоянное пользование) с кадастровым номером 643000000001001064, по адресу: Минская область, Солигорский район, ул. К. Заслонова, д. 63.

Часть указанного недвижимого имущества сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

Начальная цена с НДС – 44 640 112 080 бел. руб.

Задаток 5% от начальной цены (2 232 000 000 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **16.10.2013** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.10.2013** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Борисовбытсервис» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества:

• здание цеха РСУ-1,
общей площадью 193,5 кв.м. (инв. № 610/С-37698);
• здание цеха РСУ-2,
общей площадью 376,0 кв.м. (инв. № 610/С-37700).

Имущество расположено на земельном участке, площадью 0,1757 га (предоставлен на праве постоянного пользования) с кадастровым номером 640400000002000139, расположенного по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Урицкого, 29.

Начальная цена – 405 000 000 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены (40 500 000 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете **«Звязда» за 09.07.2013 г.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **26.09.2013 в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.09.2013 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ в Дятловском районе Гродненской области

Дата, время, место проведения аукциона	Аукцион состоится 17 октября 2013 года в 11.00 по адресу: г. Дятлово, ул. Красноармейская, 3 в зале заседаний			
Организатор аукциона — Дятловский районный исполнительный комитет				
Номер лота	1	2	3	4
Адрес земельного участка	Гродненская область, Дятловский район, г.п. Новоельня, ул. Октябрьская, 1	Гродненская область, Дятловский район, г. Дятлово, ул. Чапаева, 50	Гродненская область, Дятловский район, г.п. Козловщина, ул. Советская, 7В	Гродненская область, Дятловский район, г. Дятлово, ул. Чапаева, 44
Кадастровый номер	422356300002000348	422350100002000609	422355700002000180	422350100001001058
Площадь участка, га	0,0050	0,0040	0,0032	0,0098
Целевое назначение	установка торгового павильона	установка торгового павильона	установка торгового павильона	установка торгового павильона
Срок аренды	5 лет	5 лет	5 лет	5 лет
Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений	возможность подключения централизованного водоснабжения, газоснабжения	возможность подключения централизованного водоснабжения, газоснабжения	возможность подключения централизованного водоснабжения, газоснабжения	возможность подключения централизованного водоснабжения, газоснабжения
Начальная цена предмета аукциона (руб.)	183467	277405	147315	678066
Сумма задатка (руб.)	18350	27750	14750	67800
Затраты на организацию и проведение аукциона (без учета расходов по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ), (руб.)	590671	-	-	6871960
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона	внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения; заключение победителем аукциона с Дятловским районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ в случае изменения функционального назначения объекта; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией			

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также заверенную копию платежного поручения о внесении задатка, задатков на расчетный счет 3602515000056 в филиале № 413 АСБ «Беларусбанк» г. Лида ЦБУ 407, код 696, УНП 500049290, код платежа 4002, назначение платежа — внесение задатка на аукцион, получатель платежа — финансовый отдел Дятловского районного исполнительного комитета.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Кроме того, в комиссию предоставляются:

гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем — копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь — доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами продажи в рабочее время по согласованию с аукционной комиссией.

Заявления на участие в аукционе принимаются по 14 октября 2013 г. включительно по адресу: г. Дятлово, ул. Ленина, 20, землеустроительная служба Дятловского райисполкома в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Телефоны для справок 8 01563 21778, 8 01563 24041.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников в отношении предмета аукциона.

Регистрация участников аукциона будет производиться 17 октября 2013 г. с 8.00 до 10.50 по адресу: г. Дятлово, ул. Ленина, 20, землеустроительная служба Дятловского райисполкома.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.

■ А вы бачылі?

«ДЫНАЗАЎРЫ» КАМП'ЮТАРНАЙ ТЭХНІКІ

«Ого, ну і жалеза», «Вось гэта скрыня!», «А што, гэта яшчэ і працуе?» — школьнікі і ліцэісты, якія сталі першымі наведнікамі выставы рэтра-камп'ютараў, што праходзіць у Мінску на базе БДУІР, не пераставалі здзіўляцца. А больш сталыя людзі, убачыўшы сваіх «старых знаёмых», радаваліся, як дзеці: «Вой, а такія камп'ютары стаялі ў нас у школе! Загружаліся хвілін пяць...», «А гэта быў першы камп'ютар у маім жыцці», «А я мог толькі марыць пра такі просценькі камп'ютар».

Несумненна, сучаснай моладзі складана зразумець, што яшчэ напрыканцы 80-х інфарматыка ў школах ужо вывучалася, але камп'ютараў там не было. Каб убачыць, як выглядаюць і працуюць тыя камп'ютары, нас, сталічных школьнікаў, вадзілі на экскурсію ў інфармацыйна-вылічальны цэнтр. А калі ў Мінску амерыканцы арганізавалі выставу вылічальнай тэхнікі, там здарыўся сапраўдны аншлаг. Акрамя рознай сувенірнай драбязы, наведнікі выставы, калі пашанцуе, маглі разжыцца і глянцавым часопісам, дзе былі прадстаўлены ўсе навінкі ў гэтай галіне. А школьныя настаўнікі потым прасілі ў сваіх вучняў пагартаць гэтыя часопісы, каб быць, як той казаў, у тэме. І хто б мог падумаць, што ўсяго праз 20 гадоў з'явяцца людзі, якія будуць камп'ютары калекцыянаваць. А камп'ютары, выпушчаныя 20-30 гадоў таму, будуць прадавацца на аўцыёнах і каштаваць даражэй за самыя сучасныя. Дарэчы, некаторыя з калекцыянераў называюць сябе «камп'ютарнымі некрафіламі».

Аляксандр АЛЯКСАНДРАЎ, студэнт чацвёртага курса факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР — адзін з такіх калекцыянераў. Сяброўскія адносіны з камп'ютарам у яго наладзіліся яшчэ ў чатырохгадовым узросце — спачатку хлопчык на камп'ютары толькі гуляў, а ўжо ў 5—6 гадоў пачаў складаць першыя камп'ютарныя праграмы.

— Мае бацькі з праграмаваннем ніяк не звязаны, але бацька па прафесіі — электроншчык, таму ў нашым доме заўсёды быў уключаны паяльнік і стаяў пах каніфолі, — расказаў Аляксандр.

Ці не ад бацькі перадалося сыну захапленне «жалезам»? Хлопец прызнаецца, што яму вельмі падабаецца ажыўляць або «лячыць» старую тэхніку. Таму ён з задавальненнем наведвае мінскі хакерспэйс — майстэрню, дзе збіраюцца аматары рознай тэхнікі і куды можна прыйсці, каб штосьці папаяць, адрамантаваць. Там жа знайшоўся і часовы прытулак для часткі яго калекцыі.

Сёння рэтра-калекцыя студэнта БДУІР налічвае каля 50 экзэмпляраў. Частка экспанатаў захоўваецца ў бацькоўскім доме ў Брэсце. Бацькі хоць і падтрымліваюць захапленне сына, але перыядычна бурчаць, што яго тэхніка займае вельмі шмат месца. Самы «малады» камп'ютар, прадстаўлены на выставе, быў выпушчаны ў 1996 годзе. А самы «старажытны» экспанат — савецкі ўзор вылічальнай машыны «Электроніка» 1976 года выпуску. Як жартуе Аляксандр, гэта, хутчэй вялікі інжынерны калькулятар з касетнікам. Але пра тое, якім насамрэч можа быць «вялікі калькулятар», расказаў **рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Міхаіл БАТУРА,** які наведаў выставу свайго студэнта:

— Вылічальная тэхніка, на якой я працаваў студэнтам і аспірантам, уяўляла сабой набор з 10—12 вялікіх шафаў. А ў тэхнічных патрабаваннях па эксплуатацыі ЭВМ ЕС 1022 было запісана, што ёй патрабуецца плошча ў 110 квадратных метраў. Прычым абавязкова трэба было яшчэ і забяспечваць ахалоджванне тэхнікі, каб тая не перагравалася... А цяпер я трымаю ў руках планшэт, які і па магутнасці, і па аб'ёме памяці, і па сваёй хуткасці на парадак пераўзыходзіць ЭВМ 70-х гадоў. Тое, што яшчэ 30 гадоў таму здавалася ўсім фантастыкай, сёння стала рэальнасцю. Цікава пафантазіраваць, што будзе, напрыклад, у 2050 годзе?

Аляксандр расказаў, што пачаў збіраць камп'ютары яшчэ ў школьныя гады, а штуршком да калекцыянавання стала партыя камп'ютараў, якая дасталася яму дарма ад знаёмага яго бацькі:

— Мяне цікавяць не столькі гады выпуску камп'ютараў, колькі розныя платформы. Пэўны прабел у маёй калекцыі ёсць у савецкай камп'ютарнай тэхніцы канца 80-х гадоў — з той прычыны, што яе вельмі складана знайсці. А нават калі і знойдзеш, то набыць яе студэнту — не па кішэні. Паколькі савецкія камп'ютары змяшчалі каштоўныя металы, то «залатары» іх даўно разабралі, а калі дзесьці ўсё ж такі і захаваліся асобныя экзэмпляры, то каштуюць яны фантастычна дорага. Я набываю камп'ютары або за сімвалічныя грошы (самым дарагім маім набыццём стаў рарытэт за 50 долараў, і тое купіў яго толькі таму, што ну вельмі захацелася), або мне аддаюць тэхніку бясплатна. Вось і сёння адзін з наведнікаў выставы паабяцаў прынесці свой рарытэт. Шчыра кажучы, хацеў бы папоўніць сваю калекцыю распрацоўкай навукоўцаў Мінскага радыётэхнічнага інстытута — камп'ютарам «Няміга». Аднак, напрыклад, расійскія калекцыянеры гатовы за яго заплаціць 400—500 долараў, а адкуль у мяне могуць быць такія грошы? З расіянамі вельмі складана канкурыраваць, яны прыходзяць на наш рынак і ўзвінчваюць цэны. А ўвогуле каштоўнасць таго ці іншага камп'ютара вызначаецца колькасцю выпушчаных экзэмпляраў. «Няміг» было выпушчана ў свой час шмат, але «цэлых» засталося вельмі мала.

Савецкая электронная вылічальная машына 1976 года выпуску.

Дарэчы, расіяне прапаноўвалі выкупіць у Аляксандра яго «Электроніку» 1976 года, але той адмовіўся наадрэз. Маўляў, я сваю калекцыю не распрадаю. Гонарам яе з'яўляецца таксама прататып камп'ютара, на якім стваралі спецэфекты для галівудскага «Тэрмінатара», камп'ютар Silicon Graphics (на такіх на тэлеканале АРТ манціраваліся ў 90-я гады тэлевізійныя застаўкі), а таксама беларуская гульнявая прыстаўка «Эльф». Сучасная моладзь наўрад ці ведае, што раней гульні для персанальных камп'ютараў выпускаліся не толькі на дыскетах, але і на аўдыякасетах, і загружаліся ад 3 да 30 хвілін. Яны таксама прадстаўлены на выставе.

— Я ў сучасныя камп'ютарныя гульні ніколі не гуляю. Значна з большым задавальненнем пагуляю на адноўленым старым камп'ютары, — расказвае Аляксандр. — Калі камп'ютар — савецкі, то, часцей за ўсё, дэталі да яго можна знайсці, а затым усё ўпіраецца толькі ў выпраўленне няспраўнасцяў: шукаеш, якая мікрасхема згарэла, і гэтак далей — крок за крокам. Большая частка маіх экспанатаў пасля рамонту ў спраўным стане. А вось калі камп'ютар замежны, то задача ўскладняецца: мікрасхему трэба дзесьці шукаць і заказваць. Напрыклад, Commodore-128 паўгода праляжаў у мяне «трупам». А потым з Галандыі раптам прыходзіць паведамленне, што мне гатовы прадаць мікрасхему за сімвалічныя 5 долараў. Дарэчы, мікрасхема на другасным рынку можа каштаваць столькі ж, колькі і камп'ютар.

Раней гульні для персанальных камп'ютараў выпускаліся не толькі на дыскетах, але і на аўдыякасетах, на магнітнай стужцы.

Большасць аднакурснікаў калекцыянера захапляюцца праграмаваннем. Яно і зразумела: навучанне на факультэце КСІС — мара для многіх выпускнікоў. І паступіць сюды надзвычай складана. Аляксандр паступіў і атрымлівае па выніках летняй сесіі павышаную стыпендыю.

— Шчыра кажучы, я больш камфортна адчуваю сябе з «жалезам, — прызнаецца ён. — Паралельна з вучобай я на палову стаўкі другі год ужо працую ў Аб'яднаным інстытуце машынабудавання Акадэміі навук у лабараторыі бартавых мехатронных сістэм. Летам працаваў на поўную стаўку. Мне гэта цікава: ствараць бартавыя камп'ютары для аўтобусаў, фур... Хоць, вядома, разумею, што ў навуцы шмат грошай не заробіш. Таму казаць адназначна, што не паддамся спакусе, не буду...

Характэрна, што сваімі марамі аб папаўненні калекцыі Аляксандр дзеліцца не вельмі ахвотна. Кажа, што ў яго ёсць цэлы спіс «камп'ютарнага антыкварыяту», які ён будзе выконваць па меры магчымасцяў. Але відавочна, што для вялікай калекцыі патрабуецца шмат месца — не захоўваць жа яе ў гаражы. Магчыма, кіраўніцтва ўніверсітэта пойдзе насустрач і прапануе пастаянную плошчу для яго калекцыі? Няхай гэта будзе, напрыклад, пастаянна дзейная выстава... Музеяў камп'ютарнай тэхнікі пакуль што няма, таму вырасла цэлае пакаленне падлеткаў, якія шчыра ўпэўнены, што калькулятары заўсёды былі ў мабільных тэлефонах, як, дарэчы, і інтэрнэт...

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ



■ Нефармат

ЖЫЦЦЁ ЯК ПРОСТАЯ РЭЧ

Сёння сусед зверху нешта доўга і старанна прыбіваў. Мабыць, плінтус адышоў, але не, гэта хутка паправіць: тры разы стукнуў — і гатова. Тут чалавек працаваў грунтоўна. За гэты час можна крэсла паламанае адрамантаваць альбо стол ці шафу. Усё б нічога, толькі рамонтныя работы ён праводзіў на пачатку шостай гадзіны раніцы. Што тут зробіш, такі рэжым у чалавека. Праўда, рэжым апошнім часам рэзка памяняўся. Раней усё адбывалася вечарам: спачатку сусед сварыўся з жонкай (у панэльнай шматпавярхоўцы чуваць нават словы і фразы), а потым, відаць, каб зняць стрэс, лупіў малатком па нейкіх дошках. І гэта, як правіла, адбывалася вечарам, часам зацягвалася да дванаццаці ночы. Цяпер вось — раніцай і без сварак.

Успомніла пра сённяшняе абуджэнне, калі чарговы раз патэлефанавала чытачка са сваёю бядою. І сапраўды навала, а паратунку знайсці нельга. Я ўжо пісала ў газеце пра велізарны святлодыёдны экран, які ўстанавілі ў Брэсце на плошчы Леніна, недалёка ад дома №24. Гэты сучасны від рэкламы цяпер ёсць у любым буйным горадзе, калі на экране ўвесь час мяняюцца ролікі, карцінкі, і голас за кадрам чытае бягучы радок. Патэнцыяльных спажыўцоў заклікаюць купіць, адпачыць, пакатацца, наведаць... І так з дня ў дзень, з ранку да вечара.

І людзі ў названым доме сталі прымусова слухаць гэтую трансляцыю. Адна з кватэранаймальніц тады тэрмінова памяняла вокны, але і трайны шклопакет не абараніў ад манатоннага гучаку. Людміла Пятрова пайшла па суседзях, сабрала подпісы, заяву занеслі ў гарвыканкам. Тады ў дом накіравалі спецыяліста з санітарнай службы, ён замераў узровень шуму і выдаў заключэнне, што велічыня дэцыбэлаў не перавышае крытычнага парога. У афіцыйным адказе таксама зазначалася, што ўзровень шуму ад экрана не перавышае звычайны вулічны шум.

Такі падыход жыльцоў не задаволіў, яны сталі звяртацца ў інстанцыі далей. Справа ж не ў велічыні гуку. Любы псіхолаг скажа вам, што бесперапынная паўтаральнасць аднаго і таго ж тэксту здольная давесці чалавека ледзь не да вар'яцтва. Тым больш калі чалавек немалады і не вельмі здаровы. А дом, ля якога стаіць экран, даволі стары. Жывуць там у асноўным пенсіянеры, людзі, якія большую частку дня знаходзяцца ў кватэрах. І калі тэлевізар ці радыё заўсёды можна выключыць, ад гэтай гвалтоўнай рэкламы нідзе не схаваешся. Цікава, што на вуліцы гуку амаль не чуваць, яго перакрывае шум машын. Затое ў кватэрах, вокны якіх выходзяць на гэты бок, бясконца прапануюць пельмені мясцовага мясакамбіната і макарону пэўных вытворцаў. Для тых, хто скача на цяперашніх дыскатэках ці праводзіць час у начных клубах, такі гук не страшны. А вось для людзей з чуйнай нервовай сістэмай, для тых, хто пакутуе на сэрца, гэта стала штодзённым выпрабаваннем. Толькі хто потым дакажа, што прыступ справакаваны менавіта раздражненнем ад навязлівага шуму?..

Дык вось, пасля згаданай публікацыі наша газета атрымала адказ з аблвыканкама, дзе гаворыцца: «Дасягнута дамоўленасць паміж гарвыканкамам і ТАА «БізнесІнфа Сістэма» (гаспадар экрана. — **Аўт.**) аб паэтапным выключэнні з трансляцыі гукавой рэкламы». Здавалася б, заклікі пачутыя, людзям набрацца цярпення і чакаць. Бо названае прадпрыемства — камерцыйная структура, і яно мае абавязацельствы перад рэкламадаўцамі. А за што заплачана, тое мусіш трансляваць.

Калі пазваніла Людміла Пятрова, я адразу ўспомніла і яе візіт, і той матэрыял. Толькі вось адразу цяжка было паверыць, што... прайшло тры гады. Зверылі, усё правільна, афіцыйны адказ датаваны 27 кастрычніка 2010 года. Абяцанага людзі чакалі амаль тры гады, ды так і не дачакаліся.

На згаданым прадпрыемстве вельмі здзівіліся майму пытанню, удакладнялі дату, нумар, фармулёўку адказу з аблвыканкама. Потым ветлівая дзяўчына паразваніла і паведаміла, што за гэты час у іх два разы былі праверкі па лініі санітарнай службы. Вердыкт спецыялістаў: узровень рэкламы не перавышае ўзровень шуму вуліцы. Так што прадпрыемства функцыянуе ў рамках закона, і ні пра якае выключэнне гуку гаворка ісці не можа.

Нічога іншага чакаць і не даводзілася б у гэтай сітуацыі. Што той дзяўчыне да людзей з дома № 24? У яе свая работа, а ў яе кіраўнікоў свой бізнес. Гэтыя наступствы павінны былі прадугледзець службовыя асобы гарвыканкама, калі давалі дазвол на ўстаноўку экрана. Але і ім, відаць, не прыйшло ў галаву падумаць пра жыльцоў дома — урэшце, раздражняльнік стаіць не ля іх акна.

Вы, напэўна, заўважылі, што даўно ўжо ўсе так жывём: у аднаго сусед зранку малатком у столь ляпае, другога «дасталі» курцы на прыпынку, якія дымяць ледзь не ў твар, трэцяму, ці бачыце, не даспадобы феерверкі, якімі моладзь бавіцца ноч напралёт. І гэта — праблемы таго, каму не падабаецца, каму перашкаджае, каго нервуе. Большасць з нас існуе так, як самім выгадна, не зважаючы на другога. Калі мы такімі сталі?

Святлана ЯСКЕВІЧ

Даты | Падзеі | Людзі



1891 год — нарадзіўся (вёска Бацэвічы, цяпер Клічаўскі раён Магілёўскай вобласці) Аркадзь Антонавіч Смоліч, беларускі географ, картограф, першы прафесар геаграфіі ў Беларусі (1927). Адзін са стваральнікаў Беларускай акадэміі навук, суаўтар яе першага статута (1928). Аўтар вучэбнага дапаможніка «Геаграфія Беларусі». Арганізаваў Цэнтральнае бюро краязнаўства і часопіс «Плуг». Абгрунтаваў навуковыя задачы геаграфіі па вывучэнні ландшафтаў з улікам іх генезісу, эвалюцыі, складу і прасторавага размяшчэння. Распрацаваў праграму эканоміка-геаграфічнага вывучэння раёнаў БССР (1930), стварыў карту размяшчэння насельніцтва Беларусі (1929). У 1931 годзе рэпрэсаваны. У 1938-м расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957-м.

1912 год — нарадзіўся (вёска Пількаўшчына, цяпер Мядзельскі раён Мінскай вобласці) Максім Танк (Яўген Іванавіч Скурко), народны паэт Беларусі (1968), акадэмік НАН Беларусі (1972), Герой Сацыялістычнай Працы (1974). Удзельнік рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Неаднаразова арыштоўваўся польскімі ўладамі, прысуджаўся да турэмнага зняволення. У Вялікую Айчынную вайну — супрацоўнік газеты «За Савецкую Беларусь», газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». З 1945 года працаваў у часопісе «Вожык». Аўтар паэтычных зборнікаў «На этапах», «Пад мачтай», «Праз вогненны небасхіл», «Нарачанскія сосны» і іншых. Пісаў для дзяцей. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1948), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1966). Памёр у 1995 годзе.

1940 год — лётчыкі брытанскага Каралеўскага паветранага флоту атрымалі адну з самых бліскучых перамог у Другой сусветнай вайне. Яны адбілі дзве магутныя атакі германскіх ВПС і спынілі масіраванае ўварванне на Брытанскія астравы войскаў вермахта. У небе над Альбіёнам быў знішчаны 61 самалёт праціўніка. Страты англічан былі ўдвая меншымі — 29 машын. Даведаўшыся пра паражэнне ў небе над Англіяй, Гітлер адмяніў загад аб дэсанце на Брытанскія астравы, хоць бамбёжкі працягваліся. Яшчэ за тры месяцы да таго Брытанія не мела баяздольных ВПС. Чэрчыль, які стаў прэм'ер-міністрам у маі 1940 года, выклікаў да сябе ваеннага міністра Бівербрука. Ён загадаў яму неадкладна сабраць усіх уладальнікаў і дырэктараў авіяпрадпрыемстваў і аб'явіць ім аб нацыяналізацыі іх заводаў. Здзіўлены Бівербрук спаслаўся на адсутнасць закону аб нацыяналізацыі. «Да таго часу, калі вы іх збераце, закон ужо будзе прыняты», — запэўніў яго Чэрчыль.

Было сказана

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, паэт, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык, кінасцэнарыст:

«Самая страшная пасля прагнасці чалавечая загана — нецярпімасць».

■ Факт

ХАКЕЙНЫ МАРАФОН ПАД ЛІЧБАЙ «13»

17 верасня на лядовай арэне ў парку Горкага распачнецца чарговы чэмпіянат Мінска па хакеі сярод аматарскіх камандаў. Ужо трынаццаты раз спаборніцтвы аб'яднаюць гульцоў рознага ўзросту і ўзроўню майстэрства. Народзіны з былымі хакеістамі, уладальнікамі разнастайных рэкордаў краіны, трэнерамі прафесійных клубаў за галоўны трафей будуць змагацца дэбютанты, якія ўпершыню ўзялі ў рукі клюшку ў сталым узросце.

Сёлета на лёд выйдуць 29 дружын. Сярод іх будуць і навічкі — каманды «Газпрамнафта», «Сокал» і «Раўбічы-Хуліганс». Дарэчы, упершыню гульні чэмпіянату пройдуць на новай лядовай пляцоўцы ў студэнцкай вёсцы.

Хакейны марафон будзе доўжыцца дзевяць месяцаў і фінішуе толькі ў сярэдзіне мая, своеасабліва перадаўшы эстафету галоўнай спартыўнай падзеі наступнага года — чэмпіянату свету па хакеі, які адбудзецца ў Мінску. А пакуль адкрыць праграму 13-га першынства беларускай сталіцы сярод аматараў давядзецца леташнім фіналістам — дружынам «Рубеж» і «Сталіца». Нагадаем, апошняя каманда будзе абараняць свой першы тытул пераможцы чэмпіянату. Прыходзьце падтрымаць гульцоў!

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

У СЯРЭДНІМ ЛЮДЗІ КАХАЮЦЬ ДВОЙЧЫ ЗА ЖЫЦЦЁ

У Лондане правялі незвычайнае сацыялагічнае апытанне, якое паказала, што звычайна людзі ўлюбляюцца па-сапраўднаму двойчы за ўсё жыццё, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на Daily Telegraph.

Масавае апытанне прайшло падчас трохдзённага фестывалю оперы Siemens Festival Nigts, у ім узялі ўдзел 2 тыс. рэспандэнтаў. Вынікі «рамантычнага даследавання» паказалі, як часта людзі ўлюбляюцца, колькі ім трэба часу, каб вызначыць, ці сапраўдныя гэта пачуцці і якая частка апытаных жыве зусім без кахання.

Аказалася, што ў сярэднім людзі ўлюбляюцца два разы ў жыцці, пры гэтым хаця б раз іх каханне было не ўзаемнае.

Ёсць і неадназначныя адказы. Такім чынам, больш за пяць разоў разбівалі сэрца кожнаму дваццатаму апытанаму. Многія рэспандэнты адказалі, што жывуць з каханнем усяго свайго жыцця ў гэты момант, але кожны сёмы з апытаных прызнаўся, што знаходзіцца ў стасунках без кахання. З іх 73% адзначылі, што сышліся з цяперашнім партнёрам пасля таго, як ужо страцілі сваё «сапраўднае каханне». Пры гэтым 46% людзей, якія знаходзяцца ў стасунках, працягваюць шукаць свой лёс — апытаныя заявілі, што гатовы кінуць партнёра або нават разарваць шлюб, калі сустрэнуць сваё сапраўднае каханне.

Варты ўвагі той факт, што мужчыны больш прывязаныя да пастаянных стасункаў, чым жанчыны: 37% прадстаўнікоў моцнага полу адказалі, што захавалі б саюз, каб не рабіць балюча партнёру.

БЕЛТА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	6.46	19.21	12.35
Віцебск	6.35	19.11	12.36
Магілёў	6.36	19.11	12.35
Гомель	6.34	19.07	12.33
Гродна	7.02	19.36	12.34
Брэст	7.03	19.36	12.33

Месяц

Поўня 19 верасня.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Івана, Майсея, Мікалая, Мітрафана, Міхаіла, Паўла, Пятра, Сцяпана.*
К. *Веры, Юстыны, Нарцыза, Роберта, Францішка.*

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Запіска мужу.
«Вова, забяры малога з дзіцячага садка.
P.S. Ён сам цябе пазнае».

— Алё, гэта «хуткая»? Цешча захварэла... Як гэта — не лечыце?! А хто лечыць? Дзякуй. Алё, гэта серпентарый?

Кожная жанчына лічыць сваім абавязкам датэлефанавацца да свайго любімага (мужа, сябра) хай нават з 15-га разу, каб задаць адно адзінае пытанне: «Ты дзе?».

Вось мне заўсёды цікава было — хто вызначае, што кашэчы корм стаў яшчэ смачнейшым?!

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 22.898. Індэкс 63850. Зак. № 4076.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 16 верасня 2013 года.